№ 7 (461) 17 лютага 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

## Мяккі палітычны прысуд

Скрабцу пашэнціла, што ягоную справу разглядалі перад выбарамі. **Старонка 4.**

Вольга Караткевіч пра Сяргея Скрабца: «Цукерак я табе ня раю. Шкодна. І нават небясьпечна». **Старонка 32.**



### Каб гарантавана атрымліваць «Нашу Ніву»

проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 19**.

## Праграма Мілінкевіча

Знаёмая ў замежжы, нязнаная ў Беларусі. **Старонка 5.**

Мілінкевіч запрашае пад Палац Рэспублікі. **Старонка 6.**

### Алексіевіч зьяжджае ў Швэцыю

на запрашэньне Швэдзкага ПЭНу. **Старонка 10.**

### Лукашэнка «ўсё дараваў»

палітолягу Юр'ю Шаўцову. **Старонка 8.**

## Звышвысілкі для міні-вынікаў

**Віталь Сіліцкі** пра наканаваньне беларускай апазыцыі. Старонка 7.

## Жыцьцё пасьля нафты



Золата будучыні будзе блакітным, зялёным, празрыстым — якім заўгодна, але ня чорным. З Бэрліна піша **Алесь Кудрыцкі**.

**Справа Касьпяровіча пайшла ў суд**
Старонка 6.

**Аўтуховіч уцёк з-пад варты**
Старонка 4.

**Скандал на БТ**
Старонка 24.



# у нумары

## палітыка


Мяккі палітычны прысуд ... 4
«Цукерак я табе ня раю. Шкодна і нават небясьпечна» ... 32
Аўтуховіч уцёк з-пад варты ... 4
Праграма, добра знаёмая ў замежжы ... 5
Акцэнты праекту праграмы Мілінкевіча ... 5
Мілінкевіч запрашае пад Палац Рэспублікі ... 6
Колькі людзей прыйдзе 2 сакавіка? ... 6
Звышвысілкі для міні-вынікаў ... 7
Кошт канцэртаў «За Беларусь»: адкуль бяруцца грошы? ... 9


## грамадзтва


Лукашэнка «ўсё дараваў» Шаўцову ... 8
Спачатку зробяць хараша ўздоўж аўтадарог ... 10
Алексіевіч зьяжджае ў Швэцыю ... 10
Лукашэнка раздае стыпэндыі творчым работнікам ... 10
Арганізацыю Бутэвіча не зарэгістравалі ... 10
«Настаўніцкая газета»: Хто не за Лукашэнку, той экстрэміст ... 11
«Во славу Родины»: флэш-мобы — зброя імпэрыялізму ... 11
Суд над «Нівай» перанесьлі ... 11
57 гадоў на сьметнік ... 15
Што ў нас памерзла? ... 16
Валюта — у вольным продажы ... 16
Форум tut.by пра фальсыфікацыю выбараў ... 16


## хроніка


Справа Касьпяровіча пайшла ў суд ... 6
Сьціслая хроніка рэпрэсій і супрацiву ... 12
21-гадовы палітвязень ... 14


## пішуць чытачы


Глыбокае: Люблю Беларусь ... 16
Куры — за краты ... 16
Фальсыфікацыя лунінецкага масла ... 16
Пошта Рэдакцыі ... 26
Цяжкая спадчына Рэчы Паспалітай ... 26
Як знайсьці сяброў і абараніць нацыянальныя інтарэсы Беларусі ... 27


## мы самі


Шукаем падпісчыкаў «НН»!!! ... 20
Падзякі ахвярадаўцам ... 20


## з усіх старон


Жыцьцё пасьля нафты ... 21
Прызнаньне расейскага пракурора ... 33


## культура


Беларуская рок-музыка выдадзеная на mp3 ... 17
«Тузін гітоў» ... 17
Аповед пра насатых валадароў ... 18
Новая карціна Марачкіна ... 37
Выбіраем рок-каралёў ... 45


## аўтарскія рубрыкі


Павал Севярынец. Лісты зь лесу: Праймэрыз у Алёшчы ... 12
Аляксандар Класкоўскі. Палітычная кухня: Скандал на БТ ... 24
Лёлік Ушкін. Левым вокам: Уставай, народ, за мэтал-рок! ... 25
Віталь Тарас. Іншымі словамі: У ложку з Гітлерам ... 28


## гісторыя


Ксёндз, які не схацеў узначаліць Касьцёл ... 34
Сьмех нашых дзяцей ... 35


## літаратура


Юры Гумянюк. Эўрапапса ... 38
Ева Вежнавец. Шлях дробнай сволачы ... 40
Анатоль Сідарэвіч. Дзьве кнігі ... 42
Газэтка дзеткам: Ходзіць гарбуз па гароду ... 44


## калі б...


Вясёлыя карцінкі ... 47


## 50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

Дэмакратычныя сілы праводзілі сваю кампанію амаль бясшумна, што тлумачылі абмежаваньнямі Выбарчага кодэксу. Калі так і пойдзе і ўзьняць палітычную актыўнасьць грамадзтва ім ня ўдасца, Мілінкевіча чакае чацьвертае месца ў сьпісе Ярмошынай, лідэраў партый — дыскрэдытацыя, а кааліцыю — распад, піша Віталь Сіліцкі **(старонка 7)**. А на тое каб грамадзтва разварушыць, застаецца некалькі тыдняў. Запрашэньнем пад Палац Рэспублікі **(старонка 6)** і асабліва сустрэчай з выбарцамі на плошчы Свабоды 2 сакавіка Мілінкевіч хоча перахапіць ініцыятыву. Разгортваньне кампаніі будзе моцна залежаць ад масавасьці й настрою гэтых сустрэчаў. Памятаюцца мітынгі апошніх гадоў, калі арганізатары ня мелі гукаўзмацняльнікаў і, што горш, сцэнару, як дзейнічаць пры немагчымасьці дастаць тыя гукаўзмацняльнікі. Памятаецца й адваротнае — спантанная актыўнасьць вясной 96-га, калі тысячы людзей кіраваліся прынцыпам «калі ня я, дык хто». У любым разе, нас чакаюць напружаныя ў палітычным сэнсе тыдні.

## Калі хто мае знаёмых

якія раней чыталі незалежныя газэты, а цяпер ня маюць доступу да іх, калі ласка, раскажэце ім пра магчымасьць чытаць «Нашу Ніву», пра тое, як яна даходзіць і дайце ім пабачыць газэту. Важна, каб наша супольнасьць расла. Дарэчы, за першыя два тыдні лютага колькасьць падпісчыкаў вырасла на 28.

у кнігарнях з 23 лютага




ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 00345

# Мяккі палітычны прысуд

Скрабцу пашэнціла, што ягоную справу разглядалі перад выбарамі.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Брат Сяргея Скрабца Аляксандар атрымаў два гады зьняволеньня ўмоўна. На фота справа — дачка Сяргея Скрабца Натальля перад вынясеньнем прысуду.**

У аўторак 14 лютага Вярхоўны суд вынес рашэньне па справе Сяргея і Аляксандра Скрабцоў. Экс-дэпутат і бізнэсовец Сяргей Скрабец атрымаў 2 гады і 6 месяцаў году калёніі агульнага рэжыму (вінаваўца прасіў 5,5 году). Аляксандар — 2 гады ўмоўна з адтэрміноўкай на год.

Дзевяць месяцаў тэрміну Скрабец ужо адбыў: яго арыштавалі ў Берасьці 15 траўня 2005 году. На знак пратэсту супраць затрыманьня і абвінавачаньняў Сяргей Скрабец у СІЗА неаднаразова абвяшчаў галадоўкі. Адна зь іх доўжылася 40 дзён. Апошняе слова ў судзе Скрабец скончыў выгукам: «Жыве Беларусь!».

Суд пацьвердзіў толькі адзін пункт абвінавачаньня братоў Скрабцоў: атрыманьне крэдыту ў дзяржавы незаконным шляхам. Закід у «незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасьці» (С.Скрабец сумяшчаў дэпутацкую дзейнасьць і кіраваньне фірмай), на думку суду, страціў сілу з-за тэрміну даўніны. Пункт «хабар у надзвычайна буйных памерах» суд палічыў недаказаным.

Гэта азначае, што «справа аб хабары» магла быць звычайнай правакацыяй спэцслужбаў.

Улетку 2004 году Сяргей Скрабец удзельнічаў у галадоўцы дэпутатаў групы «Рэспубліка» за дэмакратызацыі выбарчага працэсу. У СІЗА заявіў аб жаданьні ўдзельнічаць у прэзыдэнцкіх выбарах, але пасьля збору подпісаў зьняў кандыдатуру на карысьць Аляксандра Казуліна.

**Сяргей Мікулевіч**

**Яшчэ пра Сяргея Скрабца — старонка 32.**

# Аўтуховіч уцёк з-пад варты

Суд над ваўкавыскім прадпрымальнікам Міколам Аўтуховічам, абвінавачаным ва ўхіленьні ад сплаты падаткаў, што мусіў пачацца 9 лютага, перанесены на няпэўны тэрмін. Прычына — зьнікненьне з-пад хатняга арышту Аўтуховіча. Пра яго месцазнаходжаньне ня ведаюць ні адвакат, ні жонка Алена. Яе, аднак, дапыталі супрацоўнікі Ваўкавыскага РУУС.

Мікола Аўтуховіч зьнік, пакінуўшы адкрыты ліст да генпракурора Пятра Міклашэвіча. У лісьце ён паведамляе, што здымае зь сябе ўсе абавязкі па знаходжаньні пад хатнім арыштам у сувязі зь незаконным ціскам на яго сям'ю. У выпадку, калі да 23 лютага крымінальная справа у дачыненьні да яго не прыпыніцца і суд ня вынясе законнага рашэньня, М.Аўтуховіч абяцае перадаць суду, прэзыдэнту і СМІ, у тым ліку замежным, інфармацыю, якая будзе сьведчыць на яго карысьць, і выкрыць незаконныя дзеяньні чыноўнікаў, што «на замову тры гады «душылі» прадпрымальніка. Сп.Аўтуховіч таксама падкрэсьліў, што не зьбіраецца пакідаць Беларусь.

14 лютага адбылося паўторнае судовае паседжаньне. Судзьдзя Рачынскі, паводле адвакаткі Аўтуховіча Галіны Івановай, прыпыніў крымінальную справу на час пошукавых мерапрыемстваў, адмовіўшыся весьці справу Юр'я Лявонава, былога дырэктара «Ніка-транс», асобна.

**Сямён Печанко**

# Праграма, добра знаёмая ў замежжы

16 лютага, напярэдадні рэгістрацыі кандыдатаў, праект праграмы Мілінкевіча будзе прэзэнтаваны ў Маскве.

Палітычная рада дэмакратычных сілаў 14 лютага ўхваліла праект асноўных палажэньняў праграмы Аляксандра Мілінкевіча. Яны маюць загаловак «Свабода, праўда, справядлівасьць» і складаюцца зь сямі разьдзелаў. Першым ідзе «Сям'я і здароўе», выніковым — «Нацыянальнае адраджэньне».

Асноўныя палажэньні канкрэтызуюць пазыцыі, сфармуляваныя А.Мілінкевічам раней. Так, ён абяцае рост заробкаў да 550 эўра да 2010 году. Істотна адрозьніваецца ад Лукашэнкавай праграма А.Мілінкевіча ў сацыяльнай сфэры. Кандыдат ад дэмакратычных сілаў абяцае ўвесьці адрасную дапамогу сем'ям зь дзецьмі: штомесячныя даплаты на кожнае дзіця да 16 гадоў у памеры 10% спажывецкага бюджэту, адрасную дапамогу сем'ям у памеры 5 мільёнаў рублёў пры нараджэньні кожнага дзіцяці і беспрацэнтовы крэдыт на набыцьцё жытла пры нараджэньні другога дзіцяці.

У замежнай палітыцы праграма асьцярожная. Сярод пастаўленых задачаў — стварэньне «паўнавартай зоны свабоднага гандлю» ў СНД і заключэньне дамовы пра партнэрства з Эўразьвязам.

Праект праграмных палажэньняў стаў вынікам доўгіх кансультацый. У кастрычніку пры Нацыянальным камітэце дэмакратычных сілаў была створана працоўная група. Яна падрыхтавала эканамічную плятформу пад назвай «Стань гаспадаром у сваёй краіне». Менавіта яна і была прэзэнтавана ў Брусэлі (для кіраўніцтва Эўракамісіі, Эўрапарляманту, амбасадаў краінаў ЭЗ і Рады міністраў ЭЗ) ды Варшаве.

Далей з тэкстам працавалі экспэрты, вызначаныя Палітычнай радай дэмсілаў. У выніку да базавых палажэньняў, распрацаваных групай пад кіраўніцтвам Раманчука, дадаліся канстытуцыйна-прававы, адукацыйны й нацыянальна-культурны аспэкты. Гэтая праграма была прэзэнтаваная ў сойме Літвы і ў Радзе Эўропы.

16 лютага асноўныя палажэньні праграмы будуць прадстаўленыя ў Маскве «для расейскай грамадзкасьці» самім А.Мілінкевічам і кіраўніком ягонага штабу Сяргеем Калякіным.

Такім чынам, праграму будуць добра ведаць у замежжы. Данесьці яе да беларускіх выбарцаў будзе нашмат цяжэй.

**Мікола Бугай**

### У адпаведнасьці з рашэньнем Цэнтравыбаркаму

праграму кандыдата ня можна друкаваць да яго рэгістрацыі. Цэнтравыбаркам таксама забараніў друкаваньне перадвыбарных матэрыялаў кандыдатаў у недзяржаўных СМІ — напэўна, каб абмежаваць магчымасьці праціўнікаў А.Лукашэнкі.

Крытычны аналіз эканамічнага блёку праграмы А.Мілінкевіча чытайце ў наступным нумары «НН». Ён нас найбольш цікавіць, бо ў палітычным ці культурным блёку незалежнае грамадзтва дасягнула адзінства.

Мы разаслалі Асноўныя палажэньні некаторым нашым экспэртам і чытачам. Іх ацэнкі будуць надрукаваныя ў наступным нумары.

Вось першы з водгукаў, які надышоў.

**Андрэй Кірэеў, дырэктар Golden Software of Belarus, Ltd:** За апошнія пяць год гэта найбольш талковая праграма, зь якой давялося азнаёміцца. Але некалькі пунктаў падаліся спрэчнымі. Па-першае — скасаваньне кантрактнай сыстэмы. У рынкавай экономіцы прадпрыемства мусіць мець магчымасьць набіраць альбо звальняць пэрсанал адпаведна з сваімі патрабаваньнямі і агульнай рынкавай сытуацыяй. Эканоміка ЗША — самая магутная ў сьвеце, бо там правы работніка абароненыя найменш, калі параўноўваць з Эўропай. А ў Беларусі на дзяржпрадпрыемствах адсоткаў 20—30 людзей «праседжваюць нагавіцы», але звольніць іх кіраўніцтва ня мае магчымасьці».

## Акцэнты праекту праграмы Мілінкевіча:

1) «Сям'я і здароўе» — рост адрасных дапамог сем'ям зь дзецьмі: штомесячныя даплаты на кожнае дзіця да 16 гадоў у памеры 10% спажывецкага бюджэту, адрасная дапамога сем'ям у памеры 5 млн рублёў пры нараджэньні кожнага дзіцяці і беспрацэнтовы крэдыт на набыцьцё жытла пры нараджэньні другога дзіцяці.

2) «Павага да працы і дастойныя заробкі» — адмена кантрактнай сыстэмы, зьняцьце бюракратычных бар'ераў, рост сярэдняга заробку да 550 эўра за кошт новых рынкаў, новых інвэстыцый і ўпор на павышэньне прадукцыйнасьці працы. Цікава, што кандыдат ставіць задачы росту заробку ў эўра, а не ў далярах.

3) «Справядлівы закон, адказная дзяржава» — вяртаньне палітычных свабодаў, падзелу ўладаў і незалежнасьці судоў.

4) «Эканамічная свабода» — мадэрнізацыя і разьвіцьцё эфэктыўна працуючых вытворчасьцяў, забесьпячэньне 50% ВУП за кошт малых і сярэдніх прадпрыемстваў.

5) «Адкрытая краіна — адкрыты сьвет» — захаваньне нэўтральнага статусу Беларусі, стварэньне паўнавартай зоны свабоднага гандлю ў СНД, заключэньне з Эўразьвязам дамовы пра партнэрства.

6) «Навука, прагрэс» — рост інвэстыцый у навуку да 850 млн эўра ў год з мэтай павышэньня долі высокатэхналягічных тавараў у агульным аб'ёме прадукцыі.

7) «Нацыянальнае адраджэньне» — пабудова сучаснае дзяржавы магчымая, толькі калі грамадзяне выразна ўсьвядомяць сваё адзінства як нацыі. Вырашыць гэтую праблему можа мэтаскіраваная дзейнасьць дзяржавы па адраджэньні нацыянальнай самасьвядомасьці. Беларуская мова называецца «найгалоўнейшым сродкам самаідэнтыфікацыі нашага народу».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Мілінкевіч запрашае пад Палац Рэспублікі

Аляксандар Мілінкевіч выступіў зь нечаканай ідэяй: 17 лютага пасьля ўрачыстай цырымоніі рэгістрацыі кандыдатам у прэзыдэнты ён гатовы сустрэцца з патэнцыйнымі выбарцамі перад Палацам Рэспублікі. Цырымонія распачынаецца а 12.00.

З 18 лютага лідэр Дэмакратычных сілаў адновіць паездкі па рэгіёнах, у гэты дзень ён наведае Бабруйск, Магілёў, Горкі;

19 — Жлобін, Сьветлагорск, Гомель;
20 — Рэчыцу, Мазыр, Калінкавічы;
23 — Лепель;
24 — Воршу;
25 — Віцебск, Наваполацак, Полацак;
26 — Маладэчна, Вялейку, увечары пройдзе сустрэча з выбарцамі ў Менску.

Дарэчы, у сталіцы кандыдат Мілінкевіч сустрэнецца з народам яшчэ некалькі разоў: 1, 2, 8, 12, 17, 18 сакавіка. Найбуйнейшая сустрэча заплянаваная на 2 сакавіка. Яна мае адбыцца а 18-й на плошчы Свабоды.

3 сакавіка Аляксандар Мілінкевіч наведае Ліду;
4 — Горадню, Ваўкавыск і Слонім;
5 — Баранавічы і Салігорск;
9 — Бярозу;
10 — Кобрынь;
11 — Берасьце, Драгічын і Пінск;
15 — Жодзіна;
16 — Барысаў.

У праграме візытаў магчымыя зьмены.

**ЗД**

## Справа Касьяровіча пайшла ў суд

Крымінальная справа Зьмітра Касьяровіча 8 лютага перададзеная ў суд Маскоўскага раёну. 9 лютага зь ім змог сустрэцца адвакат Павал Сапелка.

Днямі маці Зьмітра Тацяна Касьяровіч атрымала другі ліст ад сына. Паводле ейных падлікаў, лісты ад яе ў СІЗА ідуць 6 дзён, адтуль нашмат хутчэй — за пару дзён.

Аптымізму Зьміцер за кратамі не губляе, піша: «Я заўжды марыў паглядзець Пішчалаўскі замак больш дасканала. Вось і паглядзеў». Хаця звыкнуцца жыць за кратамі немагчыма: «Зранку прачынаюся і доўга не магу зразумець, дзе я знаходжуся». Маці перадала хвораму гарчычнікі: «А антыбіётыкі не прынялі. Кажуць: у нас усё ёсьць. Але мне казалі жанчыны ў чарзе, што там толькі адзін асьпірын».

Зьмітра, як і іншых палітвязьняў, можна падтрымаць лістом. Тацяна Касьяровіч кажа, што можна дасылаць і тэлеграмы: у камэру іх прыносяць, а ідуць яны значна хутчэй, чым лісты.

**АШ**

**Напішы палітвязьням:**

220050 Менск, вул.Валадарскага, 2, СІЗА №1, камэра 146. **Касьяровічу Зьмітру**.

220050 Менск, вул.Валадарскага, 2, СІЗА №1. **Фінькевічу Артуру**.

211652 Полацкі раён, п.а. Малое Сітна, да запатрабаваньня **Севярынцу Паўлу**.

225416 Баранавічы, вул.Жукава 12а, кв.5, **Статкевічу Мікалаю**.

**АПЫТАНЬНЕ «НН»**

## Колькі людзей прыйдзе 2 сакавіка?

Штаб А.Мілінкевіча абвесьціў, што 2 сакавіка а 18.00 у Менску, на плошчы Свабоды, падчас «усебеларускага народнага сходу», пройдзе вялікая сустрэча выбарцаў з кандыдатам у прэзыдэнты ад дэмакратычных сілаў. Колькі людзей, па-Вашаму, зьбярэцца на яе?

**Андрэй Клімаў,** палітык, высланы на прымусовыя працы: Менск на сёньня — самы рэвалюцыйны горад, таму пры добрым інфармаваньні пра сустрэчу прыйдзе багата людзей, добра, каб хапіла плошчы.

**Аляксандар Агееў,** дэпутат Магілёўскага гарсавету: Усё залежыць ад эмацыйнага настрою выбаршчыкаў, а кампанія пакуль праходзіць надзіва спакойна. Таму прыйдзе некалькі тысячаў. Калі ж адбудзецца нейкі эмацыйны ўсплёск, то варта чакаць і болей.

**Ірына Тоўсьцік,** актывістка аднаго з моладзевых рухаў: У найлепшым выпадку — 20—25 тысячаў.

**Барыс Гарэцкі,** актывіст аднаго з моладзевых рухаў: Калі штаб адзінага будзе працаваць бяз збояў, зьбярэцца 5 тысячаў.

**Станіслаў Багданкевіч,** экс-старшыня Нацбанку: Сёньня 2006 год, таму прыйдзе добра калі тысяча.

**Артур Клінаў,** мастак: Пры добрай арганізацыі і рэкляме мерапрыемства можна чакаць тысячаў пяць. А так добра, каб паўтысячы сабралася.

**Пётра Садоўскі,** пасол Беларусі ў Нямеччыне (1992—1994): Усё будзе залежаць ад таго, дазволеная будзе акцыя ці не.

**Андрэй Петравых,** актывіст АГП: Тысячаў пяць-сем.

**Юрась Зянковіч,** актывіст Партыі БНФ: Тры тысячы пры добрым раскладзе.

**Аляксандар Пілецкі,** студэнт з Горадні: Пры ўмове добрай арганізацыі 10—15 тысячаў выбарцаў зьбярэцца.

**Эдвард Зайкоўскі,** археоляг: У другой палове 90-х прыйшло б шмат…

**Леанід Заіка,** палітоляг: Думаю, дзьве з паловай тысячы прыйдуць.

**Зьміцер Гаўрусік**, праходзіць па справе Касьяровіча: Прынамсі, адзін будзе.

**Запісаў Сямён Печанко**

# Звышвысілкі для міні-вынікаў

**Віталь Сіліцкі:** Галоўная памылка, якую зрабілі Мілінкевіч і яго каманда, — гэта пачатак перамоваў са штабам Казуліна да таго, як апошні выразна вызначыў сваю пазыцыю і праявіў, на якім баку ён насамрэч гуляе.

Супраць сп.Казуліна нічога ня маю. Ён грамадзянін Беларусі і, значыць, мае права балятавацца. Яго прэтэнзіі на палітычнае лідэрства таксама цалкам законныя. Але ёсьць пытаньні да Казуліна як дэмакратычнага палітыка.

Па-першае, вельмі хуткі пераход у статусе з стаўпоў рэжыму да галоўных апазыцыянэраў. Казулін, вядома, не адзін такі, але, як мінімум, можна было б чакаць выбачэньняў за выключэньні студэнтаў, пацярпелых за палітычную дзейнасьць падчас яго рэктарства ў БДУ. Падругое, і самае галоўнае, даволі красамоўныя заявы, зробленыя спадаром Казуліным у пачатку лютага, што ўздымаюць пытаньне: ці ён яшчэ адзін дэмакрат, ці яшчэ адзін Гайдукевіч?

Вось некалькі цікавых фактаў. Іміджавыя інтэрвію Казуліна зьяўляюцца ня толькі ў «Народнай Волі», але і ў праўладнай газэце «Обозреватель». Гасьціннасьць, зь якой прапанавала Казуліну свае старонкі газэта, уладальнік якой некалькі год таму ледзь не пахаваў тую самую «Народную Волю», даволі паказальная. Зь цяжкасьцю верыцца, што «Обозреватель» дазволіць камусьці крытыкаваць на сваіх старонках Лукашэнку па ўласнай ініцыятыве. Аднак Казулін у сваім інтэрвію 3 лютага, як кажуць, «раскалоўся» і сапраўды пачаў агітацыю (як яшчэ назваць выкладаньне ўласных плянаў пасьля магчымага абраньня прэзыдэнтам) у стылі бэк-вакалу дзяржаўнай прапаганды.

Чытаем: Казулін — «праціўнік дэстабілізацыі ў краіне» (маецца на ўвазе: Мілінкевіч за дэстабілізацыю); Мілінкевіч кіраваў рэсурснымі цэнтрамі і сядзеў на замежным фінансаваньні (а то праказулінская заказуха ў «Народнай Волі» забясьпечваецца беларускімі крыніцамі, і наагул: хто некалькі год сядзеў на тых ільготах, якія прапісаў калісьці БДУ Лукашэнка?); Мілінкевіч — выпучэнец БНФ (а то ў штабе Казуліна нацыяналістаў менш) і г.д.

Цікава, што Казулін пачаў атаку на Мілінкевіча менавіта тады, калі рэзка ўзмацнілася атака афіцыёзу на апазыцыю, калі дзяржаўнае тэлебачаньне запусьціла ў этэр чарговы цыкль антыапазыцыйных дакумэнтальных фільмаў. Карацей, адразу і не разьбярэсься, ці гэта Казулін, ці Азаронак.

Дык вось, галоўная памылка, якую зрабілі Мілінкевіч і яго каманда, — гэта пачатак перамоваў са штабам Казуліна да таго, як апошні выразна вызначыў сваю пазыцыю і праявіў, на якім баку ён насамрэч гуляе. Сеўшы за стол перамоваў, аб'яднаная апазыцыя прызнала Казуліна ня толькі роўным сабе, але і дэмакратычным прэтэндэнтам, выпісаўшы яму індульгенцыю за ўсе астатнія ўчынкі падчас рэшты кампаніі. Сказаўшы А, трэба казаць і Б, і цяпер трэба пачынаць гульню ў аб'яднаньне.

А Казулін між тым выкарыстоўвае свае інфармацыйныя рэсурсы (дарэчы, калі б у Мілінкевіча сапраўды было б столькі грошай, пра што намякае Казулін, «Народная Воля» выходзіла б зусім зь іншымі матэрыяламі!), каб надалей ствараць вобраз «біпалярнай» апазыцыі. Як вынік, дэмакратычная альтэрнатыва падчас кампаніі канчаткова размываецца. Добра хоць тое, што Мілінкевіч часткова падправіў уласную памылку і прапанаваў Казуліну, каб адзін з кандыдатаў зьняўся на карысьць іншага. Казулін меў рацыю, калі назваў гэтую прапанову правакацыйнай, але гэтая правакацыя, здаецца, дапамагла высьветліць — хто ёсьць хто.

Сапраўды, Казулін адыгрывае ў гэтай кампаніі пэўную ролю, якая зусім ня зводзіцца да мабілізацыі прыхільнікаў пераменаў. Дзеля таго, каб ён гуляў іншую ролю, штабу Мілінкевіча трэба было пазьбягаць крокаў насустрач як мінімум да таго, калі Казулін сам бы вызначыўся, альбо «заціснуўшы» сябе ў рамкі апазыцыянэра, альбо пачаўшы тую гульню, якую ён урэшце пачаў. Але гэта ўжо ўмоўны лад.

Нават калі Казулін — фігура, незалежная ад уладаў (у чым ён сам даў падставы сумнявацца), размываньне дэмакратычнай альтэрнатывы цяпер дазваляе ўладзе рэалізаваць сцэнары, што могуць не дазволіць апазыцыі нават рэалізаваць праграму-мінімум. Шляхам статыстычнага «размыву» галасоў дэмакратычнага электарату на другое месца можна будзе вывесьці, напрыклад, спадара Гайдукевіча. Пытаньне, каго паставяць на трэцяе месца, Казуліна ці Мілінкевіча, ужо не прынцыповае. Пры такім раскладзе можна канчаткова забіць веру ў апазыцыю, а разам з тым веру і ў тое, што аб'яднаньне, салідарнасьць, адзінства чагосьці вартыя ў палітычнай барацьбе.

Такім чынам, пытаньне аб тым, што адбудзецца 19 сакавіка, адпадае само сабой. Паспрабуйце прымусіць кагосьці выйсьці на вуліцы для таго, каб даказаць сваё кроўнае другое месца! Акрамя таго, няўдача на выбарах і на вуліцы можа выклікаць хуткі развал дэмакратычнай кааліцыі пасьля выбараў...

Дык ці застанецца ў гэтых выбараў інтрыга? Нечаканасьці заўжды могуць быць. Але цяпер, здаецца, трэба прыкладаць звышвысілкі для дасягненьня міні-вынікаў...

**Поўны тэкст аналізу Віталя Сіліцкага чытайце ў наступным нумары «ARCHE», што зьявіцца ў продажы з 23 лютага.**



Пытаньне, каго паставяць на трэцяе месца, Казуліна ці Мілінкевіча, ужо не прынцыповае. Пры такім раскладзе можна канчаткова забіць веру ў апазыцыю, а разам з тым веру і ў тое, што аб'яднаньне, салідарнасьць, адзінства чагосьці вартыя ў палітычнай барацьбе.

# Лукашэнка «ўсё дараваў» Шаўцову

На аўтарскую гадзіну зоркі інтэрнэт–рэсурсу «Русский журнал» (www.russ.ru) і аўтара кнігі «Пуцін. Яго ідэалёгія» Аляксея Чадаева ў Менску прыйшлі толькі два наведнікі. Ім ён і расказаў сакрэцік.


«БДГ. ДЕЛОВАЯ ГАЗЕТА»

**Юры Шаўцоў заслужыўся ў прэзыдэнта.**

На XIII Менскую міжнародную выставу-кірмаш «Кнігі Беларусі» прыехала велізарная расейская дэлегацыя. Расейскія выдавецтвы разьмясьціліся ў шыкоўным павільёне, дзе праходзілі сустрэчы зь пісьменьнікамі і выдаўцамі.

«Расейскі дэсант» працаваў усе дні. Ладзіліся сустрэчы з чытачамі, круглыя сталы. Прэзэнтацыя кнігі выкладчыка Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту Юр'я Шаўцова «Аб'яднаная нацыя» з удзелам палітоляга Глеба Паўлоўскага прайшла ў Палацы Рэспублікі. Але там, дзе мерапрыемствы ладзіліся безь беларускіх арганізатараў, гледачоў было вобмаль. На сустрэчу з дэтэктыўшчыцай Палінай Дашкавай у кнігарню «Сьветач» прыйшлі дзясятак цікаўных, адзін зь якіх вельмі хацеў атрымаць аўтограф пісьменьніцы на кнізе Картасара.

На аўтарскую гадзіну зоркі інтэрнэт-рэсурсу «Русский журнал» (www.russ.ru) і аўтара кнігі «Пуцін. Яго ідэалёгія» Аляксея Чадаева прыйшлі толькі два наведнікі. Выявілася, што паспалітых жыхароў краіны мала хвалюе ідэалёгія Пуціна, сваю б адужаць. Двое наведнікаў больш цікавіліся кнігай «Аб'яднаная нацыя» Шаўцова, і Чадаеў зазначыў, што ведае адно: гэтую кнігу прачытаў Лукашэнка. «Прэзыдэнту кніга спадабалася, і ён пасьля яе прачытаньня заявіў: «Усё даравацЬ». Стала ясна, чаму на прэзэнтацыю гэтай кнігі аддалі «дзяржаўную залю» Палацу Рэспублікі. З гэтай малой рэплікі — нават калі яна апакрыфічная — можна шмат зразумець пра функцыянаваньне сыстэмы ўлады ў Беларусі.

Ненашмат больш было ахвотных сустрэцца зь літкрытыкам Натальляй Івановай (намесьніца галоўнага рэдактара часопісу «Знамя»), празаікамі Леанідам Барадзіным (гал. рэдактар «Москвы»), Дзянісам Гуцком (ляўрэатам расейскага «Букера»). Шкада, бо гэта была ці не найбольш цікавая сустрэча. Аматары літаратуры маглі пачуць імёны пэрспэктыўных аўтараў — Захар Прылепін, Зьміцер Новікаў, Ірына Мамаева, Марыя Кучэрская. Літаратурным адкрыцьцём быў названы Герман Садулаеў, які піша на мяжы мастацкай літаратуры і нон-фікшн. «Гэта рэч пра чачэнскую вайну, напісаная знутры чачэнскай сьвядомасьці. Тое, чаго ў нашай літаратуры яшчэ не было», — казала Н.Іванова.

Ад эканомікі перайшлі на палітыку. А.Архангельскі (калюмніст «Известий») нахвальваў Віктара Пялевіна: «У яго фантазія працуе вельмі добра. Лепш, чым у нашых і вашых чэкістаў, якія нічога лепшага прыдумаць ня могуць, як зрабіць аднатыпныя фільмы з разрывам у два тыдні. Адзін — пра маскоўскі падкладны камень, другі — пра падкопы польскай выведкі».

Палітыка была ня толькі ў размовах. На сустрэчу з расейскімі літаратарамі ў Пушкінскую бібліятэку не пусьцілі кіраўніка Беларускага ПЭН-цэнтру Ўладзімера Някляева. Работнікам бібліятэкі паведамілі з абласной адміністрацыі, што паэт прыйдзе ладзіць скандал. Някляеў кажа, што мае копію падобнага ліста зь Мінадукацыі, дзе забараняецца ладзіць сустрэчы зь сябрамі Саюзу беларускіх пісьменьнікаў і рэкамэндуецца — зь сябрамі афіцыйнага СПБ.

Палітыка была ня толькі ў размовах.

Найбольш шматлюдная выйшла сустрэча з дэтэктыўшчыцай Аляксандрай Марыніной. Напярэдадні выставы ў інтэрвію беларускаму выпуску «Камсамолкі» яна заявіла, што не ўяўляе прэзыдэнта Беларусі з мастацкай кніжкай у руках, адразу дадаўшы: «Яму няма калі». З усіх расейскіх удзельнікаў выставы яна была, бадай, адзіная, хто не паказваў усім сваім выглядам, што прыехаў выступаць у правінцыю.

**Адам Воршыч**

# Кошт канцэртаў «За Беларусь»: адкуль бяруцца грошы?

Толькі «J_Mors» адмовіўся браць удзел у туры «За Беларусь».

Удзельнікі праекту «За Беларусь» аб'едуць усе абласныя гарады і дадуць гала-канцэрт у Менску. Падчас выступаў некаторыя наўпрост заклікаюць галасаваць «за Беларусь». Цікаўны глядач тым часам шукае падсэнсы: ці выпадкова вядоўца Ягор Хрусталёў начапіў бел-чырвона-белы гальштук, ці артыст Крыжаноўскі абраў для паказу сцэнку пад назвай «Тытанік»? Але гэта хутчэй «гульні розуму».

Толькі «J_Mors» адмовіўся браць удзел у туры «За Беларусь», хоць гурт і праанансавалі на TV.

Адзінае, з чым згодныя ўсе «групоўкі», што канцэрты «За Беларусь!» — агітацыйныя, хоць ЦВК і адмаўляецца. На гэтае палітызаванае шоў ідуць шалёныя грошы. У адрозьненьне ад звычайнага канцэрту, на «За Беларусь» уваход вольны. Праўда, толькі для дзяржслужбоўцаў, актыўных БРС Маўцаў і пераможцаў леташняга жніва. Беларускія артысты, ганарары за выступ якіх сягаюць ад 100 да 600 даляраў, пагаджаюцца выступіць задарма (потым акупіцца!), а вось «запрошаныя зоркі» — ніколі. Іх ганарары — ужо даўно не камэрцыйная таямніца, а некаторыя тарыфы нават на сайтах разьмяшчаюць. Газманаў, Бабкіна, Мэладзэ меней за 10 тыс. даляраў не бяруць. Агулам жа (аплата запрошаных зорак, ускосная кампэнсацыя беларускім удзельнікам праз будучыя высутпы й ганарары, кошт заляў, дэкарацый, апаратуры, праезду, пражыцьця, фуршэтаў) кожнае шоў цягне на дзесяць газманавых. З улiку, што «забеларуская» кампанія ахапіла ўсе абласныя цэнтры, выходзім на сотні тысячаў даляраў. Паколькі бюджэт кампаніі, зацьверджаны Цэнтравыбаркамам, такіх канцэртаў не прадугледжвае, адкуль на іх бяруцца грошы?

Пасьля першага канцэрту ў незалежных музычных колах паўстала ідэя: напісаць адкрыты зварот да ўдзельнікаў акцыі. Маўляў, спыніцеся, вы заклікаеце за тую Беларусь, у якой парушаюцца ўсе магчымыя свабоды ды зьнікаюць людзі. Але які сэнс, калі Галіна Шышкова ў інтэрвію «Белгазеце» заяўляе: «Натуральна, няма такой дзяржавы, у якой бы ўсё было ідэальна, але жыць у Беларусі — вялікае шчасьце, бо тут няма вайны і тэрарызму».

Для Шышковай, Слукі, Смолавай, «Атлянтыкі», «Цягні-Штурхая» — гэта добрая піяр-акцыя з шалёнымі тэлерэйтынгамі: усе канцэрты ідуць у прайм-тайме. І спрачацца зь імі аніяк не выпадае.

**Сяргей Будкін**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Гурт «J_Mors» грае на афіцыйных антысьнідаўскіх акцыях (на фота), але браць удзел у «забеларускім» туры не жадае.**

# Спачатку зробяць хораша ўздоўж аўтадарог

З 1 красавіка дзяржава атрымае права канфіскаваць недабуды.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Гаспадару гэтага катэджу таксама пагражае канфіскацыя.**

Указ прэзыдэнта №87, што ўступіць у сілу 1 красавіка, у якасьці галоўнай меры па скарачэньні аб'ёмаў незавершанага будаўніцтва дамоў і лецішчаў замацаваў адбіраньне гэтых дамоў. Найперш канфіскуюць будынкі, што месьцяцца бліжэй за 500 м ад рэспубліканскіх аўтадарог.

У Беларусі ўведзены паняткак «тэрміны будаўніцтва». Калі за тры гады ад моманту атрыманьня дазволу гаспадару ўчастку не ўдалося дабудаваць хату — яе выкупіць альбо прадасьць з публічных таргоў дзяржава. Прычым ацэньвае будынак таксама яна. Як паведамілі «НН» у Дзяржкамітэце па зямельных рэсурсах, гаспадару недабудаванай хаты, напрыклад, у Бараўлянах, пасьля такой ацэнкі на рукі выдадуць ня больш за 10 тыс. даляраў у эквіваленце (у той час як сярэдні кошт дамка ў тым раёне сягае $200 тыс.).

Да 1 красавіка 2009 г. мясцовым органам улады наказана выявіць недабудаваныя жылыя дамы — і тады бывай, нерухомасьць. Паводле ацэнак незалежных экспэртаў у галіне нерухомасьці, ужо да канца 2009 г. да 30% недабудаваных дамоў і лецішчаў можа апынуцца ў дзяржаўнай уласнасьці.

Ёсьць, праўда, палёгка для тых, чые дамы стаяць далей чым на адлегласьці ў паўкілямэтра ад рэспубліканскіх дарог. Для іх прадугледжаная магчымасьць кансэрвацыі будаўніцтва на тэрмін яшчэ да трох год.

**Зьміцер Дрыгайла**

# Алексіевіч зьяжджае ў Швэцыю

Швэдзкі ПЭН-цэнтар запрасіў аўтарку «Чарнобыльскай малітвы» на два гады ў Гётэборг.

«Так, я еду ў Гётэборг. У сьвеце ёсьць гарады-сховы, што даюць прытулак творчым асобам з краінаў-ізгояў, дзе няма ўмоваў для нармальнай творчасьці», — кажа пісьменьніца. Гэта не эміграцыя, падкрэсьлівае С.Алексіевіч, якая 4,5 гады правяла ў Італіі і Францыі, а цяпер выпраўляецца на радзіму Нобэлеўскай прэміі ў галіне літаратуры: «Хачу спакойна папрацаваць, але заставацца там не зьбіраюся».

За час вымушаных вандровак па Эўропе выйшла пад 50 перакладаў твораў спн. Алексіевіч. Адна толькі «Чарнобыльская малітва» перакладзеная на 21 мову. Зьнята некалькі фільмаў, з посьпехам праходзяць тэатральныя пастаноўкі паводле ейных твораў.

Апошнія два месяцы пісьменьніца правяла на радзіме. Яна наведала дзясятак гарадоў і мястэчак, паўдзельнічала ў літаратурнай вечарыне і дала інтэрвію радыё «Свабода».

**Сямён Печанко**

# Лукашэнка раздае стыпэндыі творчым работнікам

Тыднёвік «ЛіМ» за 3 лютага зьмясьціў сьпіс дзеячаў культуры й мастацтва, якія атрымалі дзяржаўныя стыпэндыі на 2006 г. ад Міністэрства культуры. Першым у сьпісе творцаў у веку да 40 гадоў стаіць паэт Янка Лайкоў, які нядаўна перайшоў з Саюзу беларускіх пісьменьнікаў у чаргінцоўскі Саюз. Стыпэндыя складае 4 базавыя велічыні штомесяц (базавая велічыня — 29 тысяч).

А ў сьпісе дзеячаў, якія пераступілі 40-гадовы рубеж, першым ідзе хваласьпевец Лукашэнкі Браніслаў Спрынчан. Ягоная штомесячовая стыпэндыя складае 6 базавых велічыняў.

**Аркадзь Шанскі**

# Арганізацыю Бутэвіча не зарэгістравалі

Мін'юст без тлумачэньня прычынаў адмовіў у рэгістрацыі грамадзкаму аб'яднаньню «Беларускае краязнаўчае таварыства». Устаноўчы сход аб'яднаньня прайшоў год таму. Кіраўніком аб'яднаньня быў абраны пісьменьнік Анатоль Бутэвіч — экс-міністар і пасол, а сёньня — кансультант аднаго з банкаў.

За 2005 год у Беларусі было зачынена 68 арганізацый, яшчэ дзясяткам адмоўлена ў рэгістрацыі нягледзячы на тое, што Канстытуцыя гарантуе права на свабоду асацыяцый.

**АШ**

# Суд над «Нівай» перанесьлі

Яны сядзелі на лаве падсудных, нібыта якая сыцылійская мафія. Адзінаццаць чалавек: Яўген Міранові, Яўген Вапа, Юрка Каліна, Лена Глагоўская, Міраслава Лукша, Міхась Андрасюк, Юрка Хмялеўскі, Юрка Шульскі, Пятро Юшчук, Міхась Стальмашонак, Мар'я Паўлючук. Два прафэсары, два пісьменьнікі, кінарэжысэр, журналісты...

14 лютага ў Беластоцкім раённым судзе адбыўся чарговы разгляд так званай справы па фінансавых парушэньнях Праграмнай рады тыднёвіка «Ніва».

Пракурор зачытаў абвінавачваньне. У адказ Яўген Міранові агучыў заяву, пратэстуючы супраць таго, што беластоцкія ўлады апошнія гады вядуць шальмаваньне дзейнасьці беларускай меншасьці на Беласточчыне, у тым ліку і тыднёвіка «Ніва».

На пытаньні судзьдзі пагадзілася адказаць толькі бухгалтарка тыднёвіка Мар'я Паўлючук. Працэс працягнецца 10 сакавіка. 4 сакавіка штотыднёвіку «Ніва» споўніцца 50 гадоў.

Працэс асьвятлялі пераважна журналісты зь Беларусі. Здымалі паседжаньне толькі дзьве кінакамэры мясцовых тэлеканалаў. На разглядзе справы прысутнічаў старшыня сэнацкай камісіі правоў чалавека і правапарадку Зьбігнеў Рамашэўскі. Журналістам сэнатар сказаў, што ён лічыць абвінавачваньні абсурднымі. На паседжаньні не было ніводнага прадстаўніка беларускага консульства ў Беластоку.

**Алесь Аркуш, Беласток**

# «Настаўніцкая газета»: хто не за Лукашэнку, той экстрэміст

«Настаўніцкая газета» (№ 20, 9 лютага) надрукавала матэрыялы круглага стала «Арганізацыя работы па прадухіленьні ўплыву незарэгістраваных моладзевых груповак на навучэнскую моладзь», што быў праведзены Рэспубліканскім інстытутам прафэсійнай адукацыі.

Прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, РІПА, МУС абмяркоўвалі дзейнасьць «радыкальных моладзевых груповак палітычнай скіраванасьці». У якасьці такіх называюцца РНЕ, а разам зь ёю таксама камсамол, «Зубр», «Малады фронт», «Белы легіён», «Маладыя дэмакраты», «Маладая грамада», «Грамадзянскі форум», «Сёмая грань», «Партнэрства». Гэта значыць, у экстрэмісты запісалі ня толькі рэальных нацыстаў, але і ўсіх, хто мае палітычныя перакананьні, ня згодныя зь цяперашняю ўладай — сацыял-дэмакратаў, лібэралаў, хрысьціянскіх дэмакратаў. Карэспандэнт не задаецца пытаньнем, наколькі гэта згодна з Канстытуцыяй, якая ўсім, у тым ліку й моладзі, гарантуе свабоду палітычных поглядаў.

Міністэрства адукацыі натуе абуджэньне моладзевых арганізацыяў у 2005 годзе. «Нельга недаацэньваць лідэраў гэтых груповак, многія зь іх вельмі неардынарныя людзі».

РНЕ, акрамя Менску, паводле Міністэрства, мае свае філіі ў Лідзе, Навагрудку і Клімавічах. Адзначаецца актывізацыя дзейнасьці «Белага легіёну» ў Драгічынскім раёне.

Элемэнты дэструктыўнасьці «пэдагогі» ўгледжваюць нават у дзейнасьці рокераў, мэталістаў, брэйкераў, бітламанаў, рэйвэраў, аматараў хіп-хопу, будыстаў, даасістаў і прыхільнікаў «сыстэмы». Аднак гэтыя ня сама хвалююць газэту: «для іх характэрна абыякавасьць да палітыкі».

«Любая начная дыскатэка да раніцы можа набыць незвычайную дэструктыўную афарбоўку», — папярэджвае газэта.

**СП**

# «Во славу Родины»: флэш-мобы — зброя імпэрыялізму

Напэўна, хутка ў Менску ды іншых гарадах людзям будзе забаронена на вуліцы завязваць матузкі, раскрываць парасоны ў яснае надвор'е ды яшчэ шмат чаго. А ўсё таму, што гэта ёсьць флэш-мобамі — кепскай справай, небясьпечнай для дзяржавы...

Месяц таму ў рубрыцы «нацыянальная бясьпека» ў газэце «Во славу Родины» быў надрукаваны артыкул пад назвай «Флэш-мобы: жарты ўбок». Беларускія вайскоўцы б'юць трывогу: маўляў, флэш-моб — зброя бруднай палітыкі. У артыкуле напісана, што людзі, якія імкнуцца да ўлады праз «імгненны натоўп» (так перакладаецца flash mob з ангельскае), праграмуюць людзей на розныя вар'яцкія ўчынкі. А зь цягам часу гэтыя палітыкі могуць выкарыстоўваць людзей у сваіх мэтах. Паводле «Во славу Родины», грузінская і ўкраінская рэвалюцыя пачыналіся таксама з флэш-мобаў, а іхнае правядзеньне фінансавалася непасрэдна Фондам Сораса.

Пра тое ж, што плянуюцца і абмяркоўваюцца флэш-мобы на форумах ў Інтэрнэце, што яны ня могуць выяўляць палітычных ідэяў ці рэклямы, што прыходзяць на акцыі невядомыя адзін аднаму людзі — на гэта журналісты ўвагу зьвярнуць забыліся. Куды важней данесьці — вось яшчэ адзін вораг нашай краіны, ад якога варта бараніцца.

Такім чынам, у беларускіх «мобэраў» застаецца два варыянты. Першы — рызыкаваць і праводзіць жарт-акцыі, як і раней. Але ў такім разе існуе небясьпека быць затрыманымі за парушэньне правапарадку. Другі варыянт — афіцыйна праводзіць флэш-мобы, падаючы заяўкі ў адпаведныя ўстановы. І пойдуць лісты ў гарвыканкам з просьбамі дазволіць пяці дзясяткам чалавек а шостай гадзіне сабрацца каля помніка Якубу Коласу і завязаць матузкі...

Гэта будзе ўжо куды сьмяшней за самі флэш-мобы.

**Антось Трафімовіч**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Праймэрыз

«Я, вядома, супраць Лукашэнкі, але ж большасьць усё роўна прагаласуе за яго». Калі гэтая фраза прагучала на перакуры ў Алёшчы мо раз дзясяты, я сказаў сабе: «Хопіць!» Назаўтра ў бытоўцы на агульным сходзе брыгады мы зладзілі *праймэрыз*.*

У «бюлетэні», нарэзаныя з паперы, былі ўнесеныя прозьвішчы ўсіх прэтэндэнтаў, якія падалі заявы ў Цэнтравыбаркам (тады іх было яшчэ васьмёра). З паведамленьня ЦВК, апублікаванага ў «Советской Белоруссии», былі зачытаныя афіцыйныя дадзеныя Вайтовіча, Гайдукевіча, Казуліна, Лукашэнкі, Мілінкевіча, Пазьняка, Скрабца й Фралова. «Кабінку» з асадкай абсталявалі за печкай. Ролю выбарчай скрыні выканаў чорны вязаны каптур: кожны з прысутных мог абмацаць яго і пераканацца ў адсутнасьці двайнога дна.

Яўка склала 84%: двое з дванаццаці на працу не зьявіліся (давялося пашкадаваць — маладзейшыя, сымпатызавалі апазыцыі). Астатнія разабралі бюлетэні.

Працэс волевыяўленьня ішоў нэрвова. Рабочыя падазрона паглядвалі адзін на аднаго, хаваліся ў «кабінцы», крэсьлілі й складвалі паперкі, кідалі іх у шапку й пільна сачылі за іншымі. Нарэшце, усе дзесяцёра ўгнязьдзіліся ля поўнага каптура, недаверліва пераглядваючыся. З хвіліну панавала ціша.

«Ну, не тамі, ускрывай!» — нарэшце ня вытрымаў кранаўшчык Іван.

З кожным разгорнутым бюлетэнем выразы твараў мяняліся. «Мілінкевіч, Мілінкевіч, не запоўнены, Мілінкевіч, Мілінкевіч...» Прыёмшчыца Майя расплывалася ў шырокай-шырокай усьмешцы, раскрыжоўшчык Валера вырачаў вочы, стропальшчык Уладзя паціраў рукі й нават прыхлопваў з кожным выгукам, пагрузчык Сяргей сядзеў з раскрытым ротам, а Мікалай, пячнік, які нядаўна перабраўся сюды з Расеі, агаломшана азіраў прысутных, яўна не разумеючы, што адбываецца.

Мілінкевіч набраў 7 галасоў, Лукашэнка — усяго 1, два бюлетэні пакінулі незапоўненымі. Маленькая электаральная рэвалюцыя ў адной асобна ўзятай брыгадзе зьдзейснілася.

Вынікі алёшчынскіх праймэрыз мелі для вёскі эфэкт выбуху бомбы. Ужо назаўтра сіценцы, якія ранішняй вахтоўкай ехалі на дызэль, наперабой прызнаваліся, што яны «таксама за

## СЬЦІСЛА

**Дзень салідарнасьці 16-га**

Вялейскі суд 13 лютага даў **Міколу Суслу** і **Уладзімеру Малярчуку** 145 тыс. руб. штрафу за распаўсюд улётак да Дня салідарнасьці.

13 лютага ў Менску падчас расклейкі ўлётак міліцыя затрымала **Алега Дзямчанку, Аляксандра Пазьняка, Ксенію Палаш, Аляксандру Сьвітко**. На іх склалі пратаколы. У цэнтры Менску былі затрыманыя 22 моладзевыя актывісты: **Яўген Афнагель, Павал Юхневіч, Ніка Лазоўская, Натальля Вушко, Дар'я Малдаванава, Любоў Кучынская, Л.Пяцэвіч, Кацярына Дзядкоўская, А.Колчык, Яўгенія Карона, Міхаіл Герасімовіч, Аляксандар Чарнышоў, Андрэй Баркоўскі, Кацярына Аладка, Канстанцін Мартыновіч, Мікіта Шуцянкоў, Настасься Шашкова, Алеся Кавалеўская, Зьміцер Юркоў, Уладзімер Пархоменка, Макс Сусед, Андрэй Кузьміцкі**. А 23-й усіх адпусьцілі. 14 лютага суд Партызанскага раёну Менску даў **Я.Афнагелю** 15 сутак.

**Подпісы кату пад хвост**

Подпісы за вылучэньне **А.Мілінкевіча**, сабраныя ў 10 раёнах Гарадзеншчыны (Астравецкі, Ашмянскі, Ваўкавыскі, Гарадзенскі, Зэльвенскі, Іўеўскі, Мастоўскі, Навагрудзкі, Слонімскі, Шчучынскі), прызнаныя несапраўднымі.

**Штраф за каляндарыкі**

Моладзевага актывіста з Мастоў **Яўгена Скрабутана** аштрафавалі на 10 б.в. (290 тыс. руб.) за распаўсюд каляндарыкаў з партрэтам Мілінкевіча.

**Памарозілі чарнобыльца**

У вёсцы Сірод (Калінкавіцкі раён) 8 лютага міліцыянты ўжылі сілу супраць чарнобыльскага ліквідатара, інваліда II групы **Васіля Сіліверста**. У Доме культуры ён патрабаваў прыбраць агітацыйны стэнд зь біяграфіяй Лукашэнкі. Калі супрацоўніца ДК адмовілася, В.Сіліверст сам зьняў біяграфію. Выкліканая з райцэнтру апэргрупа павалiла чалавека на сьнег тварам долу і гадзіну трымала на марозе, шукаючы аркуш зь біяграфіяй. З райаддзелу міліцыі сп.Сіліверста даставілі ў бальніцу. Дактары канстатавалі абмаражэньне жывата.

**Правакацыя супраць Новікавай**

На мянчанку **Аксану Новікаву** пракуратура Койданава «актывізавала» крымінальную справу за махлярства. У 2005 г. супрацоўнікі пашпартнага аддзелу гораду выявілі, што нейкая жанчына атрымала фальшывы пашпарт з фатаздымкам А.Новікавай. Сама спн. Новікава тлумачыць актывізацыю справы тым, што спрабавала прыцягнуць вядучага тэлепраграмы «Паліттэхналёгіі» Яўгена Новікава да адказнасьці за прапаганду вайны.

**Думалі, шпіёны**

11 лютага ў Горадні міліцыянты затрымалі мікрааўтобус з **5 грамадзянамі Швэцыі** (студэнты, сябры моладзевай фракцыі Партыі мадэратаў), а таксама прадстаўнікамі Моладзі БНФ: **Франкам Вячоркам, Кацярынай Маркоўскай, Алесем Калітом, Сьцяпанам Сьвідзерскім** і кіроўцам транспарту **Міхасём Васілеўскім**. Група ехала на экскурсію, міліцыянты шукалі незарэгістраваныя матэрыялы.

У памяшканьні, што належыць кіраўніку берасьцейскага штабу А.Мілінкевіча, актывісту АГП **Уладзімеру Радзівончыку**, 11 лютага адбыўся ператрус. Міліцыянты спаслаліся на тэлефанаваньне, што ў сутарэньнях дому захоўваюцца боепрыпасы. Снарадаў не знайшлі, канфіскавалі дакумэнтацыю АГП, календары й плякаты з адзіным.

**За прэсай цікуюць**

Пасольства Беларусі 6 лютага адмовіла ў візе журналісту найбуйнейшай славацкай газэты «Смэ» **Мірку Тоду**. Тода меўся асьвятляць прэзыдэнцкія выбары.

Рэдактара «Баранавіцкай газэты», інваліда II групы **Уладзімера Гундара** аштрафавалі 6 лютага на 20 б.в. Яго прызналі ўдзельнікам сьнежаньскай несанкцыянаванай акцыі салідарнасьці з прэсай. Падставай для справы стаў фатаздымак з акцыі, надрукаваны ў газэце «Intex-press».

**Міколу Маркевіча** 10 лютага пільна правяралі на беларуска-польскай мяжы. Пасьля мытнага нагляду яго вярнулі на пашпартны кантроль і паўторны вобшук.

У Жабінцы (Берасьцейшчына) 11 лютага міліцыянты затрымалі грамадзкага актывіста **Васіля Андрасюка**. Пры наглядзе ў яго сумцы знайшлі бюлетэнь «Права на волю» і склалі пратакол за распаўсюд друкаваных матэрыялаў без выходных зьвестак.

**У Барысаве**

За расклейку налепак «Мы хочам новага!» 7 лютага ў Барысаве затрыманыя юныя актывісты **Юры Краўчанка** і **Мацьвей Бяляй**. 9 лютага падчас расклейкі налепак затрыманыя **Павал Мінальд, Анатоль Аляксандраў, Андрэй Хацкевіч, Аляксандар Чарнуха.**

**Моладзь Менску**

6 лютага непаўналетняга актывіста **Аляксея Чуніна** затрымалі падчас расклейкі налепак у Менску. На яго бацькоў склалі пратакол за «ўхіленьне ад бацькоўскіх абавязкаў».

У Менску ў мэтро 8 лютага затрыманы моладзевы актывіст **Алег Мяцеліца**: міліцыянты заявілі, што ён «падобны да чалавека, які ўчыніў правапарушэньне». У пастарунку ў яго зьнялі адбіткі пальцаў і склалі пратакол за «антысанітарыю».

Студэнту III курсу Менскага політэхнічнага каледжу **Аляксандру Курбацкаму** 7 лютага кіраўніцтва ўстановы пагражала адлічэньнем за пропуск заняткаў 1—4 верасьня 2005 г. Ён адбываў 10 сутак за ўдзел у акцыі падтрымкі затрыманых у Менску актывістаў грузінскай арганізацыі «Кмара».

# у Алёшчы

Мілінкевіча», і прасілі газэты зь ягонай біяграфіяй. «Вясковы тэлеграф» тэрмінова перадаваў Дрэтуні, Трудам, Уладзімераўцы: «У нас большасьць — супраць Лукашэнкі!» Выразаныя з «Нашай Нівы» ды «Камсамолкі» здымкі «Мілінкевіч у Алёшчы» пайшлі па руках з камэнтаром: «Бачыў, хто наступным прэзыдэнтам будзе?..» Паўгадзінны візыт адзінага кандыдата ў лістападзе мінулага году й магія большасьці, сфакусаваная ў выбары 10 рабочых, аказалася мацней за ўсе адміністрацыйныя рэсурсы, дзесяцігодзьдзе рэжыму і тэлевізійную прапаганду пра «90% Лукашэнкі».

Праз пару дзён на парозе пошты бабулька, якую я дагэтуль ня бачыў ані разу ў жыцьці, сустрэла мяне роспачным крыкам: «І што ён нам дасьць, ваш Мілінкевіч?!.»

Мясцовая ўлада мусіла тэрмінова прымаць меры. На тым жа тыдні мяне без тлумачэньня прычынаў замест чарговага адпачынку сьпехам накіравалі падалей ад Алёшчы на лесапавал. Участковы Андрэй Іваныч Героеў пачаў канфіскоўваць у насельніцтва каляндарыкі на 2006 г. з патрэтам Мілінкевіча (люд, у якога забіралі кроўнае, казаў, што цяпер ужо дакладна прагаласуе за апазыцыю), а старшыня сельсавету пайшла ад дзьверы да дзьверы, зьбіраючы подпісы за Лукашэнку.

Аднак зборшчыцу чакала жорсткае расчараваньне. У сіценскай краме, у сталоўцы, на алёшчынскай эстакадзе люд адмаўляўся падпісвацца нават пасьля просьбы: «Ну, гэта ж каб ён проста ў выбарах удзельнічаў!..» Некаторыя ўвогуле заяўлялі: «Мы толькі за Мілінкевіча». На вясковым участку з чатырма сотнямі зарэгістраваных выбаршчыкаў за «ўсенароднаабранага» падпісала хіба колькідзесят бабулек-пэнсіянэраў ды некалькі начальнікаў.

І скажу шчыра: пасьля абвяшчэньня вынікаў у алёшчынскай бытоўцы, у машыне, поўнай чытачоў «Нашай Нівы» і «Народнай Волі», прадчас расповеду тых, хто адмовіўся падпісвацца за Лукашэнку, я ўпершыню ясна бачыў у вачох гэтых згубленых сярод лесу вяскоўцаў тое, чаго так не стае многім гараджанам, актывістам і партыйным лідэрам. *Веру* ў перамогу 19 сакавіка.

*в.Малое Сітна*

*Праймэрыз — папярэднія выбары.

Паўгадзінны візыт адзінага кандыдата й магія большасьці, сфакусаваная ў выбары 10 рабочых, аказалася мацней за ўсе адміністрацыйныя рэсурсы.

## СЬЦІСЛА

**У Салігорску**

У Салігорску міліцыя ўзмацніла ціск на моладзевых актывістаў. У горадзе зьявілася каля 200 надпісаў «Дастаў!», што стала падставай для актывізацыі праваахоўных органаў. Непаўналетняга **Яўгена Мядзьведзева** 7 лютага забралі з дому разам з бацькам у пастарунак. Некалькі гадзінаў яго распытвалі наконт надпісаў. У той самы дзень міліцыянты наведалі адну зь сярэдніх школаў Салігорску. У кабінэт дырэктара яны выклікалі па адным **Яўгена Шкрабу, Рыгора Астапеню, Яўгена Пушчу, Віталя Бандарчука, Віталя Бондара, Івана Шылу**.

8 лютага міліцыянты затрымалі непаўналетніх **Івана Шылу, Уладзімера Лепеша, Крысьціну Самойлаву і Глеба Сандэрса**: іх зьвінавацілі ў «навязваньні стужак з джынсавай тканіны».

11 лютага пасьля сустрэчы зь мясцовымі актывістамі затрыманы кіраўнік АГП і старшыня Нацыянальнага камітэту аб'яднанай апазыцыі **Анатоль Лябедзька**. Разам зь ім затрымалі ўдзельнікаў сустрэчы **Аляксея Валабуева** й **Кірылу Храмцова**.

12 лютага ў Салігорску міліцыянты затрымалі моладзевага актывіста Дзяніса Карнова, які вярнуўся з Украіны. У пастарунку правялі асабісты нагляд хлопца і склалі пратакол пра канфіскацыю асабістых папераў.

**Ціснуць на Батуева**

Студэнта-завочніка БАТУ, актывіста Партыі БНФ **Паўла Батуева** 10 лютага выклікалі ў дэканат. Адміністрацыя факультэту, спасылаючыся на распараджэньне Міндукацыі, пагражала Паўлу адлічэньнем у сувязі з тым, што ён фігуруе ў крымінальнай «справе Касьпяровіча».

**Месца для штампа**

Беларускія памежнікі 7 лютага забаранілі выезд у Польшчу **Анжалікі Барыс**, спаслаўшыся на тое, што ў яе пашпарце няма вольнага месца на штамп. На наступны дзень яна праехала ў Польшчу праз Расею і Украіну, і там памежнікі месца для штампа знайшлі без праблемаў.

Першы старшыня Саюзу палякаў Беларусі **Тадэвуш Гавін** мае падаць у суд на БТ за фільм «Агент 590» пра дзейнасьць польскай выведкі ў Беларусі. Пра Гавіна гаварылася, што замежныя дыпляматы актыўна задзейнічалі яго ў антыбеларускай кампаніі.

**Штрафы падпрымальнікам**

**Уладзімер Леванеўскі**, сын палітвязьня Валер'я Леванеўскага, атрымаў 9 лютага пастанову адміністрацыйнай камісіі Ленінскага раёну Горадні. Яму далі штраф у 87 тыс. руб. за распаўсюд 22 сьнежня бюлетэня «Предприниматель», выдадзенага без выходных зьвестак. Камісія таксама палічыла, што зьмест бюлетэню накіраваны на «ўчыненьне шкоды дзяржаўнаму і грамадзкаму парадку».

10 лютага ў Менску затрыманы старшыня каардынацыйнай рады індывідуальных прадпрымальнікаў Менску **Аляксандар Макаеў**. З Чэрвеньскага рынку яго адвезьлі ў суд і вынесьлі афіцыйнае папярэджаньне за намер правесьці несанкцыяваную акцыю — усебеларускі страйк прадпрымальнікаў 2—3 сакавіка. Назаўтра пасьля пратэсту пракурора, Макаеву далі 10 сутак арышту.

**У Полацку**

Моладзевую актывістку, вучаніцу школы №9 г.Полацку **М.Дзямянчонак** 27, 30, 31 студзеня выклікалі на размову прадстаўнікі школьнай адміністрацыі й патрабавалі распавесьці пра ўдзел у выбарчай кампаніі, а таксама пра дзейнасьць ейных сваякоў — актывістаў дэмакратычнага руху.

А 2.30 ночы 13 лютага ў Наваполацку міліцыянты затрымалі актывіста Партыі БНФ **Аляксея Трубкіна**: ён прымацаваў да вулічнай дошкі абвестак налепку «Мы хочам новага!». У пастарунку склалі адміністрацыйны пратакол за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак.

**У Сьветлагорску**

Пракуратура Сьветлагорскага раёну (Гомельская вобласьць) 9 лютага распачала дысцыплінарную справу супраць участковага інспэктара мясцовага РУУС **Д.Рагалевіча**. Пракурорская праверка тычылася ператрусу кватэры сьветлагорскага дэмакратычнага актывіста Тэльмана Масьлюкова ў сьнежні. На імя Рагалевіча была выпісана санкцыя на ператрус, але, па словах Масьлюкова, кіраваў ператрусам намесьнік начальніка Сьветлагорскага РУУС маёр П.Зыкун. Масьлюкова падазравалі «ў захоўваньні зброі й наркотыкаў», але падчас ператрусу замест зброі сканфіскавалі ксэракс, кнігі «Лукашэнка. Палітычная біяграфія», «Беларусь: Сцэнары рэформаў», газэту «Рэгіянальныя навіны». Пракурор раёну, дарадца юстыцыі М.Прус, вырашыў, што пры гэтым быў парушаны Крымінальна-працэсуальны кодэкс.

**Ператрус у Магілёве**

У Магілёве ўначы на 12 лютага адбыўся ператрус у доме актывіста Партыі БНФ **Сержука Нягаціна**.

**У Гомелі**

10 лютага ў Гомелі затрыманы дэпутат гарадзкой рады, актывіст дэмакратычнага руху **Юры Глушакоў**. У яго сканфіскавалі 11 000 улётак з карыкатурамі на праграмы БТ.

**Перасьлед за веру**

З пастара ліквідаванай у жніўні 2005 г. Беларускай пратэстанцкай царквы **Эрнста Сабілы** судовыя выканаўцы спаганяюць судовы падатак — 127,5 тыс.руб. Працэс па ліквідацыі праз адсутнасьць юрыдычнага адрасу ініцыяваў Менгарвыканкам, але судовыя выдаткі спаганяюць з пастара. У выпадку нявыплаты яму пагражаюць вылічыць грошы зь ягонай пэнсіі і перапісаць маёмасьць (працэдура будзе каштаваць Сабілу яшчэ 10 б.в.). Сабіла, які за веру адседзеў 25 гадоў у савецкім канцлягеры, плаціць рашуча адмаўляецца.

**АШ**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# 21-гадовы палітвязень

Артур Фінькевіч — самы малады зь сёньняшніх беларускіх палітвязьняў. Але 21-гадовы хлопец з Заводзкага раёну сталіцы мае немалую палітычную біяграфію: пашуковік *Google* падае больш за 200 спасылак на артыкулы пра Фінькевіча ў Інтэрнэце.

Артур прыйшоў у «Малады фронт» перад прэзыдэнцкай кампаніяй 2001 г. Палітыка зьядала ільвіную долю Артуравага часу. «Калі малады хлопец прыходзіць у 16 гадоў у дэмарганізацыю, то палітыка і ёсьць амаль усё жыцьцё», — кажа пра Фінькевіча ягоны сябра Зьміцер Дашкевіч.

У вучэльні (ПТВ №38), што рыхтуе спэцыялістаў для Менскага мясакамбінату, Артур змагаўся за права мецьсвае палітычныя погляды. Паступіў у Інстытут парлямэнтарызму й прадпрымальніцтва. Але правучыўся толькі два гады, сышоўшы ўлетку 2005 г. Прычына — ня здаў своечасова сэсію, паколькі трапіў на чарговыя «суткі» пасьля акцыі каля польскай амбасады ў Менску.

Перад арыштам хлопец марыў паступіць у Віленскі ўнівэрсытэт на беларускую філялёгію.

Апроч палітыкі, ёсьць у Фінькевіча яшчэ адно захапленьне. Артур — заўзятар менскага футбольнага клюбу «Тарпэда-СКА».

Артур ці ня сама часта трапляў у хронікі затрыманьняў за апошнія годпаўтара. Павал Севярынец неяк зазначыў з гэтай нагоды: «Такі няўрымсьлівы хлопец, ірвецца на ўсякія акцыі». У «МФ» Фінькевіч нават кіраваў аддзелам па акцыях. «Хлопец даволі гарачы, рашучы. Знайшоў сваё поле дзейнасьці», — канстатуе З.Дашкевіч.

Для Дашкевіча Артур ня проста паплечнік, але і надзейны сябар, на падтрымку якога заўжды можна разьлічваць. «Вясёлы хлопец, баявы. У любы час мог узяцца за справу: я ўначы мог яму затэлефанаваць і пайсьці сьцягі вывешваць. Мы па некалькі ночаў запар па менскіх дахах сьцягі разьвешвалі», — адзначае Зьміцер.

Сябры Артура спадзяюцца, што крымінальная справа супраць яго завершыцца пасьля 19 сакавіка.

**Аркадзь Шанскі**

# 57 гадоў на сьметнік

Зьніклі 300 тысячаў экспанатаў музэю гісторыі Менску. ЖРЭУ Ленінскага раёну папросту выставіла скрыні з калекцыямі на вуліцу. ЖЭС №2 загадаў прыбраць іх з двара. Калекцыю папросту вывезьлі на сьметнік.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Тут, у будынку на вул.Кірыла і Мятода, 8, архіў захоўваўся доўгія гады. Пераезд у новае памяшканьне выявіўся фатальным.**

Археоляг Сяргей Тарасаў кажа: «Там была і кераміка, і калекцыя скураў ад XIII ст., і драўляныя вырабы, і вялікая шкляная калекцыя, і прылады працы».

Каштоўнасьць знаходкі мелі ня толькі для археолягаў: палеантолягі маглі вывучаць па іх гісторыю жывёльнага сьвету, біёлягі — расьліннага. Адказны за калекцыю, кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзелу археалёгіі сярэднявечнага пэрыяду Інстытуту гісторыі С.Тарасаў падаў заяву ў Ленінскае РУУС Менску.

Менская археалягічная калекцыя зьбіралася ад 1948 г., калі яе заснаваў археоляг Васіль Тарасенка. Да 2003 г. знаходкі, што мелі скласьці аснову будучага Музэю гісторыі Менску, перахоўваліся ў доме №8 па вул.Кірылы й Мятода. Як будынак паставілі на рамонт, калекцыя пераехала ў сутарэньні дома № 2 па вул.Рыбалкі, пра што была падпісаная дамова арэнды з ЖРЭУ Ленінскага раёну. На ўваходзе ў памяшканьне была прымацаваная шыльдачка з пазнакай уладальніка — Інстытуту гісторыі. Пры канцы 2005 г. ЖРЭУ папярэдзіла навукоўцаў, што дом можа быць пастаўлены на капітальны рамонт, аднак пагадзілася пакінуць калекцыю й рамантаваць сутарэньні паэтапна. Навукоўцы працягвалі аплачваць арэнду.

8 лютага С.Тарасаў і ягоны калега Пятро Русаў прыехалі, каб дадаць вынікі летніх раскопак, і пабачылі, што ў арандаваных імі памяшканьнях месяцца майстэрні. Як кажа С.Тарасаў, ЖРЭУ Ленінскага раёну, пачаўшы рамонт дому, папросту выставіла скрыні з калекцыямі на вуліцу. Праз некалькі дзён ЖЭС №2 загадаў прыбраць іх з двара. «Мінуўшчына сталіцы» папросту трапіла на сьметнік.

Аднавіць збор цяпер немагчыма. «Усё ляжала па скрынях, на кожным экспанаце было пазначана месца, час знаходкі, стаяў адмысловы шыфр. Цяпер па іх праехаўся бульдозэр», — канстатуе С.Тарасаў.

Навуковую страту можна хіба што ўявіць. Грашовую... «Гэта немагчыма ацаніць». Дык ці ня варта, у такім разе, пашукаць сьляды Менскай калекцыі на чорным рынку? С.Тарасаў такую вэрсію адмаўляе й лічыць, што, найхутчэй, мела месца звычайная нядбайнасьць: «Хаця, калі б там трапіўся чалавек абазнаны, то знайшоў бы прымяненьне гэтым знаходкам».

Вядома, звычайныя будаўнікі, якія займаліся рамонтам дому па вул.Рыбалкі, маглі проста выкінуць на сьметнік калекцыю. Што ім тыя чарапкі? Гэта, можна сказаць, характэрны для цяперашняе Беларусі выпадак.

Трэба адзначыць, што археоляг Тарасаў быў навуковым кіраўніком раскопак на Нямізе, дзе будуецца цяпер паркінг. Ён жа наглядаў за раскопкамі на месцы былога гарадзкога тэатру і драўлянага палацу Радзівілаў XVII—XVIII ст. на тым пляцы, дзе сёньня будуецца гатэль «Эўропа».

Археоляг Алег Трусаў кажа, што такія выпадкі — не ўнавіну: «Калі я быў яшчэ асьпірантам, такі ж завал быў на вул.Сурганава, дзе тады зьбіраліся знаходкі. Калі памірае ці выходзіць на пэнсію археоляг, ягоная калекцыя паціху расьцягваецца. Так, пасьля сьмерці Міхася Ткачова многія зь яго знаходак патрапілі ў зборы ягоных вучняў. У Зянона Пазьняка ў доме на вуліцы Гандлёвай вельмі шмат было, цэлы будынак быў заняты калекцыямі. Куды ўсё падзелася?»

Карані такога стаўленьня да археалягічнае спадчыны Трусаў бачыць у савецкай неахайнасьці: «Гэтая хвароба пачалася гадах у 60-х. Яны ня хочуць адразу апісваць знаходкі, а проста запакоўваюць у скрыні, дзе ўсё ляжыць гадамі. Апісваць кераміку цяжка. Таму археолягі імкнуцца правесьці новыя раскопкі, знайсьці штонебудзь цікавае, а гэтыя чарапкі пакідаюць».

**Адам Воршыч**

# Што ў нас памерзла?

Моцныя маразы нарабілі шкоды азіміне. Тыдзень у студзені тэмпэратура трымалася ніжэй за –20, а месцамі і –35 градусаў. Дый сьнег быў невысокі. У азімага рапсу найбольш адчувальная кропка росту, што знаходзіцца на глыбіні глебы у 2 см. Непашкоджаная, яна дае шанец расьліне з памерзлай надземнай часткай адрасьці вясною. Аднак сёлета, паводле Інстытуту земляробства і сэлекцыі НАН, праз маразы пагінула да 80% азімага рапсу пры агульнай пасяўной плошчы 100 тыс.га. Пагінула амаль уся шматгадовая белая канюшына, якая, як і рапс, вытрымлівае толькі мінус 14 градусаў.

Што да збожжавых, то паводле дырэктара Інстытуту земляробства і сэлекцыі акадэміка Міхаіла Кадырава, імавернасьць гібелі 20—25% азіміны істотная. Звычайна непазьбежныя страты складаюць 3—5% ад пасеянай плошчы.

Паводле М.Кадырава, Мінсельгасхарчу ўжо атрымала рэкамэндацыі спэцыялістаў наконт таго, што, дзе і чым перасяваць.

**Сямён Печанко**

**Парада садаводам**

**У лютым стваλы садовых дрэваў найбольш церпяць ад марозу. Асабліва заходняя іх частка — нагрэтая сонцам у полудзень, яна хутка ахалоджваецца ў выніку перападу тэмпэратуры ўвечары. У такіх месцах утвараюцца так званыя маразабойныя расколіны, якія ў вясновa-летні пэрыяд робяцца крыніцамі захворваньняў. Каб гэтага пазьбегнуць, ствол дрэва варта ўжо ўзімку пафарбаваць белай фарбай з дадаткам меднага купарвасу. І робіцца гэта ў лютым, калі ёсьць практычная карысьць. Таксама ў гэты час можна рабіць абрэзку ваўчковых парасткаў.**

# Валюта — у вольным продажы

Ад 10 лютага ў абменьніках валюту можна набываць, ня маючы пашпарта. Дакумэнт прыйдзецца выцягваць з кішэні, калі купляеш даляраў ці эўра на суму, большую за 2 тыс. базавых велічыняў (сёньня — 58 млн руб.).

Прэзыдэнцкі дэкрэт №2 адмяніў патрабаваньне аб абавязковай рэгістрацыі пашпартных зьвестак фізычных асобаў, што дзейнічала з 1997 г., калі існавала некалькі курсаў беларускага рубля, што сур'ёзна адрозьніваліся адзін ад аднаго. Валютчыкі тады скупалі ўсе даляры й дойчмаркі ды перапрадавалі іх людзям па больш высокім курсе.

**Зьміцер Дрыгайла**

## ПІШУЦЬ ЧЫТАЧЫ




ЮРЫ КАЛБАСІЧ

### Люблю Беларусь

Акцыю да Дня закаханых правялі актывісты грамадзкіх рухаў у Глыбокім **(на фота)**. На рынку зранку было раздадзена 300 значкаў зь бел-чырвона-белай выявай сэрца, якое любіць Беларусь. Да акцыі далучыліся і прадпрымальнікі, што гандлявалі ў гэты час на рынку — іх пакупнікі маглі бясплатна атрымаць сувэнірны значак да Дня сьвятога Валянціна.

**Прысутны, Глыбокае**

### Куры — за кратамі

Лунінецкая санстанцыя вырашыла засьцерагчы насельніцтва ад птушынага грыпу. Эпідэміёлягі абяцаюць выпісваць штрафы тым, хто дапусьціць зносіны свойскіх птушак зь дзікімі. Свае куры, гусі, качкі лунінчанам да асаблівага распараджэньня трэба трымаць пад наглядам у вальерах і пунях.

### Фальсыфікацыя беларускага масла

Малочны завод у Лунінцы — адно зь нямногіх прадпрыемстваў гораду, што мае прыбытак. Напрыклад, казэін экспартуецца ў Нямеччыну, Францыю, нават ЗША. Галоўны клопат кіраўніцтва — сыравіна: малака з гаспадарак раёну не хапае, а паміж Лунінцам і Жыткавічамі абласныя начальнікі ўсталявалі «мытны бар'ер». Дырэктар заводу Сяргей Карпец наракае на тое, што расейскія дзялкі завалілі ўвесь Краснадарскі край маслам, запакаваным на манэр лунінецкага. «У Беларусі мы абаронены ад такога свавольства, а ў Расеі — не», — паскардзіўся сп. Карпец журналістам.

**ВР, Лунінец**

# Форум tut.by пра фальсыфікацыю выбараў

Адзін з форумаў парталу tut.by прысьвечаны фальсыфікацыям выбараў. Пачалося ўсё з паведамленьня аднаго з наведнікаў, які разьмясьціў меркаваны мэханізм фальшаваньня выбараў. Паводле яго, фальшаваньне адбываецца на ўзроўнях старшыняў камісій і ў раённых адміністрацыях, і зафіксаваць гэтыя парушэньні дакумэнтальна цяжка — пакуль апазыцыя ня вернецца ва ўладу. Тыя факты, што маюцца ў праваабаронцаў, сьведчаць хутчэй пра перагібы на месцах, дзе старшыні камісіяў праявілі празьмерную ініцыятыву.

Цікава, што абсалютная большасьць удзельнікаў форуму лічыць, што выбары ў Беларусі фальшуюцца.

Як супрацьстаяць фальшаваньню выбараў? Ёсьць такое меркаваньне: «Законным шляхам нікуды ня трапіш, ніякі наш суд не паставіць пад сумнеў законнасьць абраньня Лукашэнкі. Але важна тое, што робіцца ў галовах грамадзянаў».

**СП**

# Беларуская рок-музыка выдадзеная на МР3




Праект запачаткаваў лэйбл «Aist Music» — адгалінаваньне кампаніі «Vigma». Ужо зьявіліся па два дыскі пад кідкімі вокладкамі з усімі альбомамі і кліпамі гуртоў «Нэўра дзюбэль» і «Ляпіс Трубяцкой». На чарзе — «Песьняры».

Кіраўнік «Aist Music» Уладзімер Кубышкін піша песьні для поп-праектаў «Черника», «Топлес» і А.Саладухі і паралельна выдае альбомы «альтэрнатыўнікаў». За тры гады выйшлі альбомы гуртоў «Куклы», «Нэўра дзюбэль», «Палац». Кубышкін выдае тое, чаго, на яго думку, патрабуе беларускі музычны рынак. Сёньня на ім відавочны брак MP3-складанак — зручнага фармату, бо на адным дыску можна зьмясьціць зь дзясятак альбомаў, некалькі відэакліпаў і з паўсотні фатаздымкаў.

Цяпер вядуцца перамовы наконт працягу рок-калекцыі складанкамі ад «N.R.M.» і «Уліса». «У сваім выбары мы арыентаваліся на гурты, якія маюць свайго слухача, зрабілі ўнёсак у айчынную музычную культуру і маюць прывабны і рэнтабэльны прадукт», — кажа У.Кубышкін.

Дыскі з чатырнаццацьцю альбомамі «Нэўра дзюбэля» і шаснаццацьцю «Ляпісаў» — цалкам легальны прадукт. Аляксандар Кулінковіч сам трансьлітараваў назвы сваіх песьняў з кірыліцы ў лацініцу, каб ва ўсіх прайгравальніках яны чыталіся. Усе аўтарскія адлічэньні «Aist Music» сплачвае.

У.Кубышкін ня лічыць, што продаж MP3-калекцыі можа адбіцца на рэалізацыі поўнафарматных альбомаў — даражэйшых, але ў якасным CD-фармаце: «Усе гэтыя альбомы паасобку ўжо былі прададзены тысячнымі накладамі, ад выданьня іх у іншым фармаце выканаўцы набываюць дадатковыя грошы і піяр».

**Сяргей Будкін**

## «Тузін Гітоў»

**Вынікі 10-га туру (27 студзеня — 9 лютага)**

**www.music.fromby.net**

1. Кася Камоцкая. «Шостае падарожжа» — 391
2. «IQ−48». «Сьвятло ў цемры» — 377
3. «Tav.Mauzer». «Брудная вада» — 292
4. «Сьцяна». «Можна быць» — 265
5. «Глюкі». «Ападкі» — 256
6. «Imprudence». «Малюся багам» — 240
7. «Zygimont VAZA». «ContraБанда» — 236
8. «Палац». «Праваджала маці сына» — 234
9. «З.Ь.М.Я.Я». «Чукча» — 233
10. «Usplesk». «Мара» — 231
11. «Drum Ecstasy». «Football» — 228
12. «Паўднёвы вецер». «Там» — 93

**Праслухаць песьні можна ў Інтэрнэце на сайце «Тузіну гітоў» і ў радыёэтэры штопятніцы на хвалях радыё «Менск» (92,4 FM) а 23.00 у праграме «Тузін гітоў з Алегам Хаменкам»**




+ 375 29 6685821 koziel2005@gmail.com

# Аповед пра насатых валадароў

У Палацы мастацтваў ідзе выстава Рыгора Таболіча.

Я добра памятаю гэтую карціну па рэпрадукцыі. Але ня ведаў, ці гэта алейны жывапіс, ці графіка. Памятаю толькі яскравы вобраз палешука, які ўпэўнена крочыць усьцяж чаратоў, у якіх стаіць бусел. Няхітры, але трапны іранічны аповед пра жыхароў багністай бацькаўшчыны. Карціна «Гаспадар», напісаная маладым гадаванцам тэатральна-мастацкага інстытуту Рыгорам Таболічам, стала хрэстаматыйнаю. І вось яна, перада мною. Шмат меншага фармату, чым я чакаў. Але адчулася нешта падзабытае, свойскае... З водарам аеру, мяты й твані.

Тады, напачатку 1980-х, Рыгор Таболіч увайшоў у нашае мастацтва жывапісным трыптыхам, прысьвечаным Максіму Багдановічу. І наступныя палотны трывала асацыююцца з нацыянальна-рамантычнаю плыняю. Дзіўныя кампазыцыйныя ці ўласна жывапісныя адкрыцьці Таболіча («Стары калодзеж» ці нізка «Колеры») губляюцца.

У экспазыцыі «Вытокаў» — больш за 100 жывапісных працаў у самых розных жанрах, тэхніках і... стылях. Знайшлося месца й сьціплай інсталяцыі. Гераічнае мінулае Беларусі, любоў да землякоў і сваякоў перамяшаныя на выставе з натурмортамі, пэйзажамі, абстракцыямі. Таболіч — гаспадар усіх формаў, фарбаў і рознага кшталту цытатаў ад Пікаса і Шагала да Савіцкага й Марачкіна.

Выстава адкрываецца новым палатном «Купала і Колас у Магілёве». Народныя песьняры сярод прыхільнікаў на ганку Магілёўскага тэатру. Традыцыйны сюжэт у традыцыйным выкананьні. Карціна магла б упрыгожыць фае таго самага тэатру.

Рыгор Таболіч — стваральнік і гаспадар першае прыватнае галерэі ў Магілёве, дырэктарам якое — ягоная жонка, мастачка Марыя Таболіч. Адкрыцьцё галерэі ў 2000 г. у горадзе, дзе ўжо ёсьць і музэй Бялыніцкага-Бірулі, і галерэя імя Масьленікава, стала вялікай падзеяй.

Мастак створыць яшчэ багата розных рэчаў, што маюць шанец разьлящецца па сьвеце, услаўляючы Беларусь. Але хіба нішто не запомніцца гэтак трывала, як ягоны «Гаспадар», аповед пра двух насатых валадароў Палесься: палешука й бусла. Аповед пра тое, што творцу было насамрэч блізка й зразумела. Бяз штучнага пафасу й прэтэнзіяў ахапіць неахопнае...

**Сяргей Харэўскі**



# Каб гарантавана чытаць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.**
Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84
e-mail: dastauka@tut.by
паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям’ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

Счет получателя: **3015 212 000 012** Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | Пеня | |
| | | Всего | |

Кассир
Плательщик

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

Счет получателя: **3015 212 000 012** Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | Пеня | |
| | | Всего | |

**КВИТАНЦИЯ**

Кассир М.П.
Плательщик

лицензия № 02330/0056637 от 27.03.2004 УП «УСЛУГА» Зак. 3504 тир 50 000

## На які рахунак пералічваць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць.
На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

## Ці трэба паўторна дасылаць адрасы ў Рэдакцыю?

Не, аднойчы даслаўшы, больш ня трэба (калі вы рэгулярна атрымліваеце газэту). Тады досыць не забывацца рэгулярна пералічаць ахвяраваньні.

## Хто дасылаў ахвяраваньні, але не паведаміў адрасу

Прабачце, што газэта прыйшла вам запозьнена. Рэч у тым, што вы пераказалі ахвяраваньне, але не паведамілі Рэдакцыі адрасу адразу. Квіток ахвяраваньня трапляе да нас праз 5—10, а часам і болей дзён.

# Шукаем чытачоў!!!

Калі хто ведае наступных чытачоў «НН», просьба падказаць ім скантактавацца з газэтай.

**Чытач з Зарніцы Спасава,** дашліце свой дакладны адрас і прозьвішча.
**Леанід Мікалаевіч Н.** з вул.Калініна, удакладніце свой адрас.

**Калі вы не атрымалі газэты**

да панядзелка, а ў Менску — да суботы, абавязкова тэлефануйце ў Рэдакцыю. Пытацца Аляксандру.

Тэлефоны:

(017) 284–73–29,
(029) 613–32–32,
(029) 707–73–29

dastauka@tut.by

## Правілы падачы адрасоў:

Абавязкова падавайце індэкс, бо зь індэксам газэта дойдзе хутчэй.

Калі вы жывяце ў вёсцы ці ў мястэчку, пазначайце раён і вобласьць.

Ня трэба дасылаць квіток, пакіньце яго ў сябе, гэта вашае пацьверджаньне таго, што вы зрабілі ахвяраваньне.

Разборліва падавайце свае зьвесткі.

Атрымліваць газэту можна зь любога нумару, толькі паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас.

Газэта «Наша Ніва»

запрашае прыватных прадпрымальнікаў спрыяць у распаўсюдзе газэты ў Менску і рэгіёнах.

**Вельмі просім чытачоў, якія ад Новага году чытаюць «НН» у Інтэрнэце, а не на паперы, таксама дасылаць прыватныя ахвяраваньні з разьліку 6000 на месяц з пазнакай: «за Інтэрнэт». Бяз збору грошай газэце не захаваць якасьці.**

## Дзякуй за ахвяраваньні!

Шчыра дзякуем Глебу С. з Салігорску. Дзякуем Уладзіміру Ш. зь Менску, які ахвяраваў на выданьне газэты 100 тысяч рублёў.
Дзякуем таксама С.Д. з Талачынскага раёну.
Арцёму Г. зь Ліды.
Міхаілу С., Уладзіміру І., А.Г., А.М., Ж.К., Макару Л., В.П., Уладзіміру Ш., І.Г. зь Менску.
Уладзіміру К., Ж.К. зь Менскага раёну.
М.Л. са Слуцку.
Антону Т., Аляксандру Ш. з Жодзіна.
Марыі Б. з Гомелю.
Зьмітру Я. з Івацэвіцкага раёну.
Анатолю К. з Салігорскага раёну.
Уладзіміру К. зь Любанскага р-ну.
З.Д. з Бабруйску.
Ю.Ю. з Маладэчна.
Мікалаю Б. зь Сьветлагорскага раёну.
Аляксандру С., Аляксандру А. з Горадні.
Уладзіміру А. з Вушацкага раёну.
Ю.Л., І.Л. зь Берасьця.
Дз.С. з Магілёва.



**Гэтак выглядае ўсярэдзіне адзін з электраветракоў, што жывяць энэргіяй вёску Дружная на Мядзельшчыне.**

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Жыцьцё пасьля нафты

Золата будучыні будзе блакітным, зялёным, празрыстым — якім заўгодна, але ня чорным. З Бэрліна піша **Алесь Кудрыцкі.**

*Так, сябры мае, я думаю, што ваду калі-небудзь будуць выкарыстоўваць як паліва, што вадарод і кісларод, якія ўваходзяць у яе склад, будуць выкарыстаны разам ці асобна і зьявяцца сапраўды невычарпальнай крыніцай сьвятла і цяпла. Вада — вугаль будучыні.*

***Жуль Вэрн. Таямнічая выспа. 1874.***

Нафта — кроў, якая цячэ па жылах сусьвету. Нават у Нямеччыне, зь яе арміяй ветракоў, сонечнымі батарэямі на дахах, бяз нафты ня рухаецца нічога. Толькі 35 тыс. аўтамабіляў у краіне працуюць на газе, а вытворчасьць біяпаліва не пакрывае і 2% патрэбаў у бэнзіне ды салярцы. У сярэднім па Эўропе вартыя жалю 6% энэргіі выпрацоўваюцца ўзнаўляльнымі крыніцамі.

Аднак сытуацыя мусіць зьмяніцца — надта дарагім задавальненьнем зрабілася нафта. Швэцыя пастанавіла да 2020 г. пазбавіцца ад нафтавай залежнасьці. Ужо цяпер электрычнасьць у краіне выпрацоўваецца выключна атамнымі і гідраэлектрастанцыямі. Ірляндыя ў 2050 г. перавядзе ўвесь водны ды аўтамабільны транспарт на вадарод. У падобным кірунку рухаецца Індыя — у кастрычніку ў горадзе Фарыдабад адчынілі першую вадародную заправачную станцыю. Але наколькі рэальна пабудова жыцьця бяз нафты?

## Дызэль з-пад дранікаў

У Бэрліне ўжо ёсьць таксоўшчыкі, якія запраўляюць свае аўто... адпрацаваным алеем, які яны набываюць у забягалаўках хуткага харчаваньня. Брунатная жыжка фільтруецца ў хатніх умовах і заліваецца ў бэнзабак дызэльнага аўтамабіля. Пах з выхлапной трубы нагадвае водар смажанай бульбы. Выгада зразумелая: уладальнікам рэстарацыяў ня трэба плаціць за перапрацоўку адкідаў, аўтааматары атрымліваюць паліва амаль задарма. Ідэя ўжо прыцягнула камэрсантаў: нямецкая фірма *Vital Fettrecycling* штогод выпрабляе 60 млн л дызэльнага паліва з рэстарацыйнага алею. Праблема ў тым,

**Працяг на старонцы 20.**

# Жыцьцё пасьля нафты

Працяг са старонкі 21.

што ў багатай Нямеччыне адкідаў харчовага алею ня хопіць, каб наталіць смагу ўсіх дызэльных рухавікоў.

## Разгул біятэхналёгіі

Усё больш навукоўцаў заклікаюць зазірнуць праблеме ў корань — у літаральным сэнсе. Паліва можна вырошчваць на палях. Чым дрэнна — запраўляць аўто ў найбліжэйшым супэрмаркеце ды ўдвая таньней, чым на запраўцы? Нямецкія фірмы, якія пераабсталёўваюць рухавікі на спажываньне звычайнага расьліннага алею, маюць стабільны прыбытак. Кампанія *Unicar* з Аахэну атрымлівае 50 замоваў у дзень. Не адпужвае нават цана мадэрнізацыі — пераабсталяваць рухавік каштуе больш за 2000 эўра.

Фантазія навукоўцаў ня мае межаў: паліва выпрабляюць з рапсу, з пшаніцы, з цукровага трысьнягу, нават з апілак. Біятэхнолягі з канадзкай фірмы *Iogen* экспэрымэнтуюць з саломай. Нафтавы канцэрн *Shell*, які ўжо набыў пакет акцыяў гэтай кампаніі, дадае ў свой новы сорт салряркі *V-Power* сынтэтычнае паліва, выробленае з прыроднага газу. Карэйская фірма *EOS System* увогуле зьбіраецца наладзіць вытворчасьць дызэлю з плястыкаў з-пад ёгурту. Пералік можна працягваць вельмі доўга: навукоўцы налічваюць каля 270 распрацаваных спосабаў выробляць паліва без выкарыстаньня нафты. Многія аўтамабільныя канцэрны, у тым ліку швэдз-кі «Сааб» і амэрыканскі «Форд» ужо запусьцілі ў сэрыю аўтамабілі, чый рухавік здольны пэратраўляць самыя розныя віды паліва.

## Праблемы біядызэлю

Урад Мэркель мае пляны абавязаць паліўныя канцэрны дадаваць у свае прадукты біяпаліва. Да 2010 г. 6% паліва, выробленага ў ЭЗ, будзе вырошчвацца на палях, што адчыняе новыя пэрспэктывы для фэрмэраў.

Праўда, і тут добрая ідэя натыкаецца на абмежаваньні. «Вырошчваць» паліва на эўрапейскіх палях задорага, дый плошчаў для гэтага замала — нямецкага рапсу пры найлепшым раскладзе хопіць, каб пакрыць 3,7% патрэбаў.

Падобная сытуацыя і ў Беларусі, дзе апошнімі гадамі даволі актыўна вядуцца распрацоўкі ў вырабе біядызэля з рапсу. Трактар «Беларусь», напрыклад, нармалёва працуе на сумесі рапсавага алею ды салряркі ў прапорцыі 50/50. Аднак мы, найхутчэй, зможам экспартаваць толькі ноў-хаў, бо рапсу, які вырошчваецца на беларускіх палетках, ня хопіць, каб пакрыць уласныя патрэбы ў паліве, ня кажучы пра продаж яго за мяжу. На сьвеце ёсьць краіны, дзе і плошчаў хапае, і клімат спрыяльны, і працоўныя рукі няшмат каштуюць. Гэтак, Бразылія ўжо праз пяць год хоча выробляць 80% энэргіі з этанолу, які атрымаюць з цукровага трысьнягу. Вось толькі ці не адбудзецца гэта за кошт барбарскага зьнішчэньня трапічных лясоў, каб вызваліць месца пад плянтацыі? Акрамя гэтага, навукоўцы падлічылі, што шкода для навакольнага асяродзьдзя ад спальваньня біядызэлю ненашмат ніжэйшая ад той, якую чыняць нафтапрадукты.

Надзея палягае ў новым пакаленьні біядызэлю. Папершае, яго будуць выробляць ня толькі з пладоў накшталт семені сланечніка ці бульбы, але з усёй расьліны, нават са сьцяблінь ды каранёў. Па-другое, біятэхнолягі змогуць мадыфікаваць хімічны склад паліва ў адпаведнасьці з патрэбамі паліўнай індустрыі. Нямецкая фірма *Choren* ужо выробляе такое паліва пад назвай «сонечны дызэль», якое пасьпяхова прайшло выпрабаваньні ў кампаніях «Мэрсэдэс» ды «Фольксваген». Паліва такога кшталту патэнцыйна можа пакрыць 20—25% патрэбаў рынку.

## Вадкі вугаль

Ня выключана, што будзе ўзгаданая старая тэхналёгіяператварэньня каменнага вугалю ў нафту. Яна вядомая чалавецтву ўжо каля 100 год. Нізкія цэны на нафту прывялі гэтую індустрыю ў заняпад. Аднак танная нафта адыходзіць у нябыт — і тэхналёгія звадкаваньня вугалю вяртаецца. У 2007 г. у Кітаі будзе адчынены першы сучасны завод па вырабе нафты з вугалю. Пэнтагон мае пляны стварыць сыстэму з 30 заводаў, якія будуць забясьпечваць амэрыканскую армію палівам, сынтэзаваным з вугалю, што пазбавіць іх ад залежнасьці ад прыроднай нафты. Аднак выраб нафты з вугалю можа прывесьці да сапраўднай прыроднай катастрофы. Пры гэтым працэсе выдзяляецца столькі вуглякіслага газу, што яго давядзецца захоўваць пад зямлёй, інакш парнікавы эфэкт паскорыцца ў некалькі разоў.

## Акіян паліва

Яшчэ адной надзеяй можа быць прыродны газ. Хоць аўтамабілі, пераабсталяваныя пад выкарыстаньне газу ў якасьці паліва, і каштуюць даражэй за звычайныя, аднак газ каштуе таньней за нафтапрадукты, асабліва ў тых краінах, дзе, як у Нямеччыне, дзяржава выдзяляе на яго датацыі. Запасаў газу хопіць на большы час, чым запасаў нафты, дый навакольле ён забруджвае менш за нафтапрадукты. Карацей, газ — неблагая альтэрнатыва на час пераходнага пэрыяду да эры вадароду.

Вадарод складае два атамы з трох у малекуле вады. Намёк зразумелы: сусьветныя акіяны — агромністы рэзэрвуар энэргіі, прычым экалягічна чыстай. Пры вырабе вадароду з вады адкідам зьяўляецца кісларод. Пры вырабе электраэнэргіі з вадароду адбываецца ягоная рэакцыя з кіслародам, і адкідам зьяўляецца дыстыляваная вада. Малая доля вадароду пры выкарыстаньні не пасьпявае зрэагаваць і можа нават адляцець у космас, бо гэта вельмі лёгкі газ, які зямная гравітацыя ўтрымаць не заў-

**Адзінае ў Беларусі**
**прадпрыемства, што распрацоўвае тэхналёгію вырабу паліва з рапсавага алею — «Уніхімпрам БДУ». Летась у Навагельні (Дзятлаўшчына) распачаў працу экспэрымэнтальны міні-завод па вытворчасьці такога паліва. У год ён можа выробляць да 5 тонаў. Беларусі ж патрэбна 1,7 млн тонаў дызпаліва штогод. Паводле разьлікаў навукоўцаў, калі засеяць рапсам усе 1,5 млн гектараў прыгодных для гэтага ворных земляў краіны, мы атрымаем толькі 1,5 млн тонаў біяпаліва. Для яго вытворчасьці трэба 10 магутных заводаў. Праўда, біяпаліва будзе каштаваць на 20—40% больш за звычайнае, а банальны неўраджай рапсу можа справакаваць паліўны крызіс.**




**Надпіс на сьцяне: «Далоў машыны!» (Нямеччына).**

жды ў стане. Таму, у прынцыпе, вадарод таксама калінебудзь можа вычарпацца, але гэта настолькі аддаленая будучыня, што навукоўцы амаль не бяруць яе ў разьлік.

Што рабіць з вадародам? Ёсьць дзьве магчымасьці. Канцэрн «БМВ», бадай, адзіны, які абраў самы цяжкі шлях — непасрэднае выкарыстаньне вадароду ў якасьці паліва для рухавіка. Гэта дазволіць стварыць сапраўды магутны аўтамабіль, аднак зьвязана зь немалымі тэхнічнымі праблемамі. Большасьць жа аўтавытворцаў сьвету зьбіраюцца пайсьці іншым шляхам. Вадарод, запраўлены ў аўтамабіль, будзе рэагаваць з кіслародам, і энэргія, якая вызваляецца падчас рэакцыі, будзе прыводзіць у дзеяньне электрычны рухавік. Магутнасьць такога аўтамабіля ня дужа вялікая, аднак гэтая тэхналёгія больш распрацаваная і бясьпечная.

Праблема ў тым, што для выдзяленьня вадароду з вады таксама патрэбная энэргія. Фактычна, вадарод не крыніца энэргіі, а проста зручны і экалягічна чысты яе носьбіт. Таму выпрацоўваць вадарод з дапамогай нафты ці вугалю бессэнсоўна. А з дапамогай газу ці атамнай энэргіі — цалкам рэальна. Але найлепш — атрымліваць вадарод з дапамогай узнаўляльных крыніцаў энэргіі. Так, вадароднае аўто ў Беларусі можа езьдзіць на вадародзе, выробленым з дапамогай ветракоў на ўзьбярэжжы Нарвэгіі ці на палетках сонечных батарэяў у Гішпаніі. Найбольш пашанцавала ў гэтым сэнсе Ісьляндыі — краіна ў літаральным сэнсе жыве на вулкане і выкарыстоўвае цяпло зямлі для вырабу электрычнасьці, якую, у тым ліку, пускае і на прадукаваньне вадароду. Таму гэтая дзяржва-выспа і зьўляецца сусьветным лідэрам па стварэньні «вадароднай гаспадаркі».

Пакуль што вадарод абыходзіцца дорага. Колькасьць вадародных заправачных станцыяў у сьвеце ня большая за 100, а аўтобус з вадародным рухавіком каштуе больш за мільён эўра. Тэхналёгія застаецца занадта дарагой, а нафта — занадта таннай, таму ў 2020 г. вадарод заваюе ў самым лепшым выпадку 5% энэргетычнага рынку.

**Патрэба ЭЗ у дызэльным біяпаліве**

| Год | Патрэба, млн тон | Доля ў сукупным спажываньні дызпаліва (%) |
|---|---|---|
| 2005 | 4,25 | 2,0 |
| 2006 | 5,95 | 2,75 |
| 2007 | 7,75 | 3,5 |
| 2008 | 9,55 | 4,25 |
| 2009 | 11,5 | 5,0 |
| 2010 | 13,45 | 5,75 |

Паводле «ABw»

## Простая эканомія

Па старой завядзёнцы, чалавецтва заглядае далёка, не заўважаючы рашэньняў, якія ляжаць пад носам. Энэргазьберагальныя тэхналёгіі маюць агромністы патэнцыял. Дамы можна будаваць зь лепшай цеплаізаляцыяй, а аўтамабілі рабіць больш эканомнымі. Калі б кожны аўтамабіль у Нямеччыне спажываў на 100 км шляху ўсяго толькі на 1 літар паліва меней, спажываньне бэнзіну ды саляркі зьменшылася б на 12,5%. Ніякі біядызэль дагэтуль такой эканоміі ня ў стане забясьпечыць. Калі ж ашчадны рухавік зрабіць яшчэ і гібрыдным, спалучыўшы яго з электраматорам, эканомія будзе яшчэ большая. Прычым зараджаецца ён у тым ліку і ў час руху, у першую чаргу пры разгоне і тармажэньні аўтамабіля. Гібрыдныя аўто накшталт «Таёты Прыюс» ужо некалькі год як вырабляюцца сэрыйна. У 2010 г. у ЗША будзе прадавацца каля мільёна такіх «аўтамабільных мутантаў».

## Рай ці пекла?

Энэргетычная крыза, якая ўсё больш вымалёўваецца на даляглядзе, робіць нечакана рэальнымі самыя фантастычныя праекты. Расейская карпарацыя «Энэргія» заявіла, што да 2015 г. зьбіраецца пабудаваць сталую станцыю на Месяцы. Сваіх мэтаў яна не хавае: ужо ў 2020 г. на Месяцы мусіць пачацца здабыча гелія-3, паліва, якое можа вырашыць усе энэргетычныя праблемы зямлі на бліжэйшыя стагодзьдзі. Гелій-3 — рэдкі ізатоп. У нетрах Зямлі яго амаль няма, а вось на Месяцы, куды гелій-3 заносіў сонечны вецер, яго запасы ацэньваюцца ў 500 млн тонаў. Гэтага цалкам хопіць, каб забясьпечыць чалавецтва палівам на 1000 год. Да таго ж, гелій-3 вельмі стабільны, таму небясьпека выбуху пры яго выкарыстаньні практычна адсутнічае. Адна тона ізатопу, калі ацэньваць яе ў нафтавым эквіваленце, каштуе каля 4 млрд даляраў. Каб забясьпечыць плянэту энэргіяй на год, дастаткова 2—3 палётаў грузавых касьмічных караблёў, якія даставяць гелій-3 зь Месяца. Ня дзіва, што амэрыканскі ўрад ужо размаразіў сваю праграму палётаў на Месяц. База НАСА на спадарожніку Зямлі будзе створаная ўжо ў 2018 г. Галоўная мэта — здабыча гелію-3.

Што далей? Ваўчэрная прыватызацыя гелійных радовішчаў? Канцэрн «Гелійпром», які перакрывае пастаўкі гелія-3 пасьля Аранжавай рэвалюцыі ў Кітаі? Касьмічныя піраты, якія перахопліваюць амэрыканскія «шатлы» з запасам «зорнага» паліва? Вайна за залежы гелію ў раёне кратэра Ціха? Ці, можа быць, мір бязь беднасьці, холаду ды голаду? У апошнюю альтэрнатыву чамусьці верыцца зь цяжкасьцю, нягледзячы на тое, што тэхналёгія можа, у прынцыпе, зрабіць гэтую мэту дасягальнай.



# Скандал на БТ

У сваіх палкіх пачуцьцях да Захаду, і асабліва да Штатаў, нашыя праваслаўныя атэісты гатовыя выглядаць большымі магамэтанамі, чым як аятолы. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Скандал вакол карыкатураў з выяваю Мухамада пракамэнтаваў і афіцыйны беларускі лідэр. Маўляў, іхні передрук сьведчыць, што камусьці патрэбна эскаляцыя напружанасьці між цывілізацыямі. Кантэкст такі, што няма сумневу — гэта патрэбна камусьці на Захадзе.

Ну а прапаганда — тая без эківокаў даводзіць: карыкатурную вайну справакаваў Вашыгтон. Каб падрыхтаваць глебу для сапраўднай вайны супраць Ірану.

То бок, алоўкі дацкім мастакам тачыў нейкі ўвішны ЦРУшнік. А потым амэрыканскія агенты яшчэ й падбілі мноства рэдактараў з розных краінаў растыражаваць тую брыдоту. І пайшло-паехала... Усё элемэнтарна, Уотсан!

Кансьпіралёгія, або тэорыя змовы, стала звыклым інструмэнтам беларускай прапаганды. Гэта ўнівэрсальны шаблён, магутны сродак маніпуляцыі масавай сьвядомасьцю. Апазыцыянэры — наймiты імпэрыялізму, каляровыя рэвалюцыі — сцэнар ЦРУ. У пасольствах спрэс шпегі, а па пэрымэтры дзяржаўнай мяжы вераломныя суседзі дрэсіруюць баевікоў.

І ўжо ня трэба апраўдвацца за непавагу да дэмакратыі і правоў чалавека. У варожым атачэньні інтэлігенцкіх антымоніяў не разводзяць!

Маса ж, на жаль, лёгка паддаецца спакусе простых тлумачэньняў. Па-першае, адбіваецца цяжкая спадчына савецкай прапаганды. Па-другое, мільёны суайчыньнікаў увогуле не атрымліваюць незалежнай інфармацыі.

Пабыўшы пару дзён у вёсцы без Інтэрнэту, пачуваесься дзікуном. Дык што казаць пра тых, хто не адрозьнівае Інтэрнэт ад інтэрнату?

Усе пачулі нядаўна праз тэлевізію, што літоўцы наладзілі агнявую падрыхтоўку рэвалюцыйных баевікоў. І мо два адсоткі даведаліся празь незалежныя сайты, што насамрэч гаворка ідзе пра электронны трэнажор у вайсковай частцы, на якім далі «пастраляць» нават беларускім дыпляматам.

Два адсоткі пасьмяяліся. Астатні
сацыёлягаў прафэсара Манаева п
Літвы, Польшчы ды Латвіі да лік
краінаў. Сон розуму спараджае п

Зрэшты, у палітыцы насамрэч ё
патаемныя спружыны. Што да
«карыкатурнай вайны», то за ей
эскаляцыяй экспэрты схільныя
найперш інтарэсы Ірану, Сыры
палестынскага «Хамасу», да які
міжнароднай супольнасьці ёсьц
сур'ёзныя пытаньні. «Маляванк
адцягвае ўвагу ад іншых рэчаў –
напрыклад, атамных амбіцыяў
апраўдвае іх.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Беларускія тэнісісты выйшлі ў чвэрцьфінал Кубку Дэвіса. Выйграць у чэмпіёнаў-гішпанцаў было проста прыемна. Стамлялі хіба передвыбарны палітычны піяр, якога было зь верхам, ды форма, нібы пашытая са сьцягоў.**
**На фота: Максім Мірны падсілкоўваецца ў часе матчу. Зьлева стаіць яго бацька.**

я ўражваюць
прылічэньнем
у варожых
ачвараў!
эсьць
інай
бачыць
і ды
х у
ць сапраўды
ы» скандал
—
Тэгерану. Ці

Дарэчы, пра гэтыя імаверныя матывы калізіі шмат гавораць нават расейскія мэдыі — пры ўсіх гульнях Масквы з ісламскім сьветам.

Але менскія кансьпіролягі ўмеюць думаць толькі ў адзін бок. «Вораг майго ворага — мой сябар» — вось іхны прынцып. Пры патрэбе яны гатовыя выглядаць большымі магамэтанамі, чым як аятолы.

**Кансьпіралёгія** (ад анг. *conspiracy*)— **сакрэтнасьць, змова. Сыстэма поглядаў, плынь у гісторыі ды паліталёгіі, што тлумачыць тыя або іншыя зьявы як вынік змоваў патаемных сілаў (напрыклад патаемных таварыстваў, спэцслужбаў, іншаплянэтнікаў, акультных зьяваў).**



# Уставай, народ, за мэтал-рок!



Да чаго пэрформансы «За Беларусь» давялі Ўладзю Б. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

«Дарагія мама, тата. Калі вы прачытаеце гэты ліст, мяне ня будзе ў жывых. СМІ ўжо паведамяць, што ў горадзе здарылася няшчасьце — у паветра вылецеў абласны Палац культуры падчас канцэрту «За Беларусь!». Разам з публікай выбух прыхапіў на той сьвет увесь сонм беларускай эстрады.

Хутчэй, стрэлачнікам зробяць апазыцыю. «DJ Pazniak адгуляў канцэрт», — напіша Саўбелка. Або павесяць сабакаў на дырэктара ПК, які не скідаў з даху сьнег. Усё гэта лухта. Палац разам з сабою ўзарваў ваш сын!

Мяркую, што здагадваецеся аб матывах майго ўчынку. Я — фанат black-heavy-satan-dead-metal-rock, адэпты якога знаходзяцца ў стане пэрманэнтнай вайны з папсой.

Я прыйшоў да думкі, што графіці ў ліфтах — дзяцінства. Навалу папсы можа прыпыніць толькі радыкальны акт. Прасьвятленьне найшло, калі я слухаў запіс гурту «Крадзі-талкай», дзе саліст сьпявае: «Gazmanov must die! Metal long live!»

Спачатку я меркаваў, што аднаго жмурыка-папсавіка будзе дастаткова, каб прымусіць усіх выканаўцаў шлягераў назаўсёды заткнуцца. І тут пабачыў афішу «За Беларусь!». Гэта быў знак лёсу! Нэўтралізаваць скопам Агурбаш, Жанэт, Газманава — усіх, хто замінае нашай справе. Ад гэтай думкі мяне перла, як ад соткі дэцыбэлаў!

Самае цяжкае было дастаць запрашальнікі, якія распаўсюджваюцца толькі сярод ляяльнай моладзі.

Вы заўважылі, дарагія бацькі, што апошнім часам са мною адбыліся перамены. Я пастрыгся пад лоха, падпісаўся на «Знамя юности» і зьбіраў подпісы за АГЛ на мясцовай піўнусе. Вы думалі, што мае псыхічныя дэвіяцыі набываюць больш небясьпечную форму. Не, гэта было часткай майго пляну, каб атрымаць запрашальнік.

Цяпер ён перада мною. Таксама як і кілаграм трацілу. Праз хвіліну я ім абматаюся і рушу ў ДК. Як толькі Сітнік зацягне «На ладошках неба пляшут…», я з крыкам «Няхай жыве black-heavy-satan-dead-fuck-metal-rock!» прывяду машынку ў дзеяньне.

**Ваш сын Уладзя Б.**
**02.03.06»**

*P.S.:* Уладзя Б. здолеў пранікнуць у ДК. Аднак, калі Сітнік пачала сьпяваць, мэталюгу так пацягнула на рвакі, што давялося выклікаць хуткую. Па факце знаходжаньня ванітаў у памяшканьні, дзе мела месца афіцыйнае мерапрыемства, заведзена справа паводле артыкулу «дыскрэдытацыя дзяржаўнага ладу РБ». Сьледзтва працягваецца.

# Цяжкая спадчына Рэчы Паспалітай

**«НН» атрымала наступны ліст ад Аляксея Бацюкова з Магілёва:**

**«Вітаю! Прачытаў у расейскім часопісе «Ab Imperio» за 2004 г., нібыта ў Горадні энтузіясты знайшлі герб Рэчы Паспалітай, зьбіты расейцамі пасьля падзелу Рэчы Паспалітай. І нібы мясцовы музэй адмаўляецца гэты герб браць, ён так і валяецца пад сьцяной Гістарычнага музэю. Музэй месьціцца ў старым будынку палацу Станіслава Панятоўскага, у якім той падпісаў адмову ад трона. Ці гэта сапраўды так?»**



Герб Рэчы Паспалітай, які да прыходу расейцаў упрыгожваў франтон каралеўскага палацу, пасьля яго дэмантажу быў вывезены ўдзельнікам паўстаньня пад кіраўніцтвам Касьцюшкі Станіславам Солтанам у Мураваную Бераставіцу. Там яго і адшукаў стваральнік і першы дырэктар гарадзенскага музэю Юзаф Ядкоўскі. Прывезены ім назад у Горадню герб быў пашкоджаны.

Вось што мы высьветлілі, затэлефанаваўшы ў Горадню.

Герб сапраўды знаходзіцца на тэрыторыі музэю ля замкавага муру. Сябры аб’яднаньня маладых навукоўцаў «Віт» абураюцца стаўленьнем адміністрацыі музэю, што не знайшла месца гербу ў экспазыцыі музэю.

Супрацоўнік музэю Андрэй Вашкевіч мае свае меркаваньні. Ён зазначыў, што герб схаваны ад ападкаў у сьцяннай нішы Малога замку, а адміністрацыя музэю ніколі ад яго не адмаўлялася. «У нас ня толькі герб, але й некаторыя цяжкія і груваздкія экспанаты знаходзяцца на двары — гарматы і якар, што адшукалі ў Нёмане. Герб у хуткім часе маем перанесьці ў павільён Ніжняй царквы».

На золку незалежнасьці ўзьнікла ідэя адрэстаўраваць герб і ўсталяваць на ранейшым месцы, але далей размоў, як кажа гарадзенскі мастак і каваль Юрась Мацко, справа не скранулася. А пасьля надышлі іншыя часы. У гэтым зьвязку сп.Юрась мае ўласны сумны досьвед — выкаваны ім адмыслова для ўсталяваньня на шпілі Новага замку герб Горадні чакае да лепшых часоў — у апошні момант з аблвыканкаму адклікалі згоду на яго ўсталяваньне.

Паводле адной з вэрсіяў, герб немагчыма вярнуць на гістарычнае месца праз зьмену фасаду Новага замку — маўляў, не пасуе ён новаму абліччу колішняй каралеўскай рэзыдэнцыі. Але кожны, хто наведваў гарадзенскі музэй, ведае, што цяпер там «красуецца» герб таксама неіснуючай дзяржавы — савецкі. Гэтая спадчына, так горача шанаваная сёньняшняй уладай, таксама чакае пераасэнсаваньня.

**Сямён Печанко**

## А сам я чакаю майдану...

Я вучань менскай ...-й школы з фізычным профілем. Вучуся там першы год, таму набываю новых сяброў. Быў вельмі зьдзіўлены, калі даведаўся, што сярод аднаклясьнікаў — паэт, які друкаваўся летась у «Дзеяслове» ў адным нумары з Пазьняком ды некаторых польскіх выданьнях.

Трое вучняў слухаюць «N.R.M.», «IQ-48», «Ulis» ды інш. На ўроку мовы на тэму «Уплыў мовы на разьвіцьцё культуры» я напісаў сачыненьне пра становішча ў нашай музыцы. Пасьля амаль палова клясы пыталася пра беларускую музыку на MP3 ці CD.

Ды навошта баяцца і хавацца, нібы па норах?! А сам я чакаю «Майдану», каб пераканацца, што я не адзіны.

**Раман Латушка, Менск**

## Паважайце большасьць

Паважаная «НН»! У апошніх нумарах былі зьмешчаныя артыкулы, пададзеныя лацінскім альфабэтам. Я паважаю выбар іх аўтараў, але хацелася, каб матэрыялы друкаваліся на кірыліцы. Пазыцыя рэдакцыі, я думаю, будзе тут не на апошнім месцы. Большасьць, на мой погляд, будзе са мною згодная.

**Den-belorus**

## Ад Рэдакцыі

Мы друкуем невялікую частку тэкстаў лацінкай (тых аўтараў, якія аддаюць ёй перавагу), бо гэта важна для захаваньня лацінічнае традыцыі беларускага правапісу. Цяпер жа бо амаль ніхто на лацінцы больш не друкуе, акрамя жменькі касьцельных і Інтэрнэт-выданьняў. Прычына — гэты правапіс не вывучаюць у школах. Між тым яшчэ 100 гадоў таму ім масава карысталіся, ім выдаваў вершы Незраўнаны Багушэвіч, на ім пачынаў пісаць Купала, на ім пэўны час у пачатку XX ст. выдавалася «НН»... Гэта частка нашае культурнае спадчыны, а яшчэ ж гэта лучыць нас з эўрапейскім культурным масівам.

***

Вы — лепшыя! Са 100-годзьдзем! Памагай Вам Божа!

**Яўген Л., Падольск, Расея**

## Насіце сьцяг

Спрадвеку бел-чырвона-белы сьцяг гуртаваў вакол сябе абаронцаў Бацькаўшчыны. У цяжкі час бою з ворагам ваяры азіраліся на сьцяг, бо ведалі: калі лунае штандар — значыць, мы жывыя, мы змагаемся. Сьцяг натхняў да перамогі. Цаной сваіх жыцьцяў ваяры абаранялі нашу бел-чырвона-белую сьвятыню.

І сёньня ў яднаньні народу вакол нацыянальнай ідэі важная роля належыць нашаму сьвятому нацыянальнаму сьцягу, такому дарагому нашым гераічным продкам.

Але пакуль што мала каго сустрэнеш зь бел-чырвона-белым значком. Калі кожны сьвядомы беларус будзе насіць яе на грудзях, дык на ўсю Беларусь будзе чуваць:

Мы — Беларусы! Мы — разам! Жыве Беларусь!

Таму заклікаю: насіце Сьцяг!

**Мікалай Кукса, Івенец**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб’ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@promedia.by.**
**Факс: (017) 284-73-29.**

# Як знайсьці сяброў і абараніць нацыянальныя інтарэсы Беларусі?

Ад Гомелю да Табрызу прыкладна столькі ж, колькі ад Горадні да Лівэрпулю. У дачыненьнях з Іранам нам варта пакласьціся на рэальна існуючы патэнцыял дзеля разьвіцьця эканамічнае супрацы. **Сяргей Богдан** адказвае **Вацлаву Шаблінскаму** («НН», №5).

Сьведчаньнем нясьпеласьці нашай дэмакратычнай грамадзкасьці ёсьць стэрэатыпы пра міжнародную палітыку, дзіўныя ўяўленьні пра сьвет, што не дазваляюць вызначыць, у чым палягаюць нацыянальныя інтарэсы краіны. Перачытаўшы некалькі разоў артыкул В.Шаблінскага «Іран: небясьпечны сябра», я так і ня ўцяміў, у чым небясьпека Ірану для Беларусі. Ня думаю, што ён больш небясьпечны, чым іншыя краіны. Падаецца, што сп.Вацлаў занадта сканцэнтраваўся на адной вэрсіі гісторыі — крытычнай да сёньняшняга іранскага рэжыму.

### Іран і ядравая праграма

Тэгеран падпісаў Дамову аб нераспаўсюдзе ядравай зброі (дарэчы, Ізраіль яе не падпісаў дагэтуль, але на тое ніхто не зважае) і да самага апошняга моманту дапускаў інспэктараў МАГАТЭ на свае аб’екты. Былі спазьненьні з допускам, але па ўласным досьведзе магу сьцьвердзіць, што ў гэтай краіне спазьненьні — нармалёвая рэч для дзяржапарату.

МАГАТЭ сьцьвярджае: знойдзены дакумэнты, якія сьведчаць пра «выраб нейкіх сфэрычных формаў», у якіх «тэарэтычна можна зьмясьціць ядравы набой». Гэтых дакумэнтаў — паўтары старонкі.

Прыгадваецца аналягічная сытуацыя з Іракам, калі сьвет пераконвалі ў існаваньні іракскай зброі масавага зьнішчэньня (ЗМЗ), карыстаючыся наступнай аргумэнтацыяй: «Садам — нягоднік і забойца, вядома, у яго ня можа ня быць небясьпечнай ЗМЗ». Зброі не аказалася. Я падтрымліваю зьвяржэньне Садама, але чаму нельга проста сказаць: мы зрынаем Садама за генацыд?

Сёньня аргумэнтацыя падобная: агрэсіўны Тэгеран хоча мець ядравую бомбу, бо ён агрэсіўны. Ігнаруецца той факт, што імкненьне Ірану да панаваньня ў рэгіёне і яго ядравая праграма бярэ пачатак у 1960-х — калі краіна была хаўрусьнікам Амэрыкі, а пры ўладзе стаяў шаг. Таму нічога надзвычайнага ў наяўнасьці ядравай праграмы для сучаснай дзяржавы няма, а аднаўленьне праграмы (пачатак 1990-х) прыпадае акурат на часы адыходу ад радыкальнай ідэалёгіі, а ніяк не на ўздым рэвалюцыі.

Інакш як дзіўным не назавеш пытаньне, нашто Ірану тая праграма, калі тамака столькі нафты і газу? Але ж ідзецца аб прагрэсе і аб тым, што выкапневыя віды паліва ня могуць забясьпечваць чалавецтва вечна. Паліць далей нафту — значыць заставацца ў мінулым стагодзьдзі. Чаму тады ніхто не зьдзівіўся, калі ў сваёй прамове 31 студзеня прэзыдэнт Буш сказаў пра незалежнасьць ад выкапневых энэрганосьбітаў? Ядравая праграма Ірану — звычайнае імкненьне сучаснай дзяржавы да разьвіцьця.

### Іран і экспарт Ісламскай рэвалюцыі

Усе адмысловыя органы, што займаліся экспартам рэвалюцыі, спынілі дзейнасьць у сярэдзіне 1980-х з прычыны вычарпаньня месцаў, куды яе можна было б экспартаваць, і адсутнасьці «попыту на рынках». Экспартаваць Ісламскую рэвалюцыю было немагчыма з простай прычыны. Іран — шыіцкая краіна (то бок выклятая для большасьці сунітаў, якія складаюць абсалютную большасьць мусульманаў). Таму шыіцкі аятала Хамэйні так і ня змог пераканаць сунітаў сьвету ў сваёй праўдзе. Для сунітаў шыіты — гэта як для праваслаўных баптысты. То бок здаецца аднаму Богу моляцца, але…

Спробы экспартаваць Ісламскую рэвалюцыю мелі абмежаваны посьпех толькі ў Лібане, Іраку ды сярод аўганскай газарэйскай меншасьці. Але перамогі не ўдалося дабіцца *нідзе*. Створаная з іранскай дапамогай Найвышэйшая рада Ісламскай рэвалюцыі ў Іраку прыйшла да ўлады ў краіне толькі дзякуючы амэрыканскаму войску!

Наколькі зьмяніліся часы, паказваюць і наступныя факты. Адказным за экспарт рэвалюцыі некалі быў аятала Алі Мантазэры. Сёньня ён — улюбёны герой заходніх мэдыяў, увасабленьне апазыцыі рэжыму. Яшчэ адзін колішні «экспартэр рэвалюцыі» — самы багаты чалавек Ірану Алі Акбар Гашэмі-Рафсанджані, надзея лібэралаў на апошніх прэзыдэнцкіх выбарах…

Дадам, што ўсе больш-менш годныя даверу доказы ўдзелу Ірану ў тэрарыстычнай дзейнасьці датычаць 1980-х. Назавеце мне хоць аднаго з іранскіх шагідаў за апошнія гадоў пятнаццаць, якімі, Вацлаве, вы нас палохаеце? За апошнія гады мне давялося агледзець нямала мэмарыялаў шагідаў, але вось усе яны былі датаваныя 1980-мі гадамі і загінулі ці ў сутыкненьнях з антыхамэйністкай апазыцыяй, ці ў вайне з Іракам.

**Працяг на старонцы 30.**

# У ложку з Гітлерам

Лічу падтрымку Даніі й дацкіх журналістаў сваім маральным абавязкам. Піша **Віталь Тарас**.

Тэракт 11 верасьня 2001 г. у Нью-Ёрку, у выніку якога загінулі тры тысячы чалавек, выклікаў непрыхаваную радасьць амаль ва ўсім ісламскім сьвеце. Штогод падчас паломніцтва мусульманаў у Мэку гінуць дзясяткі, а то й сотні людзей. Захады бясьпекі з боку паліцыі не дапамагаюць.

Нядаўна ў Чырвоным моры патануў паром, на борце якога было 1,5 тыс. пасажыраў. Каля дзевяцісот чалавек загінулі. Афіцыйнай жалобы ў Эгіпце абвешчана не было. Футбольныя матчы на Кубак Афрыкі працягваліся. Лёс ахвяраў цікавіў толькі сваякоў загінулых.

У 1980-я гады падчас вайны паміж шыіцкім Іранам і суніцкім Іракам з абодвух бакоў загінула звыш мільёна чалавек. Антываенных акцыяў пратэсту ці хваляваньняў ні сярод шыітаў, ні сярод сунітаў у абедзьвюх краінах не было.

Ніякія тэракты, у тым ліку падрыў тэрарыстамі мячэтаў ды іншых сьвятыняў у Іраку ўжо ў нашыя дні, ня выклікалі акцыяў пратэсту ў мусульманскім сьвеце. Прынамсі — хоць у чымсьці падобных паводле маштабу на тыя, што выклікалі карыкатуры на прарока Мухамада. У тым, што гэтыя пратэсты былі загадзя сплянаваныя, не выклікае сумневу.

## «Вось яна, вашая дэмакратыя!»

У сьнежні 2005 г. у Мэцы на саміце краінаў Ісламскай канфэрэнцыі (сустрэча была прысьвечаная шляхам зьмякчэньня супярэчнасьцяў паміж сунітамі і шыітамі) узьнялі пытаньне аб карыкатурах на прарока Мухамада. Дэлегацыя з Даніі прывезла малюнкі, апублікаваныя ў верасьні «Юландс постэн». Да дзесяці апублікаваных карыкатур былі далучаныя яшчэ дзьве неапублікаваныя. Кіраўнікі ісламскага сьвету вырашылі даць урок Захаду. Лібанскі навуковец Сары Ханафі сказаў у інтэрвію «Нью-Ёрк Таймз»: «Дэманстрацыі пачаліся як унутраная рэакцыя — мусульмане сапраўды былі абураныя. Але потым рэжымы пакарысталіся гэтым, заявіўшы: «Бачыце, вось яна, дэмакратыя, аб якой яны гавораць».

Найбольш зацікаўленымі ў антызаходніх пратэстах былі Сырыя й Іран. У ААН працягваецца расьследаваньне справы аб забойстве былога прэм’ера Лібану Харыры, у датычнасьці да якога падазраецца Сырыя. Іран яўна хоча зрабіцца супэрдзяржавай, што ня ўсім падабаецца ня толькі ў Эўропе й ЗША, але і Азіі. Так што імкненьне захапіць духоўнае лідэрства ў барацьбе з «шатанскім Захадам» і Ізраілем з боку Тэгерану ў хаўрусе з Дамаскам і рэлігійным рухам «Хамас» больш чым зразумелае ды прадказальнае.

Менш зразумелай выглядае млявая рэакцыя эўрапейскіх урадаў на антызаходніцкую кампанію, разьвязаную на Блізкім Усходзе й падтрыманую мусульманскімі грамадамі амаль ва ўсіх краінах. Толькі Данія на чале з прэм’ерам Расмусэнам амаль у поўнай ізаляцыі працягвае адстойваць эўрапейскія каштоўнасьці — свабоду слова і свабоду сумленьня.

Нарвэская «Магазынэт», француская, польская ды іншыя газэты перадрукавалі злашчасныя карыкатуры на знак салідарнасьці з дацкімі калегамі. Салідарнасьці ніколі не бывае замнога. Зразумела, публікацыя карыкатур на старонках «НН» сталася б для газэты актам самагубства. А гэта нікому не патрэбна. Але вызначыцца ў сваёй пазыцыі, адназначна выказацца ў падтрымку свабоды прэсы, у падтрымку заходніх журналістаў ёсьць, на маю думку, маральным абавязкам. Тым больш што журналісцкія ды праваабарончыя арганізацыі Даніі зрабілі нямала карыснага для падтрымкі вольнага слова ў Беларусі. Ня трэба на гэта забывацца.

## Капітуляцыя на карысьць паліткарэктнасьці?

На пачатку лютага да амбасады Даніі ў Партугаліі выстройваліся чэргі, каб зрабіць запіс у адмысловай кніге з выказваньнямі падтрымкі дацкім журналістам.

Тым часам эўрапейскія топ-чыноўнікі — напрыклад, кіраўнік МЗС Брытаніі Джэк Стро — асудзілі публікацыю карыкатур, справядліва назваўшы сам факт абуральным, але не сказалі ні слова ў абарону Даніі й датчанаў. І гэта ўжо пасьля таго, як дыппрадстаўніцтвы Даніі й Нарвэгіі былі спаленыя альбо штурмаваліся натоўпамі фанатыкаў у Бэйруце, Дамаску, Тэгеране. Відавочна, брытанскі дыплямат забыўся, што ў Ангельшчыне знайшоў прытулак некалі асуджаны на сьмерць аяталом Хамэйні Сальман Рушдзі. Магчыма, зь меркаваньняў паліткарэктнасьці і ў парадку прабачэньняў трэба было выдаць Рушдзі Тэгерану?

Магчыма, афіцыйная Эўропа, у адрозьненьне ад простых грамадзянаў, не адышла ад шоку, які перажыла Францыя, а ўсьлед за ёй іншыя краіны падчас леташніх беспарадкаў і падпалаў аўтамабіляў у арабскіх кварталах буйных гарадоў. Данію тыя беспарадкі амаль не закранулі. І ў гэтым няма нічога дзіўнага, калі ўлічыць, што сярод краінаў Эўразьвязу ў Даніі найменшы адсотак беспрацоўных сярод імігрантаў, а таксама самыя высокія заробкі ды ўзровень сацыяльных гарантыяў, у тым ліку для замежнікаў. Пра надзвычай высокі ўзровень талерантнасьці ды поўную адсутнасьць расізму ў Дацкім каралеўстве няма патрэбы казаць. Верагодна, высокія эўрапейскія стандарты жыцьця выклікаюць асаблівую няпрыязнасьць у клерыкальных рэжымаў на Ўсходзе.

Праўда, нельга скідваць з рахунку прысутнасьць немалога дацкага кантынгенту ў Іраку. Але ж дацкі ўрад праявіў у гэтым канкрэтным выпадку трансатлянтычную салідарнасьць — у адрозьненьне ад Францыі і Нямеччыны, у якіх хапае ўласных палітычных амбіцыяў на Блізкім Усходзе.

Складваецца ўражаньне, што падзеі

11 верасьня толькі згуртавалі ЗША — у тым ліку інтэлектуальна. А вось дэманстрацыі ў абарону прарока Мухамада, здаецца, дэмаралізавалі Заходнюю Эўропу. Яна ўжо амаль гатовая капітуляваць — ня перад ісламам, а перад паліткарэктнасьцю, якая ўсё больш замяняе ў сучасным цывілізаваным сьвеце мараль.

Паліткарэктнасьць мне ўяўляецца адной з найбольш вытанчаных формаў расізму й ксэнафобіі. Пісьменьнік Сяргей Даўлатаў апісаў эпізод з удзелам ленінградзкай пісьменьніцы Веры Пановай. Аднойчы ў гутарцы зь ёй Даўлатаў выказаў думку, што калі б камуністы былі сапраўднымі інтэрнацыяналістамі, дык у савецкім урадзе павінны былі быць габрэі. «Дык вы антысэміт?» — зьдзіўлена запыталася Панова. «Чаму вы так лічыце?!» — абурыўся Даўлатаў, які быў напалову габрэй, напалову армянін. «А я думала, што ва ўрадзе павінны быць разумныя людзі», — патлумачыла пісьменьніца.

Назойлівае падкрэсьліваньне павагі да прадстаўнікоў іншых расаў, рэлігійных перакананьняў нярэдка выдае ў тых, хто шчыруе на ніве паліткарэктнасьці, унутраную грэблівасьць да тых, хто стаіць на больш нізкіх сацыяльных прыступках. Міжволі зь меркаваньняў паліткарэктнасьці часам на адну дошку ставяцца палітычная, рэлігійная і сэксуальная арыентацыя. Адсюль нараджаецца перабольшанае, амаль ліслівае і таму наскрозь фальшывае стаўленьне да прадстаўнікоў т.зв. меншасьцяў. У нармальнага чалавека, якой бы арыентацыі ён ні быў, падобнае стаўленьне можа выклікаць толькі агіду. Пошлы анэкдот ці карыкатура ёсьць пошлымі, бо яны пошлыя й нясьмешныя — а не таму, што закранаюць нейкія табу. Калі прызнаць існаваньне «табу» ў культуры, трэба ўводзіць цэнзуру. Няма й ня можа быць забароненых тэмаў. Ёсьць толькі адказнае стаўленьне да іх, форма і майстэрства падачы. І яшчэ трэба памятаць пра аўдыторыю, зразумела. Менавіта дзеля гэтага пры паказе фільмаў па тэлебачаньні на экране высьвечваюцца лічбы абмежаваньняў ва ўзросьце. Астатняе — абавязак бацькоў.

Як казаў клясык, ня трэба змагацца за чысьціню — трэба проста прыбіраць за сабой. Ня трэба змагацца з расізмам і ксэнафобіяй. Трэба заставацца прыстойнымі людзьмі.

Зразумела, паліткарэктнасьць — вымушаная мера там, дзе не стае культуры (у тым ліку ўнутранай), ведаў дый проста розуму. Як не ставала элемэнтарнага розуму супрацоўнікам «Юландс постэн». Але ім, дарэчы, хапіла розуму й гонару некалькі разоў перапрасіць усіх мусульманаў за тое, што яны зьняважылі іхныя рэлігійныя пачуцьці.

## Тузін нажоў у сьпіну цывілізацыі

У Беларусі, як і ў Расеі, не хапіла ні розуму, ні паліткарэктнасьці, каб чарговым разам ня выказаць радасьці з прычыны рэлігійных пагромаў. Прапагандысты рэжыму на розныя лады паўтараюць словы: «Вось яна, ваша хвалёная дэмакратыя!»

Між тым, барацьба з расізмам і ксэнафобіяй, якая разгарнулася ў расейскай Думе і прэсе, мае карыкатурны зьмест. Ніводзін расейскі фашыст яшчэ ня быў асуджаны за прапаганду расісцкіх перакананьняў. Тыя, хто прадаюць «Майн Кампф», абыходзяцца сымбалічнымі штрафамі, у Нямеччыне за такое б атрымалі немалыя тэрміны зьняволеньня. За забойства афрыканскіх студэнтаў у Расеі судзяць паводле артыкулаў «злоснае хуліганства».

Крывадушнасьць праяўляецца ня толькі на ўзроўні хітрыкаў юрыспрудэнцыі ці ўнутрыпалітычнага жыцьця. Яна стала целам і крывёю расейскае палітыкі.

Заходні сьвет быў уражаны запрашэньнем прадстаўнікоў «Хамас» на перамовы ў Маскву. Ізраіль назваў гэта «нажом у сьпіну». Атрымліваецца, што Расея, якая ўваходзіць у т.зв. «квартэт» на перамовах па мірным разьвязаньні канфлікту на Блізкім Усходзе разам з ЭЗ і ЗША, гатовая без усялякіх папярэдніх умоваў дамаўляцца з тэрарыстамі. «Хамас» дагэтуль яшчэ нідзе і ніколі не заўяляў, што ён прызнае права Ізраілю на існаваньне, гатовы раззброіць сваіх баевікоў і адмовіцца ад тэрарыстычных акцыяў супраць ізраільцянаў. Вашынгтон запатрабаваў тлумачэньняў ад Масквы. І ён іх атрымаў. З вуснаў міністра абароны Іванова прагучала заява аб тым, што «Хамас» перамог на дэмакратычных выбарах і з гэтым фактам трэба лічыцца.

Цікава было б ведаць, што перашкодзіла Маскве ў свой час уступіць у перамовы з Асланам Масхадавым — законна абраным прэзыдэнтам Чачэніі. Замест гэтага Крэмль загадаў забіць легітымнага прэзыдэнта. А ягоныя парэшткі ўрачыста дэманстраваліся па галоўных расейскіх тэлеканалах. Доказамі датычнасьці Масхадава ці іншых палявых камандзіраў да тэрактаў ніхто сябе не абцяжарваў. Між тым, «Хамас» не аднойчы браў на сябе адказнасьць за зьдзейсьненыя тэракты.

Калі прэзыдэнт Расеі заклікае «мачыць у сарціры» чачэнскіх тэрарыстаў альбо вынішчаць іх у пячорах, «як пацукоў», дык чаму ж Крэмль гэтак паблажліва і нават паважна ставіцца да палестынскіх тэрарыстаў?

Ды таму, што вельмі хочацца аднавіць свой статус «звышдзяржавы», краіны, зь якой вымушаны лічыцца Захад. На Захадзе адзначаюць новы тон, якім апошнім часам пачала гаварыць Масква. Гэта добра знаёмая з савецкіх часоў фанабэрыя. Тыя імпэрскія «ноткі» ня могуць не адчуваць і ў Менску, і наўрад ці яны надта падабаюцца кіраўніцтву Беларусі. Але хоцькі-няхоцькі цяперашні рэжым апынуўся ці вось-вось апынецца разам з Расеяй у адным лягеры з найбольш адыёзнымі рэжымамі ў сьвеце. Стаўка робіцца на ворагаў ЗША — Іран, Сырыю, Вэнэсуэлу. Ворагі нашых ворагаў — нашыя сябры. Цяпер, напэўна, сярод сяброў Беларусі апынецца «Хамас»?

Зразумела, ісламізацыя, тым больш мусульманскі экстрэмізм, не пагражаюць Беларусі — прынамсі ў бліжэйшай пэрспэктыве. Але ж быць уцягнутай у сусьветны ядравы канфлікт краіна з захаваньнем цяперашняга замежнапалітычнага курсу здатная.

Іранская прэса ў адказ на публікацыю карыкатураў на прарока Мухамада надрукавала сэрыю карыкатураў на галакост. На адной зь іх намаляваны Гітлер у ложку з Аннай Франк — габрэйскай дзяўчынкай, расстралянай гітлераўцамі. На мой погляд, трэба было б надрукаваць карыкатуры на прарока Мухамада і на галакост побач, каб людзі маглі параўноўваць і думаць. Хаця б над тым, як не зрабіцца ахвярамі новага галакосту.

# Як знайсьці сяброў і абараніць нацыянальныя інтарэсы Беларусі?

Працяг са старонкі 27.

## Гісторыя Ірану

Лаянка на Аляксандра Македонскага і туга па даісламскай Сасанідзкай імпэрыі цікавяць простых іранцаў менш, чым беларусаў сьмерць полацкага князя Рагвалода. Іранцы цьвёрда прыхільныя да шыізму, таму нават суніцкія Таджыкістан і Аўганістан не ўспрымаюцца імі як свае.

Праўда ў тым, што іранская ідэнтычнасьць і дзяржава трымаюцца на шыізьме, а не на пэрсыдзкім нацыяналізьме (пэрсы нават не складаюць большасьці ў краіне). У такіх умовах шыіцкае духавенства заўжды грала значную ролю. Удар па шаскім рэжыме з боку шыіцкіх мулаў быў лягічнай зьявай пасьля спробаў шага абмежаваць правы і самастойнасьць духавенства дый адрадзіць неісламскую спадчыну.

Апроч таго, Хамэйні ня быў тыповым прадстаўніком духавенства, а ідэалёгія Ісламскай рэвалюцыі была распрацавана інтэлектуаламі, што вучыліся ў Эўропе, мае левыя карані і лічыцца ерасьсю сярод большасьці шыіцкага духавенства ў сучасным Іране.

Харызматычны правадыр Хамэйні скінуў шаскую дыктатуру, заснаваў ісламскую рэспубліку, пракляў Рушдзі і зрабіў яшчэ шмат чаго, але ня меў аніякага дачыненьня да пачатку савецкай вайны ў Аўганістане, дзе любое іранскае ўмяшаньне выклікала б ня менш адмоўную рэакцыю, чым дзеяньні Саветаў. Нагадаю, што аўганская апазыцыя сядзела ў пакістанскіх Квэтах і Пэшаварах і мела амэрыканскіх дарадцаў. Іранцы былі занятыя на той час вайной з Іракам.

## Небясьпечнае сяброўства Беларусі з Іранам

«Сябруючы з Іранам, мы трапляем у кепскую кампанію». Назаву краіны ў парадку зьмяншэньня іх долі ў замежнагандлёвых сувязях з Іранам: Японія, КНР, Італія, ПАР, Паўднёвая Карэя, Тайвань, Турэччына, Нідэрлянды… Ня толькі недэмакратычная Расея будуе АЭС у Бушэры, але й чэскія фірмы займаюцца энэргазабесьпячэньнем у Іраншагры. Дэмакратычны Тбілісі выратаваўся ад газавага расейскага імпэрыялізму з дапамогай Тэгерану. Армэнія выстаяла ў вайне з Азэрбайджанам, абапіраючыся ў тым ліку на іранскую дапамогу.

У палітычным пляне рэжым у Іране даўно ўжо не такі ізаляваны, бо мае кантакты з усім сьветам, за выняткам ЗША і Ізраілю. Таму злавіць на кантактах з Тэгеранам можна ўвесь сьвет.

Калі не зважаць на мінулае рэжыму, дык ёсьць усе падставы сьцьвярджаць: Іран ёсьць на сёньня адной зь дзьвюх найбольш дэмакратычных дзяржаваў Блізкага Ўсходу, дзе адбываюцца выбары, ёсьць апазыцыя і канкурэнтная палітыка. Другая такая краіна — Ізраіль.

Ніводная дзяржава сьвету ня можа праігнараваць велізарны Іран, у тым ліку і Беларусь. Да таго ж ён занадта блізка знаходзіцца ад Беларусі, каб можна было грэбліва называюць яго «небясьпечным экзатычным сябрам». Ад Гомелю да Табрызу прыкладна столькі ж, колькі ад Горадні да Лівэрпулю. Час зразумець, што Іран — гэта не далёкае афрыканскае каралеўства, якому можна прадаваць іржавыя шрубалёты. Іран — гэта вялікая і багатая прыроднымі выкапнямі краіна, што імкліва ўзмацняецца эканамічна і будзе граць важную ролю ў сьвеце ў будучыні. Гэта краіна, дзе нам варта быць.

У дачыненьнях з Іранам нам варта пакласьціся на рэальна існуючы патэнцыял дзеля разьвіцьця эканамічнае супрацы. Палітычныя матывы — спэцыфіка адносінаў Ірану з ЗША, Ізраілем і г.д. — павінны адысьці на другі плян. У гэтым наш нацыянальны інтарэс.

# Прызнаць за Акудовічам права на не-існаваньне

Шаноўны браце Пётра Рудкоўскі, захацеў падзяліцца думкамі наконт вашага артыкулу (№6, 10 лютага). «Бог хацеў, каб мы насьледавалі Ягонае прыніжэньне, а не імкнуліся да сьвецкага панаваньня і здабыцьця палітычнага ўплыву». Гэта праўда. Але ён не захацеў, каб зь Бібліі быў выкрасьлены Стары Запавет, як настойваў калісь Маркіён. Гэта значыць, што Бог руйнуе Бабілёнскія вежы, калі яны дасягаюць крытычных памераў, але ня супраць, каб мы будавалі сабе ўтульныя дамы, адпаведныя нашаму маштабу. У тым ліку і дамы-дзяржавы (што ўжо аўтаматычна азначае пэўны палітычны ўплыў). Як ветразевы карабель, каб рухацца супраць ветру, мусіць увесь час мяняць галсы, так і ў гісторыі Хрысьціянства даводзіцца час ад часу гэта рабіць. Бываюць часы, калі даводзіцца вяртацца да строгіх і акрэсьленых кніг Закону: Зыход, Другазаконьне, Царствы...

Ці вы ўпэўненыя, што вы не падмяняеце Божае слова? «слова» пабуджае любіць ІНШЫХ у імя праўды...» Хрыстос заклікаў любіць БЛІЖНІХ. Гэта значыць: ён прызнаваў герархію нашых пачуцьцяў. Найперш мы абавязаныя любіць сваю сям'ю, сяброў, затым мясцовую супольнасьць, дзяржаву, эўрапейскую (юдэя)хрысьціянскую цывілізацыю. Адсюль прыватная ўласнасьць (вінаградннік Навуфэя, напрыклад). Адсюль «спрэс мяжы, спрэс платы». Гэта як канцэнтрычныя колы вакол любой асобы грэшнага чалавека. Спадзяюся, Вы не падазраяцё Бога ў тым, што ён ставіць нам нерэальныя задачы?

У той час, калі спустошаны Альбэрт Швэйцар выправіўся ў Габон, на ягонай радзіме, у Нямеччыне, разгорталіся ўсім сумна вядомыя працэсы. Дзе насамрэч абавязак прадпісваў быць Швэйцару, за якіх бліжніх змагацца? Габон ня шмат паправіўся і да нашых дзён, а вось ці не сапсавалася Нямеччына?

Размытасьць адказнасьці, адсутнасьць канкрэтных абавязкаў; пустое прыгожаслоўе — ці не закладзена гэта, прынамсі ў патэнцыяле, у Вашай пазыцыі ? Спадзяюся, вы не абвергнеце гэта «з парогу», а здолееце паразважаць і памаліцца, калі сапраўды — «слова — гэта адначасова неспакойная, імпэтная і энэргічная істота, здольная адкрываць у чалавеку ўсё новыя і новыя глыбіні...».

Адна з патэнцыйных магчымасьцяў: прызнаць за Акудовічам права на не-існаваньне, якое ён дэкляруе (невядома як, шчыра або крывадушна, але паліцэйскае дасьледаваньне ягонай сувэрэннай душы ня ёсьць нашым правам і тым больш абавязкам. Каталіцкі Касьцёл прызнае свабоду волі). На такім *праве на не-існаваньне* прынцыпова настойвае будызм, і як вы плянуеце выбрацца з тупіка, у які самі сябе, магчыма, заганяеце? Што-небудзь адно: або талераваць будызм, або ратаваць будыстаў зь нябыту нірваны. Але адначасова і тое, і другое — немагчыма! Калі ж Акудовіч захоча выратавацца (бо Хрыстос сапраўды сказаў: «не хачу сьмерці грэшніка, але каб навярнуўся і жыў»), дык наш абавязак — яму ўсяляк дапамагчы. Але хай сам задэкляруе такое жаданьне. Ягоная сувэрэнная воля.

Ёсьць розныя разнастайнасьці пыхі. Адна зь іх — гэта пыха перасягнуць сваёй міласэрнасьцю Самога Хрыста. Ці ня супраць такой спакусы і пакліканы служыць працяцьдзьдзем Стары Запавет?

**Алесь Белы, Менск**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Новая нацыянальная бібліятэка рызыкуе стаць распаўсюджаным вобразам у прыкладным мастацтве. Бо простая ў выкананьні, пазнавальная і цешыць вока патрэбных людзей. На фота: выстава скульптураў зь лёду ў Менску.




**Сяргей Скрабец на Лідчыне, падчас сустрэчы з сваімі выбаршчыкамі.**

# «Цукерак я табе ня раю. Шкодна. І нават небясьпечна»

## ВОЛЬГА КАРАТКЕВІЧ

Сяргея Скрабца я бачыла адзін раз. Гаварыла сотні. Аляксандра Скрабца ніводнага разу ня бачыла. Гаварыла дзясяткі разоў. З Аляксандрай Скрабец правяла некалькі дзён у Празе. Яны сталі маімі сябрамі праз іхны надзвычайны чалавечы магнэтызм. А кантакт пачаўся са знаёмства зь Сяргеем.

На Парлямэнцкай асамблеі АБСЭ ў Ратэрдаме на бясконцым круглым стале па сытуацыі ў Беларусі ад палаты прадстаўнікоў мусілі выступаць Сяргей Скрабец і Ўладзімер Канаплёў. Сяргей ачольваў дэпутацкую групу «Рэспубліка». Убачыўшы лысага прадпрымальніка, а цяпер дэпутата, падумала: «Во ўжо выступіць... Лепш бы Анатоль Лябедзька...»

Калі Сяргей узяў слова — галовы паднялі ўсе. Я перастала пісаць рэпартаж, бо чула новае. Што і як трэба мяняць. Законы, свабода слова, эканоміка і пэрспэктывы. Без эпітэтаў. Ён ня ганіў кіраўніка дзяржавы і беларускі рэжым. Я бачыла, што заходнікам, стомленым ад слова «Беларусь», было цікава і, галоўнае, зразумела. Скрабцу пляскалі шчыра, а не паводле пратаколу — і прагматычны Вік, і рамантычны Крыстафэр Сьміт. І нават Ута Цапф.

Асамблея супала з маімі народзінамі. Я папрасіла беларускіх удзельнікаў выпіць са мной келіх віна. Далучыўся і Сяргей. Атрымаўшы выяву Эразма Ратэрдамскага, я прапанавала не гаварыць аб палітыцы. Глупства яшчэ надоўга. Кажу Сяргею: «Ніколі ня зьела ніводнай цукеркі, якімі ты гандляваў». «Я табе цукерак ня раю. Шкодна. І нават небясьпечна». І зноў — палітыка. Думаю, трэба спыняць. Жартам: «Слухай, ты вось бізнэсовец, знайдзі мне кляснага кавалера. Каб ня толькі Бацькаўшчыну любіў, але і справу ўмеў рабіць». «Добра, знайду», — абсалютна сур'ёзна сказаў Скрабец.

Прайшло каля 2-х гадоў. У асноўным кантактавалі дзеля радыё. Сяргей адгаладаў за зьмены ў выбарчым заканадаўстве. Помню фразу Генадзя Ананьева з АГП, які таксама галадаў: «Зь ім было так прыемна рабіць супольную справу. Мы тады пастанавілі ісьці да канца. Шкада, што іншыя вырашылі інакш».

І вось, калі Скрабец не патрапіў у наступную палату прадстаўнікоў, кажа мне: «Вольга, відаць, мяне будуць спрабаваць пасадзіць, будуць нешта шукаць... А я ня выканаў тваёй просьбы. І гэтую справу я перадаю брату — Сашу...» Я зьдзівілася: «Якую просьбу, якую справу?» «Кавалера табе не знайшоў...» Я азадачылася яшчэ больш. «Сяргей, ты што?» — «Вольга — гэта ж вельмі важна». І сапраўды Аляксандар Скрабец узяўся. Усе новыя знаёмыя аказаліся кляснымі. Толькі ж да Прагі далёка. І да Менску далёка. Але зноў знайшла сяброў. Дзякуй.

Брат Сяргея, Саша, аказаўся паэтам. Сын Коля — выдатным кампаньёнам у размовах пра спорт. Наташа Скрабец — неверагодна вытанчанай і мудрай для сваіх гадоў. Аляксандра Скрабец, жонка, — чалавек вялікай мужнасьці.

Перад прысудам яна гаварыла: «Мы з Наташкай увесь час сядзім, накрытыя пледам. Нам холадна. Тэмпэратура вельмі добрая ў кватэры, а нам — холадна. І ежа для нас — ня ежа. А паліва. Каб жыць». У дзень аднаго з судовых паседжаньняў, калі выклікалі і Аляксандру, у яе памёр бацька.

Чакаючы прысуду, Аляксандар Скрабец гаварыў не пра сябе, а пра малога сына і бацькоў. «Эміграцыя? Не. Сказаў «а», кажы «б». Нам прапаноўвалі палітычны прытулак у Швэцыі. Мы адмовіліся. Радзіму нельга пакідаць. Такое ж меркаваньне і ў Сяргея». Праўда, просьбу да Пуціна даць палітычны прытулак у Расеі мне так дакладна і не патлумачылі. «А жаніхі?» — нагадала я, каб аблегчыць размову. «А жаніхі цяпер усе ў турмы пойдуць». І сьмяецца.

Калі я кантактую зь імі, мне ўсё няёмка пытацца, як Сяргей. А яны нічога. Увесь час аптымісты. І адразу: «А як ты?» Калі мы гаварылі зь Сяргеем, першае, што ён пытаўся, як маё здароўе, як здароўе маёй мамы. А пасьля ўжо — што новага. Каб я была ў залі суду, запыталася б: «Дык што, цяпер два з паловаю гады без кавалераў?» Упэўненая, ён бы адразу перадаў справу памочніку Сяргею Галаганюку.

**Вольга Караткевіч** — журналістка радыё «Свабода».

# Прызнаньне расейскага пракурора

Летась 70 тысяч расейцаў зьніклі бязь сьледу. Міліцыянты не рэгіструюць забойстваў, каб не псаваць сабе статыстыкі — прызнаўся ў сваім рапарце генэральны пракурор Уладзімер Усьцінаў. Гэты выступ паказальны для беларусаў. Мы яшчэ раз упэўніліся, зь якой адрознай ад нас дзяржавай маем хаўрус.

Расейская міліцыя прыхавала летась больш 700 забойстваў ды болей 1,5 тыс. цяжкіх зьбіцьцяў, мяркуе Ўсьцінаў. Міліцыянты не рэгіструюць злачынстваў, бо гэта прымушае іх працаваць — распачынаць і праводзіць сьледзтва. Калі ж не пашчасьціць іх раскрыць, даводзіцца пісаць тлумачальныя запіскі вышэйшаму кіраўніцтву. Калі забойства замоўчваецца, значыцца, забойцы працягваюць гуляць на волі, а рапарты пастарункаў застаюцца «чыстымі».

Цяпер у Расеі жыве каля 143 мільёны чалавек. Летась зьнікла каля 70 тысяч жыхароў — насельніцтва буйнога беларускага райцэнтра. Частка зьніклых — ахвяры вайны на Каўказе. Але багата людзей выкрадзена бандамі — вынік гультайства міліцыянтаў. Абаронцы правоў чалавека кажуць, што на правіцы сваякі загінулых нават ня йдуць у пастарунак пісаць заявы.

Генпракурор прызнаўся, што з-за карупцыі й некампэтэнтнасьці не вялося сьледзтва на 80 тыс крадзяжам, аб якіх было заяўлена ў міліцыю. Заявы людзей былі папросту «сьцёртыя» з рапартаў.

Усьцінаў намаляваў жахлівы вобраз расейскай міліцыі — але замаўчаў нязьдольнасьць самой пракуратуры перапыніць тыя пазазаконныя дзеяньні, у прыватнасьці, хабарніцтва, якое павуціньнем аблытала ўсю краіну.

Галоўны пракурор зьвярнуўся да сваіх падначаленых і сьледчых з прапановаю адмовіцца ад хабару ў выглядзе жытла. Але шараговыя службоўцы парыруюць: «Што вольна ваяводзе, то не табе, смуродзе». Сам Усьцінаў у 1998 г. атрымаў кватэру вартасьцю 500 тыс. даляраў ў цэнтры Масквы ад тагачаснага кіраўніка прэзыдэнцкай канцылярыі Паўла Барадзіна.

Каб навесьці парадак у імпэрыі, патрэбны немалыя высілкі. Гэта, відаць, добра разумее галоўны пракурор, які сваю прамову скончыў словамі: «Толькі вяртаньне да духоўных вартасьцяў як міліцыі, так і войска можа аздаравіць сытуацыю».

**Падрыхтаваў Руслан Равяка**

# СЛУХАЙЦЕ РАДЫЁ «ПАЛЁНІЯ»

## Новыя правілы знаходжаньня ў Беларусі

Ад 6 лютага для іншаземцаў, што наведваюць Беларусь, уводзяцца новыя правілы. Тыя, хто знаходзіцца ў Беларусі меней за адзін месяц, мусяць мець па 14 даляраў (у эквіваленце) на кожны дзень. Апрача таго, госьці мусяць прыязджаць у месцы часовай прапіскі, на афармленьне якой яны маюць тры дні з моманту ўезду на тэрыторыю Беларусі.

Асобы, якія едуць праз Беларусь, павінны пакінуць яе тэрыторыю цягам двух дзён. Гэткія асобы падчас знаходжаньня ў Беларусі могуць карыстацца выключна міжнароднымі дарогамі. Згодна з новымі правіламі, улады беларускай сталіцы могуць забараняць уезд на тэрыторыю гораду.

## Дзяржаўныя выдаткі тармозяць эканамічны рост

Інфляцыя ў Польшчы можа павялічвацца, мяркуе старшыня Нацыянальнага банку Лешак Бальцаровіч. На гэта паўплывалі тры фактары: зьмяншэньне маржы вытворцаў паліваў, умяшальніцтва дзяржавы на валютным рынку й стрыманьне экспарту прадуктаў у Расею. Бальцаровіч прагназуе, што інфляцыя будзе павольна расьці. У сьнежні яна склала 0,7%.

Ацэньваючы эканамічны рост у краіне, старшыня польскага Нацбанку адзначыў, што дзеля таго, каб польская эканоміка разьвівалася, як у краінах Балтыі, патрэбны грунтоўныя зьмены — як у самой дзяржаве, так і эканоміцы. Паводле Бальцаровіча, эканамічны рост тармозяць непамерна высокія дзяржаўныя выдаткі: «У нас высокія падаткі і для людзей, і для прадпрыемстваў. Прычына — задужа высокія выдаткі дзяржавы. Калі так будзе далей, Польшча будзе разьвівацца павольней за краіны Балтыі, Славаччыны, ня кажучы ўжо пра азіяцкіх тыграў. У выніку яна будзе заставацца ззаду».

Бальцаровіч зазначыў, што задача польскага Нацбанку — прагназаваньне сытуацыі хаця б на год наперад.

**Паводле беларускай службы радыё «Палёнія»**

# Ксёндз, які не схацеў

Апублікаваныя дзёньнікі Адама Станкевіча — лідэра беларускага каталіцкага руху і пакутніка за веру й нацыю. Піша **Андрэй Вашкевіч.**

З часу, калі маладачанскі краязнаўца Міхась Казлоўскі выдрукаваў у «Куфэрку Віленшчыны» дзёньнік лідэра беларускай хрысьціянскай дэмакратыі, ксяндза Адама Станкевіча, прайшоў год. Але падзея, што мусіла стаць сэнсацыяй, прайшла незаўважна. У прэсе не зьявілася ніводнай рэцэнзіі. Гэта й нядзіўна, бо сам часопіс выходзіць малым накладам і амаль нідзе не прадаецца. Між тым апублікаваны дакумэнт унікальны.

Лёс напісаных у 1937—1948 гадах «Каляндарных нататак» незвычайны. У 1970 г. надзейна схаваны да гэтага дакумэнт быў памножаны ў некалькіх асобніках на друкарцы Янкам Шутовічам, і цягам трыццаці гадоў асобнікі захоўваліся ў прыватных асобаў у Вільні. Рэдактар «Куфэрка» Міхась Казлоўскі выявіў іх і выдрукаваў.

У сваіх дзёньніках кс. А.Станкевіч адлюстраваў шырокую панараму грамадзка-палітычнага жыцьця Заходняй Беларусі 1930—1940-х гг. Прычым ксёндз не абмяжоўваўся толькі ўбачаным, а зьбіраў інфармацыю ад усіх людзей, з кім сутыкаў лёс. Тут і сустрэчы з генэралам Жалігоўскім, дырыжорам Рыгорам Шырмам, савецкімі пісьменьнікамі Лужаніным і Панчанкам, заходнебеларускімі паэтамі-камуністамі Максімам Танкам, Таўлаем і Пестраком. Апошняе шмат чым абвяргае ўяўленьне пра прынцыповае супрацьстаяньне заходнебеларускіх камуністаў і хадэкаў.

Найбольшую каштоўнасьць уяўляюць аўтаравы факты і разважаньні на тэму рэлігійнага жыцьця Заходняй Беларусі. Кс.Станкевіч шмат увагі прысьвяціўся справе «банкруцтва ў Беларусі польскага каталіцтва». Пасьля заканчэньня Другой сусьветнай касьцёл у БССР ня змог злучыць людзей і стаць сымбалем нацыянальнага змаганьня, як гэта было ў Літве і Польшчы: «У БССР змушаюць палякоў ксяндзоў выяжджаць у Польшчу. Яны запісаліся на выезд самі і агітавалі беларусаў на гэта. Вось вынікі палітыкі [віленскага мітрапаліта] Ялбжыкоўскага і агулам польскага касьцёлу. А каб было ў каталіцкім касьцёле ў БССР беларускае карэньне, як бы ўсіх ён аб'яднаў».

Кс. Станкевіч праводзіць паралелі з рэлігійнай палітыкай царскіх уладаў у 1840—1880-я. «Каталікі — гэта палякі ў БССР, а праваслаўныя — гэта рускія. Такі бальшавікоў пагляд. Як даўней, так і цяпер…» Каталіцтва ў вачах бальшавікоў заставалася «польскай верай», і яны рэпрэсіямі, як і сто гадоў таму царская ўлада, кідалі беларусаў-каталікоў у абдымкі польскім ксяндзам-шавіністам. Кс. А.Станкевіч гаворыць, што беларусы-каталікі пішуцца палякамі і ад'яжджаюць у Польшчу, бо панічна баяцца савецкай улады. Таму ўлетку 1947 г. Станкевіч быў вымушаны з горыччу канстатаваць: «Беларусі і беларускасьці народ у БССР /Зах. Бел. цярпець ня можа, ён у сваёй цемнаце і нясьведамасьці ідэнтыфікуе Беларусь з бальшавізмам, каторага ненавідзіць усёй душой і ад каторага аж стогне…»

Найменш дасьледаваным гісторыкамі момантам, закранутым кс. А.Станкевічам у сваіх дзёньніках, ёсьць гісторыя яго перамоваў з савецкімі спэцслужбамі наконт стварэньня асобнага каталіцкага біскупства ў БССР.

Адама Станкевіча ўпершыню арыштавалі восеньню 1944 году. Знаходзячыся ў турме, бачачы разгубленасьць ксяндзоў-палякаў, якія нацыянальным шавінізмам губілі касьцёл, а зараз панічна ўцякалі з БССР, бязглуздую палітыку савецкай улады, ён вырашыў пайсьці ва-банк ды выступіў з прапановай стварэньня на тэрыторыі БССР асобнай каталіцкай дыяцэзіі, кананічна падпарадкаванай Ватыкану. Ідэяй ксяндза зацікавіліся.

Так зьявіўся афіцэр спэцслужбаў, якога ксёндз называе Мэфістофэль. У «Каляндарных нататках» Станкевіч апісвае каля дваццаці сустрэчаў з супрацоўнікамі апарату НКГБ, якія запрапанавалі выкласьці свае погляды на справу каталіцтва ў Беларусі. У канцы 1944-га — 1945-м гадах кс. Станкевіч напісаў некалькі праектаў рэформы каталіцтва на Беларусі. Ён даказваў, што касьцёл з XVI стагодзьдзя быў сродкам палянізацыі беларусаў, таму



**Адам Станкевіч** (1892—1949). Народжаны ў Арлянятах, ён скончыў сэмінарыю ў Вільні, акадэмію ў Петраградзе. Быў пасьвячоны ў сьвятары ў 1914. Ён быў сваяком іншага вядомага Станкевіча з Арлянятаў — палітыка і навукоўца Янкі. Быў маторам беларускага руху — рэдактарам-выдаўцом «Хрысьціянскай думкі» (1928—1939), заснавальнікам друкарні імя Скарыны, выкладчыкам Беларускай гімназіі. Ён аўтар шэрагу кніг, якія ня страцілі навуковай вартасьці дагэтуль. Арыштаваны ў 1949 годзе, загінуў у савецкім канцлягеры ў Тайшэце ў той жа год. «ARCHE» рыхтуе Збор твораў кс.Станкевіча.

неабходна падпарадкаваць беларусаў-каталікоў непасрэдна Рыму, бяз сувязі з Польшчай, і пачаць паступовую беларусізацыю каталіцкага жыцьця ў БССР.

Станкевіча зразумелі па-свойму. Увосень 1945 году ён атрымаў прапанову ўзначаліць… «Беларускі аўтакефальны каталіцкі касьцёл», які не прызнаваў бы Ватыкану й Папы. Гэта была грандыёзная задумка савецкіх спэцслужбаў, якая капіявала справу ксяндза Сенчыкоўскага, што ў 1860-х гадах з падачы расейскага ўраду спрабаваў русіфікаваць каталіцтва.

Ксёндз Станкевіч ведаў, што калябарацыя з савецкімі спэцслужбамі нічога, акрамя шкоды, беларускаму народу і касьцёлу не прынясе. Таму ён пераконваў кантору Мэфістофэля ў канечнасьці падпарадкаваньня Рыму. Часамі здавалася, вагі схіляюцца на бок

# узначаліць Касьцёл

Ахвяраваўшы жыцьцём, кс. Адам адвёў ад беларускага касьцёлу небясьпеку расколу і дыскрэдытацыі.

кс. Адама: «Візыт у м-сто. Прыязны, бітая штука. Ужо прапазык недарэчных няма. Наадварот, трэба выступіць да кананічнага парадкаванага каталіцкага касьцёлу ў БССР... Калі гэта гаворыцца шчыра, дык гэта ўжо нешта новае, і яго недацэніваць ня можна. Дай, Божа, сьвятла і сілы». Але дарма, Мэфістофэля было не падмануць: нармалізацыя каталіцкага жыцьця і яго беларусізацыя былі магчымыя толькі пры ўмове непрызнаньня Рыму.

Вялікая, непараўнальная ні з чым гульня. Засьнежанымі віленскімі вуліцамі крочыць ад сваёй кватэры на Зарэччы да будынку літоўскага МГБ ксёндз і там пераконвае, угаворвае, даказвае. Вядзе барацьбу ў марнай надзеі заступіцца за свой народ, гледзячы, як падаюць навокал сябры і паплечнікі: «Ст[аніславам] Грынкевіч (у 1931—1936 — віцэ-старшыня Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі, лекар. — **«НН»**) расстраляны, а зь ім яшчэ 12 асоб... З др. Фр[анцішкам] Грышкевічам (доктар філязофіі, дырэктар Віленскай беларускай гімназіі. — **«НН»**) такая гісторыя: яго вялі, ён кінуўся ўцякаць і скончыў самагубствам. Найхутчэй, загадалі ўцякаць і ў сьпіну застрэлілі». Такіх сьведчаньняў на старонках дзёньніка шмат.

Кс. А.Станкевіч выйграць гульні ня мог. Дый ці выйграў хто калі супраць Мэфістофэля? Але ішоў да канца. Апошнія запісы: «...я ім нічога не дапамог, і яны ня маюць да мяне даверу. Кіраўнік бел. касьцёлам мусіць быць агентам НКГБ... Мой адказ: біскупства і паліцыйная агентура выключаюцца — і няма што аб гэтым гаварыць», «М-сто сказаў выразна: «Нет с вас никакой пользы». Як жа гэта мяне радуе. Мой адказ быў: «Не забывайте, что у меня есть совесть». Чым гэта ўсё скончыцца, адзін Бог ведае».

Чатыры гады гэтых «перамоваў» далі ксяндзу чатыры гады вольнага жыцьця, але кіраўніцтву МДБ ЛССР так і не ўдалося схіліць кс. А.Станкевіча да ўступкі па прынцыповым пытаньні. 13 красавіка 1949 г. яго арыштоўваюць — напэўна, разьлічваючы такім крайнім спосабам схіліць да супрацы. Пасьля катэгарычнай адмовы ўзначаліць аўтакефалію касьцёлу ў БССР ксёндз, канечне, павінен быў памерці...

Ксяндза Станкевіча чакалі скоры суд і сьмерць у лягеры за тысячы кілямэтраў ад Радзімы. Ахвяраваўшы жыцьцём, кс. Адам адвёў ад беларускага касьцёлу небясьпеку расколу і дыскрэдытацыі.

Янку Шутовічу цудам удалося вынесьці з кватэры ксяндза Станкевіча частку бібліятэкі й архіву: адны дзьверы ксяндзовага кабінэту гэбісты апячаталі, а другія, засунутыя шафай, не апячаталі.

Гісторыя часам бывае няўмольна жорсткай. Як сьведчаць апошнія дасьледаваньні, іншы беларускі ксёндз, Вінцэнт Гадлеўскі, які таксама хацеў самастойнага беларускага біскупства, заплаціў сваім жыцьцём за тое, што адмовіўся пайсьці на калябарацыю зь немцамі, якія яшчэ ў 1942 годзе хацелі ад яго такой жа калябарацыі, якую прапаноўвалі савецкія спэцслужбы кс. А.Станкевічу колькі гадоў пазьней.

# Сьмех нашых дзяцей

**Дементей Н. Уроки жизни.** — Минск: БЕЛТА, 2005.

Мэмуары Мікалая Дзямянцея ўразілі самім фактам свайго зьяўленьня. Здавалася, аўтар клясычных «хто как хаціт, тот так і гаварыт» і «кончыў ня кончыў — засталося тры мінуты» ўсё сказаў яшчэ ў пачатку 1990-х, калі, дзякуючы жывым трансьляцыям пасяджэньняў Вярхоўнага савету, усе пабачылі інтэлектуальны ўзровень камуністычнай намэнклятуры.

Марна шукаць у кнізе тонкіх характарыстык, а тым больш глыбокага аналізу падзеяў, сьведкам якіх аўтару давялося быць. Уражвае фэнамэнальная памяць таварыша Дзямянцея на ўмалоты, надоі, гектары, сьвінакомплексы…

Мікалай Іванавіч лічыць, што Савецкі Саюз разваліўся праз дэфіцыт, чэргі за прадуктамі, чэрствую да народу ўладу і пэнсійны ўзрост кіраўнікоў. А яшчэ таму, што «былі абылганыя армія і КГБ — асноўныя структуры, якія ахоўвалі ўстоі дзяржавы». Часам такая наіўнасьць настолькі ўражвае, ажно закрадаецца сумнеў: а ці наіўнасьць гэта? Калі пляменьнік Васіль Дзямянцей дагэтуль «ахоўвае ўстоі» на пасадзе намесьніка старшыні КДБ. Мікалай Дзямянцей не разумее: «той шосты артыкул Канстытуцыі СССР аб кіроўнай ролі КПСС. Ён што, замінаў разьвіцьцю грамадзтва?» Лёгіка ў гэтым ёсьць: калі дзяржава трымаецца на войску і КГБ, дык і грамадзтва цалкам можа разьвівацца ва ўмовах аднапартыйнасьці.



У кнізе ёсьць пункт, які не дазваляе ёй заставацца бясхмарнымі пэнсіянэрскімі мэмуарамі пра адпачынак на дачы ў Драздах, паляваньні пад Адлерам і адказны візыт у складзе савецкай дэлегацыі на Папуа — Новую Гвінэю. Гэта апісаньне віленскіх падзеяў 1991 году. Нататкі «мірат-

Працяг на старонцы 36.

# Сьмех нашых дзяцей

Працяг са старонкі 35.

ворцы», пасланага «перадухіліць новыя ўзброеныя сутыкненьні прыхільнікаў Ландсбэргіса і вайскоўцаў» пасьля таго, як «нявысьветленымі асобамі» пад тэлецэнтрам была ўжытая агняпальная зброя. Тут аўтарскі тэкст цалкам адпаведны зьместу сучасных ідэалягічных перадач БТ: «адрэпэтаваны натоўп», аксамітная рэвалюцыя як «спроба гвалтоўнага зьвяржэньня існага ладу».

Дзямянцей цікавы там, дзе ў ягоным тэксьце, як у люстэрку, адбіліся думкі й норавы намэнклятуры БССР: Сьлюнькоў, які выпраўляецца ў чарнобыльскія раёны «пасьля першамайскага параду». Увесь дзяржаўны апарат, які, ведаючы пра аварыю на атамнай станцыі, сядзіць і чакае загаду з Масквы: «калі б нешта сур'ёзнае, нам бы пазванілі». Кіраўнікі, аж да напаўапальнага сёньня Пятра Міронавіча, галоўная задача якіх «бесьперабойнасьць паставак сельгаспрадукцыі». Эліты, ангажаваныя ў маскоўскія апаратныя гульні, адвучаныя прымаць рашэньні.

Ці мог бы Машэраў, каб ня тая аварыя на шашы, стаць беларускім Шэварднадзэ? Невядома. Але нават Дзямянцей, «сакратар па сьвіньнях», якога партыя паслала ўзначаліць Вярхоўны савет, каб дыскрэдытаваць саму ідэю, што ўлада павінна належаць парлямэнту, а не «вядучай і накіроўваючай КПСС», нават гэты Дзямянцей ганарыцца сваёй роляй у прыняцьці Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце.

Яшчэ ў кнізе геніяльныя фатаграфіі: намэнклятура на трыбунах і ў кабінэтах, з папуасамі і ўласным народам. Такая, якой была. Дзямянцей, устаўляючы тыя фоткі ў кнігу і падпісваючы іх, нават не задумваўся, што ён быў кіраўніком Беларусі. Такім жа «сакратаром па сьвіньнях» быў Шарэцкі, што з ганарлівымі інтанацыямі апавядаў: падчас імпічмэнту пазваніў сам Ельцын і сказаў Лукашэнку не чапаць. А Лукашэнка на такіх увогуле зрабіў стаўку: чарговы сакратар па сьвіньнях Папоў, чарговы Навіцкі…

Кніга дазваляе бачыць, як эвалюцыянавала намэнклятура за апошнія 15 гадоў. Прынамсі, ва ўладнай эліты нават думак няма аб падпарадкаванасьці нейкаму «цэнтру» — апроч Адміністрацыі прэзыдэнта.

У ЗША былыя прэзыдэнты чытаюць лекцыі ва ўнівэрсытэтах. А пра што гаварыць Дзямянцею? Пра надоі ў 1975 годзе?

Усім пэсымістам, упэўненым у непарушнасьці сёньняшняга ладу, варта перагарнуць гэтую кнігу. Каб адчуць, што Дзямянцеяў плач аб страчаным выраі, дзе «аднаго сур'ёзнага крытычнага выступу газэты «Правда» было дастаткова, каб сакратар абкаму партыі пазбыўся пасады», сёньня ўспрымаюцца з актуальнасьцю законаў Хамурапі. Заўтра хіба пацісканьне плячыма выкліча стэнаграма «трэцяга ўсебеларускага сходу».

**Сяргей Мікулевіч**

**Мікалай Дзямянцей** (нар. у 1930 у вёсцы Хотліна Чашніцкага раёну) скончыў Сельскагаспадарчую акадэмію і Вышэйшую партыйную школу. Прайшоў усе прыступкі партыйнае герархіі — ад інструктара да сакратара ЦК КПБ (1979—1989). У час яго безаблічнага старшынёўства Вярхоўны савет БССР абвесьціў Дэклярацыю аб дзяржаўным сувэрэнітэце (1991). Пасьля паразы путчу пад ціскам апазыцыі мусіў пайсьці ў адстаўку.



**Прыём дэлэгацыі Ўкраінскай ССР. На пярэднім пляне — Л.М.Краўчук, В.Ф.Кебіч, М.І.Дзямянцей. Менск, 1990 г.**



**Народныя дэпутаты СССР зь візытам добрай волі на сьвяце Незалежнасьці дзяржавы Папуа — Новая Гвінэя. А.Шэнін, С.Амбарцумян, М.Дзямянцей, суправаджаў сьпікер парлямэнту Дэніс Янг. 16 верасьня 1989 г.**



**Салдацкая каша і франтавыя 100 грамаў. А.Р.Лукашэнка і М.І.Дзямянцей сярод вэтэранаў вайны. 9 траўня 2001 году.**



**Мае добрыя сябры і суседзі П.В.Вараб'ёў, У.Р.Сузько ў дзень 45-годзьдзя Ўладзімера Рыгоравіча. 26 студзеня 2000 г. (У іншым подпісе В.Г.Сузько характарызуецца як «мой добры сусед і пакравіцель». — «НН»).**

Аўтарская стылістыка подпісаў да фота захаваная.




**Аляксей Марачкін прэзэнтаваў сваю новую карціну «За элегантную перамогу!» на ёй Сталін з Гітлерам уздымаюць келіхі на фоне пазнавальных амапаўскіх шчытоў. У палатно трэба ўглядацца: там мноства дробных дэталяў, кшталту завадной птушкі пад нагамі дыктатараў. Прэзэнтацыя адбылася 10 лютага. Заля менскай сядзібы БНФ была запоўненая.**

# Эўрапапса

## ЮРЫ ГУМЯНЮК

РЭФЛЕКСІЯ НА ТЭМУ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Надвор’е кепскае і атмасфэрны ціск
як напамін пра думкі Гэракліта.
Ахутана імглой Рэч Паспаліта,
адно чуваць прапагандысцкі сьвіст.

З аднога боку жондзіць афэрыст,
мудак з другога бразгае бранёю,
а ты ў вантробах поўзаеш, як гліст,
балду ганяеш, цешысься хернёю.

І не пад’есьці, нават не сысьці
з двара аблезлага, нібыта
з п’едэсталу,
то чэзлы пах (мянта званітавала)
ў прадоньне чорна-белае ляціць.

А недзе ўверсе тоне ў ліхтарах
«Black Jack» для какаінавых каўбояў.
Рэч Паспаліта, хрэн з табою!
Ты застанесься, пэўна, у вяках!

25 лістапада 2005

ЗАБАВЫ КАКАІНАВЫХ КАЎБОЯЎ

ТАНЦОРЫ

Танцоры з кардэбалету
так мілай сэрцу правінцыі
зьбіраюць (як хобі) манэты
і піва закусваюць піцаю.

Слугуюць паціху рэжыму
(імпрэзы калі афіцыйныя),
а ў сэрцы іржавай спружынай
сырэны крычаць міліцыйныя.

І ўсё ім, напэўна, да дупы,
як нехта казаў — фіялетава.
Хоць едзь на гастролі ў Лынтупы,
хоць рэж сваё сэрца паэтава!

Сакавік, 2005

ЭЎРАПАПСА

Як некалі, у дзень сьвятога Казіміра
(раней казалі, пэўна, Казімера)
пасьля запою шкляначка кефіру —
пажыўная «пахмелка» да халеры
ды шпацыр на разгорнуты кірмаш.

Гляджу на цыцкі Анжалікі Агурбаш
у тэлевізіі — сапраўдная Вэнэра,
што мужыкі гатовы баш на баш
ці зацягнуць яе ў шалаш,
нібы адрынутыя гора-кавалеры.

Ды «Эўрабачаньне» — жахлівая хімэра,
што не ўратуе пляшачка «Мадэры»
і нават на талерцы кілбаса!
Апанавала мэдыі папса,
і агурбашацца дзяржаўныя гетэры.

21 траўня 2005




**Юры Гумянюк.**



аповесьць

# Шлях дробнай сволачы

*Шаўковы шалік на шлеме,*
*Мусьлінавы на рукаве,*
*Падумай, прыяцель, падумай, —*
*Мы маглі б застацца ў хляве!*

**ЕВА ВЕЖНАВЕЦ**

**Люба — журналістка радыё «Вольная Беларусь». Яе сястра Віка працуе ў газэце «Савецкая Беларусь». Зрэдзьчас яны сустракаюцца на «нэўтральнай тэрыторыі», у сталоўцы, што ляжыць між рэдакцыямі. Але Новы год ім давядзецца сустракаць разам, у бацькоўскім доме. Раптам высьвятляецца, што выпадковы Любін спадарожнік па маршрутцы — таксама іх госьць...**

**Працяг. Пачатак у № 2—6.**

На вёсцы забухалі пэтарды, на ганку ўзьнікла маці:

— Любка! Ён ужо адгаварыў, хутчэй, Новы год сустракаць, цябе ўсе чакаюць.

Я стрымгалоў кінулася ў хату. Застольнікі сядзелі з аднолькавым выразамі п’янаватай іроніі на тварах. Цікаў гадзіньнік. Мой келіх стаяў наліты, уздымаліся бурбалкі (Аляксандравічава паўсалодкае!).

— Ну, раз ты такая ў нас разумная, дык скажы тост! — сказаў дзядзька Вася.

Аддалі вар’яцты навагодняе слова. Я ўзяла келіх і нічога не магла сказаць. Мне хацелася выкласьці пра ўзаемазьвязаны калядны мэханізм узмацненьня Ірада і непазьбежнасьці цуда. Пра зьмены, якія чакаюць усіх, і хай бы яны пайшлі нам усім на карысьць. Але агіда да высокага ўжо заняла мне дух. Не было ніякай праўды, якая б нас аб’яднала, а калі б і была, не маімі вуснамі і не для гэтых людзей яна павінна прагучаць.

— Ну, хоць за Беларусь, ці што! — падказаў бацька.

— За Беларусь! — з палёгкаю ўсклікнулі мы й зацокалі келіхамі.

Калі праўда распаўзаецца, як старая мешкавіна, гэта ясная прыкмета, што вы ступілі на шлях «сяожэнь» — дробнай сволачы. Так гаворыцца ў маім падручніку па фэн-шуй. Па-беларуску гэта гучыць так: усе маюць рацыю. Або: трэба жыць як набяжыць. Драбіць праўду на некалькі й выбіраць сваю. На шляху сяожэнь валяецца шмат дабротаў, можна падабраць, толькі галаву схілі, пад ногі глядзі. Але нават набраўшыся ўсяго, застанесься жамярынаю, якая валачэ груз, у некалькі разоў большы за самую.

Праўда, па-за шляхам дробнай сволачы ёсьць шлях героя, аднак гэта занадта вялікая адказнасьць. Вунь адзін узвышаецца над сяожэнь. Да яго і галаву падымаць брыдка.



**Ева Вежнавец** — пісьменьніца. Жыве ў Менску.

## Прытоеныя за кулісамі

Пікет пад чырвона-зялёнай шыльдаю «А.Г.Лукашенко — наш президент!», Менск, ЦУМ, студзень 2006, выбары-шмыбары ў завязаным мяху. Кот даўно вядомы.

Я стаілася за шэрай калёнай ЦУМу й непрыбранай елкай. Перад пікетчыкамі — групай таўсматых маладзёнаў у дублёнках — распрагаецца мой зяць, гэбіст Анушкевіч.

— Актывісссты! — схаваўшыся са

мной за калёну, прашыпеў нейкі мужчына ў футраной шапцы. Я ўхвальна зірнула на яго. Хвіліну мы ў поўнай еднасьці сьвідравалі вачыма пікет «За Беларусь!», потым ён нырнуў у ЦУМ, а я засталася стаяць — мне чысьцяць марынарку ў тутэйшай хімчыстцы, сьпяшацца няма куды. Я ня мерзла — была ў бацькавым геалягічным швэдры з калянай воўны. Мела фляжачку каньяку, а таксама час і натхненьне паназіраць за палітычным жыцьцём часоў Залатой Эпохі. Спакой і папас — дзьве дастатковыя ўмовы, каб эпоха лічылася залатой.

Да пікету ніхто асабліва ня бег. Вось падышлі дзьве буйныя цёткі — дублёнкі дадолу, грудзі наперад, на галовах футраныя шапкі а-ля баярыня. Торбы з замочкамі. Загадчыцы аддзелу ў выканкаме. Паважна паставілі подпісы, пайшлі. Праз паўгадзіны я спасьцігла прызначэньне пікету — шырма! Асноўныя подпісы зьбіраюцца ціхай сапай зь велькім размахам. Гэты ж пікет быў паэзіяй чыстае красы. Ён разам зь пікетамі Мілінкевіча, Казуліна й Пазьняка ўтварыў чатырохканцовы крыж у падземным пераходзе ЦУМ—Камароўка. Тыя тры я ўжо агледзела. Зусім ня тая дыхтоўнасьць. Пазашываліся пад зямлю, твары бледныя, мерзнуць у танных апранахах. За Пазьняка сядзіць на зэдлічку пажылая спадарыня ў блакітнай куртачцы. За Казуліна — студэнты й выкладчыкі. Мілінкевічаўцы падабраліся як у п'есу пра клясавую еднасьць — інжынэр Павал Мяфодзевіч (ведаю яго як старога рэвалюцыянэра), Антоська-ліцэіст, мажны вусаты мужчына, з выгляду рабочы. Побач калоцішча маці-адзіночка — уся ў варсінках і качулках, з журботнымі вачыма й апушчанымі вуснамі. Гэтым я й здала подпіс ды пайшла да ЦУМу чысьціць сваю танную апранаху.

Тут я ў другі раз пабачыла свайго зяця за працай. Першы раз то было ў сярэдзіне 1990-х на мітынгу: ён кружляў вакол натоўпу, як воўк пры гурце. Падцікаўшыся ззаду, я паклала яму руку на плячо й гыркнула: здравія жадаю, лейтэнант Анушкевіч! Анушкевіч доўга ня мог мне дараваць таго, што я палічыла, быццам ён пасьвіць такіх нікчэмнасьцяў, як я ды іншыя нацыяналісты. Ён «працаваў» з Майкам Рэйвэнам, «амэрыканскім донарам апазыцыі». Гэта ён мне адмыслова перадаў праз знаёмых. Гаварыць мы не маглі з-за ўзаемнай антыпатыі.

Я пазнаёмілася зь ім у ранньнім студэнцтве — высокі бляндын зь Віцебшчыны, чысты эрзац вікінга. Сястрын інтэрнацкі муж. Яны месяцаў колькі жылі ў граху ў нашым несямейным інтэрнаце. А потым разьбегліся, бо за ім завяліся дзіўноты дзіўныя. Раз прыйшоў за мной у жаночую прыбіральню, каб павіншаваць з днём нараджэньня. Выйшаўшы з кабінкі, я была непрыемна ўражаная — паблізу стаяў Анушкевіч і пасьвістваў гумовым вожыкам. «На, з днём нараджэньня!» — сказаў ён, працягваючы мне цацку. Тады я вырашыла, што ў ім прытаіўся туалетны маньяк (такіх тады хапала). А потым падумала: Анушкевіч хацеў ня толькі пранікнуць у таямніцы жаночай прыбіральні, але яшчэ й кагосьці зьбянтэжыць і апусьціць. Празь некаторы час ён выкраў мой дзёньнік, дзе былі брыдкасьці пра сястру (я зайздросьціла, што ў яе прыгожы муж, хе-хе!) і паказаў ёй «праўду». Віка зазлавала, плюнула на нас абаіх і сышла на кватэру. А Анушкевіча праз пару месяцаў тэставаньняў перавялі зь юрфаку на курсы КДБ, а потым у вышэйшую школу ў Маскву. Ён прыходзіў да сястры, хваліўся й прасіў вярнуцца — яго чакала бліскучая будучыня. Так і атрымалася. Шнырыць цяпер па пікетах. А можа, курсантаў прывёў подпісы зьбіраць?

Так ці інакш, я не паўтарыла подзьвігу 1990-х — не падышла і ня гыркнула, прымусіўшы яго зьбегчы. Справа ў тым, што я больш не магу падыйсьці да яго або пакласьці руку на плячо. Чэкісты прайшлі вялікі шлях, зрабілі многа бруднай працы, і цяпер да іх набліжацца ня трэба.

Аднак да пікету наблізілася маё другое я — любімая сястра, у сваім найгоршым футры — са стрыжанага стэпавага сабакі. Яна ходзіць у ім на ня надта важныя інтэрвію, і ўвогуле ў народ. Я нічога ня чую, але па радаснай пантаміме пазнаваньня бачу — Віка й Анушкевіч у парадку. Можа, нават адновіцца пара — баран ды яра. Віка бярэ інтэрвію ў хлапцоў-пікетчыкаў, Анушкевіч адмахваецца. Потым усе разам, сьмеючыся, нешта гавораць двум падпісантам. Чалавечае, занадта чалавечае. Я далекавата стаю, рэплікаў ня чую, дый не хачу — на памяць ведаю. У іх мая рыторыка 10-гадовай даўніны — «Беларусь юбэр алес», «За Беларусь у росквіце». Гэтая стратэгія выявілася пройгрышнай, шкоднай для здароўя — занадта ангажавацца ў краіну, хай сабе й сваю. Зь ёй усё роўна ўсё будзе інакш — не па-мойму, не па-анушкевіцку.

Шлях з-за кулісаў ня ўсіх вядзе на сцэну. Ня хочаш граць — сыходзь з тэатру. Куды? Асабіста я пайду ў хімчыстку па сваю куртку.

*P.S.* Днямі пабачыла пару ў адным фільме. Абое выкрывалі польскіх шпіёнаў. У свой час мы зь сястрою вучыліся журналістыцы ў Польшчы й Чэхіі — за грошы «Салідарнасьці» й «Сьцяпана Батуры». На тагачасных фотках мы разам на вуліцах вольных местаў Прага, Гданьск і Варшава.

### REZYGNUJE Z WSZYSTKIEGO

Як гэта добра —
Гардыня.
Хай застаецца, спатрэбіцца.

Зьнікне
Лёс наш забраны
Заклікае зьмірыцца.

Ня здолеў, мілы, ты збудаваць сваю вежу ў пыле, ня здолеў.
Ну і што?
Пайдзі і пасьпі да Сьвятога Ніколі.

Хто слабы, але невінаваты,
Хай ідзе ў анучкі драмаць дахаты.

Засьні і сканай, раз за дзьверы
ты зайшоў, за якімі ня стала ні мары, ні веры.
Прымі свой выбар,
І гэты гармідар
разьбярэцца на ніткі.
Ідзі за сваёю
Вераўчанай, ніцянай, падманнаю сьцежынаю.

Усё нішчымнае мне і табе дасталося.
На нішчымніцы мы і расьцём,
баявое ўскалосьсе
нашай зграбнай, як левы пратэз, эпохі.

(Праўда, што бітву кідаюць адныя калекі ды лохі,
А таксама мы, невялікія сволачы,
Якія выбралі жыць на каленях,
І ня хочуць быць бітымі стоячы.)

# Dźvie knihi

Skazać, što Krušyna — liryk, mała: jon — eratyčny paet. Piša **Anatol Sidarevič**.

Vydaviectva «Mastackaja litaratura» parušyła ŭłasnaje praviła: u seryji «Biełaruskaja paezija XX st.» vypuściła nie asobny tom paeta, a svoje-asablivuju antalohiju paezii 1920—1930-ch hadoŭ «Siarebranyja hałasy». U jaje ŭvajšli tvory tych pieśniaroŭ, z čyjoj spadčyny niemahčyma skłaści hruntoŭnyja asobnyja tamy. Ale z tvorami A.Aleksandroviča, Z.Astapienki, M.Bahuna, A.Dudara, J.Lavonnaha my bačym vieršy U.Duboŭki (u 2000 h. u hetaj seryi vyjšaŭ jaho asobny tom), a taksama U.Žyłki, J.Puščy, P.Trusa, čyje tvory možna było b vydać asobnymi zbornikami. Zrešty, składvajecca ŭražańnie, što pierad nami — kalektyŭny zbornik paetaŭ, jakija stali achviarami balšavickaha teroru. Adnak u takim razie paŭstaje pytańnie: čamu ŭ knihu ŭkliučany vieršy Arkadzia Morkaŭki? Praŭda, jaho ciahali na dopyty, jon byŭ zastrašany i prymušany maŭčać, ale ž nia byŭ źniavoleny ci sasłany. Zastajecca adna vysnova: u zbornik trapili ŭlubionyja tvory ŭlubionych paetaŭ układalnika Viktara Šnipa. U takim razie nie vypadaje abmiarkoŭvać padbor imionaŭ i tvoraŭ. Choć nie, nie ŭstrymajusia i vykažu ździŭleńnie: jak tak mahło stacca, što ŭ padborku vieršaŭ Jazepa Puščy nia trapili klasyčnyja «Listy da sabaki»? Ci jany ŭžo znoŭ zabaronienyja?

Kniha «Siarebranyja hałasy» cikavaja datami. V.Šnip pakazaŭ čytačam, kali nastaŭ čas antypaezii. Z 255 vieršaŭ, vybranych dla zbornika, tolki 14 napisanyja ŭ 1931—1932 hadach. Apošnija tvory, prydatnyja dla hetaje antalohii, A.Aleksandrovič, U.Duboŭka i Michaś Čarot napisali ŭ 1926 h., A.Dudar, Todar Klaštorny, A.Morkaŭka i U.Žyłka — u 1928-m, M.Bahun — u 1929-m, Valery Marakoŭ i Juli Taŭbin — u 1930-m, Z.Astapienka, J.Lavonny i U.Chadyka — u 1932-m. Nie vykliučaju tut doli subjektyvizmu. U Duboŭki składalisia dobryja vieršy i pierad samym aryštam, ale Aleksandrovič, jaki vyrašyŭ stać pieršym siarod praletarskich paetaŭ Biełarusi («pieraplunuć» Hartnaha i Čarota), Bahun, jaki pačaŭ pisać vieršyki na śmierć balšavickich pravadyroŭ (mieŭ ich u zapasie)… Jany nastupali na horła ułasnaj pieśni pad ciskam partyjnych instancyj i «praletarskaje» litaraturnaje krytyki (časam instancyji vystupali ŭ postaci krytykaŭ nakštałt Aresta Kanakocina ci Alaksandra Siankieviča). Abo Žyłka, hetaja «kvołaja raślina», čyju tvorčaść u BSSR «zamaroziła lišnie ściudzionaja atmasfera» (Anton Łuckievič). Abo Morkaŭka, jaki nadoŭha zmoŭk u svajoj Pałacie mier i vahi.

Voś da takich kali nia zmoŭkłych, dyk acichłych u 1930-ch naležaŭ i Ryhor Kazak. Bo nadyšoŭ čas antypaezii, kali pisać pra «bahnu voč i vusnaŭ ciepłyniu» stała niebiaśpiečna. Praŭda, paeta trochi zastrachavała słužba ŭ Čyrvonaj armii ŭ samy toj čas, jak hramili «Ŭzvyšša». Słužba ŭ vojsku, kudy nie mahli trapić «ekspluatatarskija elementy», była jak paśviedčańnie ab palityčnaj dobranadziejnaści. Da taho ž małady paet staŭ suaŭtaram i aŭtaram «pravilnych» — čyrvonaarmiejskich — zbornikaŭ i «pravilnaje» litaraturnaje arhanizacyi — BieŁAČAFu (Biełaruskaha litaraturnaha abjadnańnia Čyrvonaj armii i flotu). Praŭda, nia ŭsich ratavała takaja prynaležnaść, nia ŭsich ratavała paźniejšaje maŭčańnie ŭ 1930-ch, adnak R.Kazaku pašancavała. Pašancavała navat trojčy: zastaŭsia žyć, nie pieratvaryŭsia ŭ kazionnaha paeta i atrymaŭ mahčymaść tvorčaści ŭ volnym śviecie pad pseŭdanimam Ryhor Krušyna.

Na emihracyji R.Krušyna vydaŭ siem knih. Tolki ŭ 2003 h. vyjšła jahonaja knižka ŭ Miensku. Zbornik «Cymbalist», što praŭda, utrymlivaŭ 20 vieršaŭ i jich samapierakłady. U recenziji na jaho ŭ «NN» ja pisaŭ: «Pryvitaŭšy pieršy zbornik R.Krušyny na



**Рыгор Крушына падчас вандроўкі ў Каір.**

**Siarebranyja hałasy**: Vieršy i paema. — Miensk: Mastackaja litaratura, 2005.

**Ryhor Krušyna. Vybranyja tvory**. — Miensk: Biełaruski knihazbor, 2005.

Baćkaŭščynie, my zastajomsia… u čakańni jahonaje hruntoŭnaje knihi». I takaja kniha dziakujučy synu paeta vyjšła.

Knihazboraŭskaja zaviadzionka padavać u seryjnych vydańniach usie žanry, u jakich pracavaŭ aŭtar, adno padkreślivaje, što R.Krušyna — paet. Ź pisanych prozaju jahonych tekstaŭ vyłučym litaraturnyja ŭspaminy i listy. Badaj, na ŭsio astatniaje žyćcio zapomnicca mnie historyja, jak uvahnali ŭ varjactva Viktara Kazłoŭskaha. I aŭtarskija słovy pra toje, što, kali b Kazłoŭski žyŭ u inšych, nie savieckich umovach, jahony los nia mieŭ by takoje trahičnaje raźviazki. Heta R.Krušyna piša i pra siabie: u SSSR za jim zaŭsiody chadziła biada, bo ŭ 1930-ch hadach, hadach antypaezii, «liryka była gvałtam zadušanaja», «nie była ŭ pašanie», «uvažałasia… idealahična varožaj», a «pierš za ŭsio ja — liryk».

Dziela spraviadlivaści adznačym, što paet rabiŭ sprobu napisać epičnuju paemu («Kałychanka»), dy liryk usio ž pieramoh. Skazać, što Krušyna — liryk, mała: jon — eratyčny paet. Jon adkryta kultyvavaŭ u našaj paezii eratyčnyja matyvy, niahledziačy na kanservatyzm jahonych čytačoŭ-emihrantaŭ, jakija vymahali ad paeta hramadzianskaści, i redaktaraŭ peryjodykaŭ, jakija navat Krušynaŭ pierakład «Pieśni pieśniaŭ Salamona» nie advažylisia nadrukavać (ci to eratyzm pałochaŭ, ci to paetava «adarvanaść ad žyćcia» ich nie zdavalniała: jakaja tam liryka-erotyka, kali treba z balšavizmam zmahacca?). U peŭnym sensie Krušyna raźvivaŭ pačataje Maksimam Bahdanovičam. Heta, adznačym, byŭ cnatlivy eratyzm. Jon nie dachodziŭ da taho, što paźniej, jak asłabieli balšavickija tabu, źjaviłasia ŭ rasiejskaj i biełaruskaj paezii tut (zhadajem Jaŭhiena Jeŭtušenku, Ryhora Baradulina, Rajisu Baravikovu). I ŭsio ž da paetyčnaha eratyzmu Krušyny stavilisia nieprychilna.

Dadamo, što eras maje ŭ Krušyny dvajistuju pryrodu: heta jašče i patryjatyčny eras, pra jaki Anton Adamovič pisaŭ u pracy pra Alesia Sałaŭja. Čytajučy «Kantatu samotnych», mižvoli zhadvaješ Kupalavu paemu «Jana i ja»: u abodvuch paetaŭ vobrazy kachanaje Biełarusi i kachanaje žančyny pajadnanyja. Publicystyčna-patryjatyčnych ryfmavanak u Krušyny niama: jahony patryjatyzm intymny.

Zbornik układzieny i prakamentavany Michasiom Skobłam, jon ža napisaŭ i pradmovu da knihi. Tut darečy zhadać, što M.Skobła pisaŭ pradmovu i da knižki «Cymbalist». Tady pradmova nie adpaviadała źmiestu zbornika, ciapier hetkaje nieadpaviednaści niama. Haloŭnaja dumka aŭtara pradmovy: paet zaŭsiody musić davodzić svaju racyju, asabliva kali jon paet-navatar.

Kali chtości napiša historyju biełaruskaje litaratury pavodle liniejnaha pryncypu, a nie pavodle tematyčnaha, jak robicca ciapier (naša litaratura padzialajecca na padsavieckuju, zachodnie-biełaruskuju, emihranckuju, biełastockuju), kali liniejna budzie padadziena historyja rodaŭ, žanraŭ, tematycnaje raźvićcio litaratury, abo kali chto napiša historyju biełaruskaje strofiki, tady i paspality čytač ubačyć, što R.Krušyna šmat papracavaŭ dziela ŭzbahaceńnia vyjaŭlenčych srodkaŭ našaje paezii, šmat u cym apiaredžvajucy raźviććio paetyki na Backaŭščynie. Zrešty, heta nie ŭ małoj miery pakazaŭ u pradmovie da knihi vybranych tvoraŭ paeta M.Skobla. I znaŭcaŭ dy amataraŭ biełaruskaj paezii hety hruntoŭny zbornik Ryhora Krušyny paraduje.

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Мікалай Мікалаевіч Улашчык: біябібліяграфічны паказальнік.** — Менск: НАРБ, 2006. — 96 с. 100 ас.

Перапрацаванае і дапоўненае перавыданьне кнігі выйшла акурат да 100-годзьдзя (14 лютага) славутага беларускага гісторыка. Пра якасьць працы сьведчыць тое, што калектывам ўкладальнікаў кіраваў Віталь Скалабан. Прадмову да выданьня напісаў Аляксей Каўка. Пералічваюцца рэцэнзіі на працы Ўлашчыка, літаратура пра яго жыцьцё й дзейнасьць. Паводле словаў В.Скалабана, цяпер разглядаецца праект выданьня CD-дыску, куды ўвайшла б гэтая кніга, а таксама выбраныя працы навукоўца, фатаздымкі.

**Уладзімер Караткевіч. Выбраныя творы.** Менск: Беларускі кнігазбор, 2006. — 672 с.

34-я кніга праекту «Беларускі кнігазбор». Аповесьці «Дзікае паляваньне караля Стаха», «Сівая легенда», «Ладзьдзя роспачы», «Чазенія», фрагмэнты раману «Каласы пад сярпом тваім», вершы, нарысы, публіцыстыка, лісты.

**Юры Андруховіч. Уводзіны ў геаграфію: паэзія, проза, эсэістыка / Пераклад з украінскае Марыны Шоды й Андрэя Хадановіча.** — Менск: Логвінаў, 2006. — 438 с. [500 ас.]

Кнігі Юр'я Андруховіча сёньня можна ўбачыць на паліцах кнігарняў розных эўрапейскіх краінаў. Па-беларуску ж дагэтуль яго творы друкаваліся толькі ў незалежнай пэрыёдыцы. Тым прыямнейшы факт зьяўленьня гэтага зборніка — фактычна выбраных твораў гэтай знакавай постаці літаратуры нашых пасщнёвых суседзяў. Паэзію Андруховіча натхнёна, а часам і проста віртуозна зьбеларусіў Андрэй Хадановіч; яму ж належыць пераклад знакамітай аповесьці «Маскавіяда». «Эсэістычную аповесьць» «Рэкрэацыі» й усе пададзеныя ў кнізе «чыстыя» эсэ пераклала на беларускую мову Марына Шода.

Творы Ю.Андруховіча, бясспрэчна, вартыя прачытаньня тут і цяпер, у сёньняшняй нашай Беларусі, бо ўдумлівы беларус знойдзе ў іх тое, што ён (калі-нікалі й марна) спрабуе знайсьці ў нашай літаратуры — перадусім праніклівы й адначасна цьвярозы погляд на нашу постсавецкую сучаснасьць і нас, яе стваральнікаў і спажыўцоў.

Кніга выдадзеная клясычным правапісам.

**МБ, Лявон Баршчэўскі**

## Партызанская школа




Новы дыск ліцэістаў

Пытайцеся ў незалежных распаўсюднікаў


МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

# Ходзіць гарбуз па гароду

Ходзіць гарбуз па гароду,
Пытаецца свайго роду.
Ох, ці жывы, ці здаровы
Ўсе родзічы гарбузовы?

**З украінскае пераклаў Мікола Бугай**

# Выбіраем рок-каралёў



15 лютага стартуе слухацкае галасаваньне, якое вызначыць пераможцаў «Рок-каранацыі-2005». Прагаласаваць можна, даслаўшы лічбу ўпадабанага выканаўца SMS-паведамленьнем на нумар 2005, або праз Інтэрнэт — на сайце www.music.fromby.net.

**Выканаўца году**

Зьміцер Вайцюшкевіч — нумар 1112

Ігар Варашкевіч — 1113

Уладзімер Пугач — 1114

Лявон Вольскі — 1115

**Рок-князёўна**

Руся («Indiga») — 2112

Сьвета Сугака («Тарпач») — 2113

Наста Шпакоўская («Naka») — 2114

Вікторыя Фінская («Айша») — 2115

**Дэбют году**

«Таварыш Маўзэр» — 3112

«Naka» — 3113

«Саша і Сірожа» — 3114

«КлЁндайк» — 3115

**Кліп году**

«Бум» («ТТ-34» і Сярога) — 4112

«Турысты» («Крамбамбуля») — 4113

«Шла дальше» («Без Билета») — 4114

«Калыханка» («Саша і Сірожа») — 4115

**Песьня году**

«Под куполом небес» («Стокс») — 5112

«Белакрылы анёл» («ZET») — 5113

«Моё солнце» («J_Морс») — 5114

«Две лодки» («Без билета») — 5115

**Альбом году**

«Грубый помол» («ТТ-34») — 6112

«Tanki» («Neuro Dubel») — 6113

«Апрель» («J-Морс») — 6114

«Радыё Крамбамбуля» («Крамбамбуля») — 6115

**Увага! Лічбу ўпадабанага вамі наміната трэба набіраць без прабелаў ды іншых сымбаляў. Тарыф — 190 руб. за SMS. Пачатак галасаваньня — 15 лютага а 00.00, фініш — 22 лютага а 24.00.**

# Трохі пра рэкардсмэнаў

Ёсьць шахматысты, якія ставяць рэкорды творчага даўгалецьця — Зварыкіна, Карчной, Ройзман. Сустракаюцца тыя, хто дае рэкордныя сэансы адначасовай гульні, накшталт адбытага летась у флярыдзкім гандлёвым цэнтры «Gardens mall». Гросмайстарка Сьюзан Полгар 16 гадзін запар гуляла з 326 супернікамі і выйграла 309 партый, упісаўшы сябе ў кнігу рэкордаў Гінэса… А ёсьць шахматныя кампазытары, што ствараюць рэкордныя задачы. Такія задачы таўталягічна называюцца таскамі (task з ангельскай — «заданьне»). Да прыкладу, таск-монстар прадугледжвае мат за максымальную колькасьць хадоў.

З заданьнем «мат за 200 хадоў» яшчэ можна звыкнуцца, а ці часта нам даводзіцца бачыць у адным творы ажно чатыры ракіроўкі? Віктару Волчаку зь Лідчыны, экспэрту Беларускай фэдэрацыі шахмат у галіне кампазыцыі, удалося неверагоднае. Ягоны таск атрымаў I-II прыз на леташнім міжнародным конкурсе — мэмарыяле Езьдзіна.



**Таск Віктара Волчака.**

Гэтая пяціхадоўка В.Волчака досыць мудрагелістая, чым і вабіць: 1. de! Th7 2. e7! Te7 3. de i 4. Kf6X; 1…0-0-0 2. Ta7 Kpb8 3. c7+ Kpa7 4. 0-0! i 5. Ta1X; 1…0-0 2. Kh6+ Kpg7 3. Khf5+ Kpg6 4. 0-0-0! i 5. Tdg1X.

У сярэдзіне XX ст. шахматны рамантык з Бразыліі распрацаваў адмысловую тэму, якая цяпер называецца ў яго гонар. Аднойчы берасьцейскі трэнэр Уладзіслаў Каташук — аўтар каля 150 задач — пайшоў бразыльскім шляхам. Паспрабуйце разьвязаць ягоны «таск Валадао». Падказка: у гэтым відзе таску спалучаюцца *тры* нестандартныя рухі — ракіроўка, узяцьце на праходзе і ператварэньне пешкі ў фігуру.

**ВР**

**Рашыце задачу**

У.Каташук, 1992. Мат за 2 хады.



**Адказ:** 1. Ta8! (цугцванг): 1...b5 2. abX; 1...Cg1 2. h8ФX; 1...C~ 2. 0-0X.

## ТЭАТАР

**Балет**

*У Палацы Рэспублікі*

**19** (ндз) — «Карміна Бурана», «Макбэт».

**Опэра**

*У Цэнтральным доме афіцэраў*

**17** (пт) — «Турандот».
**18** (сб) — «Яўген Анегін».
**19** (ндз) — «Кот у ботах».

**Купалаўскі тэатар**

**17** (пт) — «С.В.».
**19** (ндз) — «Я не пакіну цябе...».
**20** (пн), **24** (пт) — «Сымон-музыка».
**22** (ср) — «Каханьне ў стылі барока».
**23** (чц) — «Чычыкаў».

*Ранішнія спэктаклі*

**19** (ндз) — «Сьнежная каралева».

*Малая сцэна*

**18** (сб) — «Адчыніце кантралёру!».
**19** (ндз) — «Муж для паэтэсы».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**17** (пт) — «Ганна ў тропіках».
**18** (сб) — «Кароль Лір».
**19** (ндз) — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».
**19** (ндз) — «Нязваны госьць».
**22** (ср) — «Містэр Розыгрыш».
**21** (аўт) — «Майстар галаданьня».
**23** (чц) — «Адвечная песьня».
**24** (пт) — «Паўночная цішыня».
**25** (сб) — «Чорны квадрат».
**26** (ндз) — «Воўк-мараплавец».
**26** (ндз) — «Нязваны госьць».

## СПОРТ

**Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі**

**18 лютага (субота)**

«Керамін» (Менск) — «Дынама» (Менск). Лядовы хакейны палац на Прытыцкага.
«Юнацтва» (Менск) — «Рыга-2000». Крыты каток імя Горкага.
«Хімік-СКА» (Наваполацак) — «Гомель».
«Віцебск» — «Нёман» (Гарадня). Пачатак а 18.30.



**Квіткі каштуюць ад 9500 да 12 тыс. руб.**
**Даведкі па т.: 7570589, 6490888. Або www.xlam.of.by.**

## КІНО НА DVD

**Master Records**

**Дабранач і ўсяго добрага!**

Драма, ЗША, 2005, ч/б, рэж. **Джордж Клуні.**
У ролях: **Дэйвід Стрэтэйрн, Джордж Клуні.**
1950-я. Журналісты кідаюць выклік сэнатару Маккарці…
Кінафэст у Вэнэцыі, намінацыя на «Оскара».
**Менск, Кісялёва 12, 643-21-08**

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 18 лютага

**СТВ, 15.20**

«Сьцеражыся аўтамабіля».

СССР, 1966, рэж. Эльдар Разанаў.

Трагікамэдыя.

Сумленны злодзей Дзетачкін крадзе машыны ў нягоднікаў, а ў аматарскім тэатры грае Гамлета...
Клясычныя ролі Інакенція Смактуноўскага, Алега Яфрэмава і Андрэя Міронава.

**СТВ, 20.15**

«Сахара».

ЗША—Гішпанія—Нямеччына, 2005, рэж. Брэк Эйснэр.

Прыгодніцкі фільм.

Авантурнік Дырк (Мэт’ю Макконахі) і прыгажуня Эва (Пэнэлопа Круз) у пошуках скарбаў чорнага кантынэнту. Добрыя прыгоды для адпачынку — з эпідэміяй, кепскімі палітыкамі і караблём ЗША ў пустыні.

**НТВ, 21.40**

«На мяжы шаленства».

ЗША—Францыя, 1988, рэж. Раман Паланскі.

Трымцеіньнік.

У амэрыканскага кардыёляга ў Парыжы зьнікае жонка. Улада й паліцыя — бездапаможныя, і зьляканы лекар сам вядзе вышук... Найлепшыя хічкокаўскія традыцыі.
Ролі выконваюць: Гарысан Форд, Бэці Баклі, Эмануэль Сэньe.

**СТВ, 00.05**

«Юнацтва Віктара Варгаса».

Францыя—ЗША, 2002, рэж. Пітэр Салет.

Рамантычная камэдыя.

Любоўныя пакуты юнага Віктара, які вырашае спакусіць найлепшую дзяўчыну ў квартале... Фільм прэзэнтаваны ў рубрыцы «Арт-хаўс». Карціна — удзельнік Канскага кінафэсту. Прыз на кінафэстах у Сан-Сэбасьцяне і Довіле.

### Нядзеля, 19 лютага

**«Лад», 17.45**

«Мядзьведзь».

Беларусь, 1938, рэж. Ісідор Аненскі.

Камэдыйная навэля паводле Антона Чэхава.

Гуляка-барын прыязджае за картачнаю пазыкай — і атрымлівае адпор ад лярвознай удавы. Бурны скандал завершыцца двубоем і пацалункам.

**Андрэй Расінскі**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

Шэдэўры Таркоўскага на экране.

# Салярыс

**Расея, 1972, каляровы і ч/б, 169 хв.**

**Жанр:** фантастыка паводле раману С.Лема.

**Адзнака:** 10 (з 10).

Менскі кінатэатар «Ракета» (зав. Рабочы, 3) адкрыў кінаклюб «Фэномэны кіно» і распачаў рэтраспэктыву фільмаў Андрэя Таркоўскага. «Люстэрка» і «Андрэя Рублёва» ўжо паказалі.
Сэансы адбываюцца штопанядзелка а 19-й. 20 лютага — «Салярыс».
Фантастыка Таркоўскага адрозьніваецца ад звыклых галівудзкіх футурашокаў. У кадрах жыве час, а таямніцы космасу хаваюць тайны чалавечай душы. Навуковец Кельвін (Данатас Баніёніс) адпраўляецца на плянэту Салярыс — і сутыкаецца са сваімі ўвасобленымі ўспамінамі…
С.Лем быў не задаволены экранізацыяй: Таркоўскі кардынальна зьмяніў акцэнты. Паводле рэжысэра, чалавеку патрэбны і чалавек, і Дом, і Бог.
Рэдкая магчымасьць убачыць фільмы Таркоўскага на вялікім экране. Рэтраспэктыва працягнецца да 20 сакавіка. Надалей будуць «Іванава дзяцінства», «Сталкер», «Настальгія» і «Ахвярапрынашэньне».

## КІНАФАРМАТ «4Х4»

**«Зямля дастатку»** (Land of Plenty).
ЗША, 2004, каляровы, 114 хв.
**Жанр:** драма, «дарожны» фільм.
Вандраваньне вэтэрана вайны й лібэральнай амэрыканкі. Рэжысэр карціны — Він Вэндэрз («Неба над Бэрлінам»).

**«Сутыкненьне»** (Crash).
ЗША—Нямеччына, 2004, каляровы, 113 хв.
**Жанр:** псыхалягічны трымценьнік.
6 намінацый на прэмію «Оскар». Карціна ў ЗША называлася найлепшай па выніках 2004 г.

**«Ганарлівасьць і прадузятасьць»** (Pride & Prejudice).
Вялікабрытанія, 2005, каляровы, 127 хв.
**Жанр:** касьцюмная мэлядрама.
Экранізацыя раману Дж.Остын. Намінант на «Залаты глёбус», 4 намінацыі на «Оскара».

**«Мангольскі пінг-понг»** (Lu cao di).
Кітай, 2005, каляровы, 102 хв.
**Жанр:** камэдыя.
У мангольскім стэпе хлопчык знаходзіць мячык для пінг-понгу.

**АР**

## калі б...

**...Фэлікс Дзяржынскі таксама выдаваў імянную зброю за тэнісныя перамогі.**



Рэфэры: «Мячык у полі. Васіль Чапаеў прайграў чарговы сэт».

Чапаеў: «Ідрыць тваю, яшчэ год без імяннога маўзэра хадзіць!»

**...тры канкурэнты Лукашэнкі на выбарах-2006 былі трыма галовамі дракона.**



Асілак: «Я Іван Дурак! А ты хто?»

Галовы (справа налева): «Я — адзіны», «Я — левы». «А я — «мазахіст...»

**...стваральнікі фільму «Агент 590» рабілі кастынг:**




— Сьпіна №18 мне падабаецца. Як у яго з дыкцыяй?

— Зараз праверым. Сьпіна нумар васямнаццаць, скажыце, калі ласка: «Мяне спрабавалі вэрбаваць польскія шпіёны».

**Малюнкі і тэксты Лёліка Ушкіна**

## У НУМАРЫ

### 21-гадовы палітвязень



Ён быў фанатам «Тарпэда». А вось нявесты яшчэ ня меў… Партрэт Артура Фінькевіча. **Старонка 14.**

### Спачатку зробяць хораша ўздоўж аўтадарог



З 1 красавіка дзяржава атрымае права канфіскаваць недабуды. **Старонка 10.**

### Сьмех нашых дзяцей



Кніга мэмуараў Мікалая Дзямянцея. **Старонка 35.**

### Выбіраем рок-каралёў



...праз Інтэрнэт або SMS-камі. Старт слухацкага галасаваньня — 15 лютага. **Старонка 45.**

### Эўрапапса



Новы трэш ад enfant terrible-я беларускай паэзіі, піжона і каўбоя Юр’я Гуменюка. **Старонка 38.**

## ЖАРТЫ

* * *

У горадзе М столькі сацыяльных ролікаў, лятарэяў і рэклямы семак, што здаецца, чалавек тут нараджаецца толькі для таго, каб зьбегчы ад рабаўладальніка, выйграць процьму грошай і купіць на іх мех семак.

**Uratachi**

* * *

Стаяць на прыпынку руды і лысы. Руды ў лысага і пытаецца: «Што, Бог валасоў ня даў?» «Даваў рудыя, ды я ня ўзяў», — адказвае лысы.

**Запрашаем усіх сьвядомых пасьмяяцца й падтрымаць адзіную ў сьвеце беларускамоўную каманду КВК***

**“Абыня Краў”**

Сьмяяцца будзем 17.02.06 а 18-й гадзіне па адрасе пр. Незалежнасьці,25 (Палац культуры прафсаюзаў). вітаецца наяўнасьць яркага шаліка - па іх мы пазнаемся

*КВК - **К**люб **В**ясёлых і **К**емлівых

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Vinšujem** Alesia i Kaciu z Narodzinami. Usio budzie dobra i my pieramožam. Rezydenty j rezydentki

**Самую шчырую патрыётку** Горадзена Вольгу з Днём народзінаў віншуе яе каханы. Свабоды. Праўды. Справядлівасьці

### КНІГІ

**Куплю** «Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі». Т.: 394-62-06. Віталь

**«Наша Ніва»** (новае ды факсымільнае выданьне), «ARCHE», «БГА», «Спадчына» (старыя нумары), слоўнікі, энцыкляпэдыі, дзіцячыя кнігі, фільмы ды музыка на CD на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак—пятніца (14.30 — 19.30). Т.: 707-40-01

**Прапаную** кнігі: Беларуска-польскі размоўнік, Кацар «Беларускі арнамэнт», Фадзеева «Беларуская вышыўка», Насовіч «Слоўнік беларускай мовы», энцыклапэдыя «Беларуская міталёгія», Беларускі кнігазбор: Баршчэўскі, Каліноўскі, «Летапісы і кронікі», Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі, т.1—3, 5 ды шмат іншага. Т.: 753-70-05

**Распаўсюд. Абмен**. Гісторыя, фальклёр, постмадэрнізм, літаратура, псыхалёгія, канфэрэнцыі, круглыя сталы, кнігі, аўдыё, пошта, Інтэрнэт. Зьвяртайцеся на e-mail: alesknigi@mail.ru, 220030, Менск, а/с 195

**Прапаную**: «Беларускі клясычны правапіс», «Нашу Ніву» (факс. выд.), «Матэматычную энцыклапэдыю», дзіцячыя кніжкі, пісаныя клясычным правапісам, камплект падручнікаў па старабеларускай, старарускай мовах і іншае. Т.: 753-91-96

### ПРАЦА

**Шукаю** рэпэтытара для вывучэньня ангельскай мовы і францускай. vitissime@tut.by. Т.: 251-99-64

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17-й. Т.: 235-18-72. Юрась

### ВЕРШЫ

Паэт Рагнед Малахоўскі зьбірае вершы, прысьвечаныя праспэкту Ф.Скарыны, для выданьня калектыўнага зборніка. Тэл. 8-029-762-29-73, e-mail: ragned@yandex.ru

Прыватныя абвесткі ў «НН» (ня больш за 15 словаў) дасылайце поштай (а/с 537, 220050 Менск), праз e-mail (nn@promedia.by) або разьмяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

У **Мэксыцы** рэвалюцыя толькі што пачынаецца. Рэвалюцыянэры біліся з правіцельственным войскам цэлых 12 гадзін. І тыя, і другія маюць вялікія страты ў людзях. Перамаглі паўстанцы.

**Паштовая скрынка**

**Макасу.** На загалоўку ж выразна напісана «Беларуская газэта», як жа вы хочаце, каб мы друкавалі Вашы расейскія вершы?

**«НН». 1911. № 7. 17 лютага.**

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2521. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 15.02.2006.

Замова № 914.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а